Ба 53162

# Крымінальны кодэкс Беларускай ССР

Ба 53 162

*Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!*

МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ БССР

# КРЫМІНАЛЬНЫ КОДЭКС
## БЕЛАРУСКАЙ ССР

*Афіцыяльны тэкст*
*са зменамі на 1 мая 1957 года*
*і з дадаткамі*
*сістэматызаваных матэрыялаў*

(На беларускай і рускай мовах)

Б 3/53162

Бел. аддзел 1994 г.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
Рэдакцыя навукова-тэхнічнай літаратуры
МІНСК 1957

Дзяржаўная бібліятэка БССР імені Леніна

25.04.2009

# КРЫМІНАЛЬНЫ КОДЭКС БЕЛАРУСКАЙ СОВЕЦКАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭСПУБЛІКІ [1])

У рэдакцыі 1928 года

---

*Зацверджан ЦВК БССР на 3-й сесіі VIII склікання 23 верасня 1928 г. і ўведзен у дзеянне з 15 лістапада 1928 г. (ЗЗ БССР 1928 г. № 30, арт. 287).*

## I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**1.** Крымінальны кодэкс Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі мае сваёй задачай судова-прававу́ю ахову соцыялістычнай дзяржавы дыктатуры пролетарыяту ад грамадска-небяспечных дзеянняў (злачынстваў) шляхам прымянення да праваnарушальнікаў (злачынцаў) указаных у Кодэксе мер соцыяльнай аховы.

**2.** Грамадзяне БССР і іншых саюзных рэспублік адказваюць на падставе гэтага Кодэкса за ўсе злачынствы, зробленыя імі на тэрыторыі БССР, а таксама за злачынствы, зробленыя за граніцай, калі злачынцы затрыманы або адданы пад суд ці следства ў БССР.

За злачынствы, зробленыя за межамі БССР, але на тэрыторыі Саюза ССР, грамадзяне БССР і іншых саюзных рэспублік адказваюць па законах рэспублікі, на тэрыторыі якой зроблена злачынства.

**3.** Замежныя грамадзяне адказваюць на падставе гэтага Кодэкса за злачынствы, зробленыя імі на тэрыторыі БССР.

Гэты артыкул не распаўсюджваецца на замежных грамадзян, якія карыстаюцца правам экстэрытарыяльнасці. Пытанне аб крымінальнай адказнасці гэтых грамадзян вырашаецца дыпламатычным шляхам.

**4.** Грамадска-небяспечным дзеяннем (злачынствам) прызнаецца ўсякае дзеянне або бяздзеянне, накіраваныя супроць асноў совецкага ладу або правапарадку, устаноўленых рабоча-сялянскай уладай на пераходны да комунізма перыяд.

5. Злачынствы падзяляюцца на дзве катэгорыі:

а) накіраваныя супроць асноў совецкага ладу і

б) усе астатнія.

За злачынствы першай катэгорыі ў гэтым Кодэксе ўстанаўліваецца толькі ніжэйшая (мінімальная) мяжа, ніжэй якой суд не можа назначаць меру соцыяльнай аховы. За злачынствы другой катэгорыі ў Кодэксе ўстанаўліваецца толькі вышэйшая (максімальная) мяжа.

**6.** Калі злачынства не прадугледжана гэтым Кодэксам, то падставы і межы адказнасці, а таксама меры соцыяльнай аховы вызначаюцца судом на падставе тых артыкулаў Кодэкса, якія праду-

---

[1]) Знак * перад нумарам артыкула ўказвае, што да яго ёсць паартыкульны матэрыял.

1*

гледжваюць найбольш падобныя па роду і важнасці злачынствы (аналогія).

* 7. Меры сацыяльнай аховы прымяняюцца з мэтай:

а) папярэджання злачынстваў;

б) пазбаўлення грамадска-небяспечных элементаў магчымасці зноў рабіць злачынствы;

в) прыстасавання зрабіўшых злачынствы да ўмоў свабоднага агульнажыцця працоўных.

Меры сацыяльнай аховы не павінны прыносіць фізічных пакут і прыніжаць чалавечую годнасць.

Мэт адплаты і кары гэты Кодэкс не мае.

8. Да асоб, якія зрабілі грамадска-небяспечныя дзеянні (злачынствы) або з'яўляюцца небяспечнымі па сваёй сувязі са злачынным асяроддзем або па сваёй мінулай дзейнасці, прымяняюцца меры сацыяльнай аховы судова-папраўчага, медыцынскага і медыка-педагагічнага характару.

9. Меры сацыяльнай аховы судова-папраўчага характару прымяняюцца толькі да асоб, якія:

а) дзейнічаючы наўмысна, прадбачылі грамадска-небяспечныя вынікі сваіх дзеянняў, жадалі гэтых вынікаў або свядома дапускалі іх надыход, або,

б) дзейнічаючы неасцярожна, не прадбачылі вынікаў сваіх дзеянняў, хоць і павінны былі іх прадбачыць, або лёгкадумна спадзяваліся папярэдзіць гэтыя вынікі.

* 10. Меры сацыяльнай аховы не прымяняюцца, калі суд прызнае, што дзеянні, якія пры звычайных умовах складаюць злачынства, зроблены ў стане неабходнай абароны супроць пасяганняў на савецкую ўладу або на асобу і правы таго, хто абараняецца, або іншай асобы і што пры ажыццяўленні гэтых дзеянняў не было дапушчана перавышэння межаў неабходнай абароны.

11. Меры сацыяльнай аховы не прымяняюцца, калі суд прызнае, што дзеянні, пры звычайных умовах складаючыя злачынства, зроблены для ўстаранення небяспекі, якую пры даных акалічнасцях нельга было ўстараніць іншымі сродкамі, і што шкода ад гэтых дзеянняў з'яўляецца менш важнай, чым шкода, якую яны папярэдзілі.

12. Меры сацыяльнай аховы не прымяняюцца, калі суд прызнае, што данае дзеянне, фармальна падпадаючае пад адзнакі таго ці іншага артыкула гэтага Кодэкса, не мае грамадска-небяспечнага характару па сваёй малазначнасці і адсутнасці шкодных вынікаў або што асоба, якая зрабіла данае дзеянне, не з'яўляецца грамадска-небяспечнай.

13. Меры сацыяльнай аховы судова-папраўчага характару не прымяняюцца да асоб, якія зрабілі злачынства ў стане хранічнай псіхічнай хваробы ці часовага расстройства псіхічнай дзейнасці або ў такім хваравітым стане, калі яны не маглі разумець сваіх дзеянняў або кіраваць імі, а таксама да асоб, якія зрабілі злачынства, будучы псіхічна здаровымі, але да вынясення прыгавору псіхічна захварэлі.

Да гэтых асоб прымяняюцца толькі меры сацыяльнай аховы медыцынскага характару.

Заўвага. Гэты артыкул не распаўсюджваецца на асоб, якія зрабілі злачынства ў стане ап'янення.

* 14. Меры крымінальнага пакарання не прымяняюцца да ня-

поўналетніх да 12 год. Да няпоўналетніх ад 12 да 16 год меры крымінальнага пакарання прымяняюцца толькі па злачынствах, указаных у арт. 15 гэтага Кодэкса[1]) [8 верасня 1935 г. (ЗЗ № 34, п. 180)].

15. Няпоўналетнія, пачынаючы з дванаццацігадовага ўзросту, выкрытыя ва ўчыненні дзеянняў (развінчванні рэек, падкладванні на рэйкі розных прадметаў і да т. п.), якія могуць выклікаць крушэнне паяздоў, а таксама ва ўчыненні пакраж, у прычыненні насілля, цялесных пашкоджанняў, калецтваў, у забойстве або ў спробах да забойства, прыцягваюцца да крымінальнага суда з прымяненнем усіх мер крымінальнага пакарання (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 26 студзеня 1945 года).

**16.** Крымінальнае праследаванне не можа ўзбуджацца за даўнасцю:

а) калі мінула дзесяць год з часу зробленага злачынства, за якое суд мае права назначыць пазбаўленне волі больш чым на пяць год;

б) калі мінула пяць год з часу зробленага злачынства, за якое суд мае права назначыць пазбаўленне волі не больш чым на пяць год;

в) калі мінула тры гады з часу зробленага злачынства, за якое суд мае права назначыць пазбаўленне волі не больш чым на адзін год, або ў законе вызначана за злачынства больш мяккая, чым пазбаўленне волі, мера сацыяльнай аховы, за выключэннем злачынстваў, указаных у п. «г» гэтага артыкула;

г) калі мінула шэсць месяцаў з часу ўчынення злачынстваў, прадугледжаных артыкулам 213 гэтага Кодэкса.

* **17.** Даўнасць прымяняецца, калі на працягу вызначаных у артыкуле 16 тэрмінаў не было ніякага судавядзення па гэтай справе аб данай асобе. Даўнасць перарываецца, калі зрабіўшая злачынства асоба зробіць на працягу вызначаных у артыкуле 16 тэрмінаў іншае аднароднае або не менш цяжкае злачынства або скрыецца ад следства ці суда. Вылічэнне тэрмінаў даўнасці ў гэтых выпадках пачынаецца з дня, калі зроблена другое злачынства або з дня аднаўлення прыпыненага судавядзення.

18. Па справах аб контррэвалюцыйных злачынствах даўнасць можа судом не прымяняцца. Аднак, калі суд, не прымяніўшы даўнасці, прыгаворыць за такое злачынства да расстрэлу[2]), то ён абавязкова павінен замяніць расстрэл[2]) аб'яўленнем ворагам працоўных з пазбаўленнем грамадзянства БССР або іншай саюзнай рэспублікі і тым самым грамадзянства Саюза ССР і з выгнаннем з Саюза ССР назаўсёды або пазбаўленнем волі не менш як на два гады.

**19.** У адносінах асоб, прыцягнутых да крымінальнай адказнасці за актыўныя дзеянні і актыўную барацьбу супроць рабочага класа і рэвалюцыйнага руху, праяўленыя на адказных або сакрэтных пасадах пры царскім ладзе або пры контррэвалюцыйных урадах у перыяд грамадзянскай вайны, суд у кожным асобным выпадку, па

---

[1]) Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 31 мая 1941 г. устаноўлена адказнасць няпоўналетніх, пачынаючы з 14-гадовага ўзросту, за ўсе зробленыя імі злачынствы, апрача прадугледжаных Указам выпадкаў.

[2]) Гл. зноску 3 да заўвагі артыкула 27, стар. 7.

свайму меркаванню, прымяняе даўнасць і вырашае пытанне аб замене вышэйшай меры сацыяльнай аховы — расстрэлу[1]) іншай мерай.

20. Абвінаваўчы прыгавор не прыводзіцца зусім у выкананне, калі ён не быў прыведзен у выкананне на працягу дзесяці год з дня яго вынясення.

* 21. Не маючымі судзімасці прызнаюцца:

а) асобы, апраўданыя судом;

б) асобы, умоўна асуджаныя, калі яны на працягу вызначанага судом выпрабавальнага тэрміну не зрабілі злачынства;

в) асобы, прыгавораныя да пазбаўлення волі не больш як на шэсць месяцаў або да іншай больш мяккай меры сацыяльнай аховы, калі яны на працягу трох год з дня адбыцця меры сацыяльнай аховы не зрабілі злачынства;

г) асобы, прыгавораныя да пазбаўлення волі больш чым на шэсць месяцаў, але не больш як на тры гады, калі яны на працягу шасці год з дня адбыцця меры сацыяльнай аховы не зрабілі злачынства.

22. Калі пачатае злачынства не было даведзена да канца, г. зн. калі злачынны вынік па якіх-небудзь прычынах не настаў, то суд выбірае меру сацыяльнай аховы з ліку ўказаных у гэтым Кодэксе за дадзены від злачынства мер у залежнасці ад небяспекі злачынца і ад ступені ажыццяўлення ім злачыннага намеру [15 ліпеня 1930 г. (ЗЗ № 29, п. 184)].

23. Пачатае злачынства не праследуецца, калі яно не было даведзена да канца па ўласнаму пабуджэнню асобы, якая зрабіла або падрыхтавала яго.

У гэтым выпадку суд вызначае меру сацыяльнай аховы толькі за фактычна зробленае дзеянне, калі яно само па сабе з'яўляецца злачынствам.

24. Удзельнікамі злачынства, апрача выканаўцаў, могуць быць:

а) падбухторшчыкі, г. зн. асобы, якія схіляюць іншых да злачынства;

б) пасобнікі, г. зн. асобы, якія садзейнічаюць выкананню злачынства парадамі, ліквідацыяй перашкод, прадастаўленнем прылад або сродкаў, скрываннем злачынца або слядоў злачынства.

25. Меры сацыяльнай аховы ў адносінах падбухторшчыкаў і пасобнікаў вызначаюцца судом у залежнасці ад іх сацыяльнай небяспекі, а таксама ад ступені ўдзелу іх у даным злачынстве.

26. Неданясенне аб зробленым або рыхтуючымся злачынстве праследуецца толькі ў выпадках, указаных у гэтым Кодэксе.

* 27. Мерамі сацыяльнай аховы[2]) судова-папраўчага характару з'яўляюцца:

а) аб'яўленне ворагам працоўных з пазбаўленнем грамадзянства БССР або іншай саюзнай рэспублікі і тым самым грамадзянства Саюза ССР і з выгнаннем з Саюза ССР назаўсёды;

б) пазбаўленне волі ў папраўча-працоўных лагерах у аддаленых мясцовасцях Саюза ССР;

в) пазбаўленне волі ў агульных месцах зняволення;

---

[1]) Гл. зноску 3 да заўвагі артыкула 27, стар. 7.

[2]) У агульнасаюзным заканадаўстве з 1934 года замест тэрміна «мера сацыяльнай аховы» ўжываецца тэрмін «пакаранне».

г) папраўча-працоўныя работы без пазбаўлення волі [1]);
д) паражэнне правоў поўнае або частковае;
е) выдаленне з Саюза ССР на пэўны тэрмін;
ж) выдаленне на пэўны тэрмін з БССР або з асобнай яе мясцовасці з назначэннем або без назначэння месца жыхарства, а таксама з забаронай пражываць у тых ці іншых мясцовасцях або без такой забароны;
з) звальненне ад пасады з забаронай займання той ці іншай пасады або без такой забароны;
і) забарона займання той ці іншай дзейнасцю або промыслам;
к) грамадскае ганьбаванне;
л) канфіскацыя ўсёй або часткі маёмасці;
м) штраф;
н) перасцярога.

Заўвага. Для барацьбы з найбольш цяжкімі злачынствамі, якія пагражаюць асновам совецкай улады або совецкага ладу, часова, да адмены Цэнтральным Выканаўчым Камітэтам [2]) Саюза ССР, у выпадках, указаных у гэтым Кодэксе, дапускаецца ў якасці вышэйшай меры социяльнай аховы расстрэл [3]).

Суд не можа прымяняць расстрэлу да асоб, якія не дасягнулі ў момант выканання злачынства 18 год, а таксама да жанчын, якія знаходзяцца ў час вынясення прыгавору ў стане цяжарнасці. Вышэйшай мерай социяльнай аховы для злачынцаў гэтых катэгорый з'яўляецца пазбаўленне волі ў папраўча-працоўных лагерах у аддаленых мясцовасцях Саюза ССР на дзесяць год [17 студзеня 1930 г. (ЗЗ № 6, п. 41)].

**28.** Аб'яўленне ворагам працоўных з пазбаўленнем грамадзянства БССР або іншай саюзнай рэспублікі і тым самым грамадзянства Саюза ССР і з выгнаннем з Саюза ССР назаўсёды, пазбаўленне волі ў папраўча-працоўных лагерах аддаленых мясцовасцей Саюза ССР або ў агульных месцах зняволення, папраўча-працоўныя работы без пазбаўлення волі і перасцярога прымяняюцца толькі як асноўныя меры социяльнай аховы. Усе іншыя меры социяльнай аховы судова-папраўчага характару могуць прымяняцца як асноўныя і як дадатковыя меры [17 студзеня 1930 г. (ЗЗ № 6, п. 41)].

* **29.** Аб'яўленне ворагам працоўных з пазбаўленнем грамадзянства БССР або іншай саюзнай рэспублікі і тым самым грамадзянства Саюза ССР і з выгнаннем з Саюза ССР назаўсёды прымяняецца толькі да асоб, асуджаных за злачынствы, якія пагражаюць асновам совецкага ладу.

У выпадку самавольнага звароту асобы, выгнанай па прыгавору суда з Саюза ССР, а таксама ў выпадку немагчымасці пры-

---

1) Зменена назва меры социяльнай аховы згодна з пазнейшым заканадаўствам.

2) Вярхоўным Советам.

3) Гл. Указы Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР: ад 26 мая 1947 г. «Аб адмене пакарання смерцю», стар. 58; ад 12 студзеня 1950 г. «Аб прымяненні пакарання смерцю да здраднікаў радзімы, шпіёнаў, падрыўнікоў-дыверсантаў», стар. 59; ад 30 красавіка 1954 г. «Аб узмацненні крымінальнай адказнасці за наўмыснае забойства», стар. 59.

весці ў выкананне прыгавор аб выгнанні суд прымяняе да асуджанага іншую меру сацыяльнай аховы не ніжэй пазбаўлення волі ў папраўча-працоўных лагерах у аддаленых мясцовасцях Саюза ССР на пяць год [17 студзеня 1930 г. (ЗЗ № 6, п. 41)].

* **30.** Пазбаўленне волі ў папраўча-працоўных лагерах у аддаленых мясцовасцях Саюза ССР прымяняецца на тэрмін ад трох да дзесяці год [1]).

Пазбаўленне волі ў агульных месцах зняволення прымяняецца на тэрмін да трох год, прычым асобы, асуджаныя да пазбаўлення волі ў агульных месцах зняволення, адбываюць гэтую меру сацыяльнай аховы па агульнаму правілу ў папраўча-працоўных калоніях.

У выключных выпадках, прызнаўшы, што асуджаны па ступені сваёй сацыяльнай небяспекі не патрабуе накіравання ў папраўча-працоўны лагер або яўна не прыгодны для фізічнай працы, суд мае права замяніць утрыманне ў лагеры пазбаўленнем волі ў агульных месцах зняволення на той-жа тэрмін, указаўшы матывы замены ў прыгаворы [17 студзеня 1930 г. (ЗЗ № 6, п. 41)].

**31.** Адменен [27 ліпеня 1934 г. (ЗЗ № 31, п. 150)].

**32.** Ваеннаслужачаму, асуджанаму ў ваенны час да пазбаўлення волі без паражэння правоў, выкананне прыгавору можа быць адтэрмінавана да сканчэння ваенных дзеянняў па вызначэнню суда, які вынес прыгавор, з накіраваннем ваеннаслужачага ў штрафную часць.

Калі гэты ваеннаслужачы праявіць сябе стойкім абаронцам Саюза ССР, то па хадайніцтву адпаведнага ваеннага камандавання вызначэннем суда ён можа быць вызвален ад назначанага раней пакарання або падвергнут іншаму, больш мяккаму пакаранню (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 8 красавіка 1957 г.).

**32[1].** Прыгавор, які прысуджае ў ваенны час работнікаў чыгуначнага і воднага транспарту да пазбаўлення волі без паражэння правоў, можа быць па вызначэнню суда, вынесшага прыгавор, адтэрмінаван выкананнем да сканчэння ваенных дзеянняў з тым, што асуджаныя накіроўваюцца: у дзеючую армію — асобы прызыўнога ўзросту, прыгодныя да нясення ваеннай службы, а астатнія на прадпрыемствы чыгуначнага і воднага транспарту з выкарыстаннем іх на пасадах па меркаванню кіраўнікоў прадпрыемстваў.

У адносінах асоб, якія асуджаны з прымяненнем гэтага артыкула і паказалі сябе добра ў рабоце на транспарце, дапускаецца па хадайніцтву адпаведнага кіраўніка прадпрыемства — вызваленне ад назначанай па прыгавору суда меры пакарання або замена яе больш мяккай мерай па вызначэнню суда, вынесшага прыгавор (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 11 студзеня 1945 г.).

---

[1]) Гл. Указы Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР: ад 4 чэрвеня 1947 г. «Аб крымінальнай адказнасці за крадзеж дзяржаўнай і грамадскай маёмасці», стар. 63; ад 4 чэрвеня 1947 г. «Аб узмацненні аховы асабістай уласнасці грамадзян», стар. 64; ад 9 чэрвеня 1947 г. «Аб адказнасці за разгалашэнне дзяржаўнай тайны і за страту дакументаў, якія змяшчаюць дзяржаўную тайну», стар. 60; ад 4 студзеня 1949 г. «Аб узмацненні крымінальнай адказнасці за згвалтаванне», стар. 62.

* 33. Папраўча-працоўныя работы без пазбаўлення волі прымяняюцца не менш як на тры дні і не больш як на адзін год.

У выпадку ўпартага або паўторнага ўхілення ад выканання папраўча-працоўных работ без пазбаўлення волі суд замяняе гэтую меру сацыяльнай аховы пазбаўленнем волі на тэрмін, роўны $^1/_3$ часткі вызначанага ў прыгаворы тэрміну папраўча-працоўных работ.

Да ваеннаслужачых вышэйшага, сярэдняга, старшага і малодшага звыштэрміновай службы кадравага начальніцкага саставу Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, а таксама да ваеннаслужачых кадравага радавога і малодшага тэрміновай службы саставу Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, прыгавораных да папраўча-працоўных работ на тэрмін да аднаго года, замест гэтых работ прымяняецца пазбаўленне волі на тэрмін да двух месяцаў, якое адбываецца ў парадку, устаноўленым для адбывання ваеннаслужачымі дысцыплінарнага арышту [15 ліпеня 1930 г. (ЗЗ № 28, п. 179) і 27 ліпеня 1934 г. (ЗЗ № 31, п. 150)].

33[1]. Час адбывання папраўча-працоўных работ, у тым ліку і па месцу работы асуджанага, не залічваецца ў агульны працоўны стаж і ў стаж для вызначэння кваліфікацыі, а таксама стаж работы, які дае права па законадаўству Саюза ССР і БССР на атрыманне пенсій і іншых ільгот і пераваг (надбавак да ставак заработнай платы за выслугу год і да т. п.).

Выплата надбавак да ставак заработнай платы за выслугу год за час адбывання папраўча-працоўных работ прыпыняецца [6 ліпеня 1935 г. (ЗЗ № 25, п. 135)].

34. Пад поўным паражэннем правоў разумеецца пазбаўленне:

а) права выбіраць і быць выбранымі ў Советы;

б) права займаць выбарныя пасады ў грамадскіх арганізацыях і права выконваць грамадскія абавязкі (як: народнага засядацеля, апекуна, сельскага выканаўцы і інш.);

в) права займаць тыя ці іншыя дзяржаўныя пасады;

г) права на ганаровыя званні;

д) бацькоўскіх правоў;

е) права на пенсіі, якія выдаюцца ў парадку сацыяльнага страхавання і дзяржаўнага забеспячэння, і на дапамогу па беспрацоўю, якая выдаецца ў парадку сацыяльнага страхавання [1]).

Пад частковым паражэннем правоў разумеецца пазбаўленне аднаго або некалькіх, але не ўсіх пералічаных правоў.

Пазбаўленне бацькоўскіх правоў можа прымяняцца толькі пры ўстанаўленні судом злоўжывання асуджаным гэтымі правамі.

Пазбаўленне права на пенсіі і дапамогу можа прымяняцца толькі за злачынствы, якія асобна прадугледжаны законам [15 мая 1930 г. (ЗЗ № 21, п. 139)].

* 35. Пры паражэнні правоў поўным, а таксама пры паражэнні правоў частковым, калі асуджаны пазбаўляецца права выбіраць і быць выбраным у Советы, суд абавязан увайсці з хадайніцтвам у Цэнтральны Выканаўчы Камітэт [2]) Саюза ССР, БССР

---

[1]) У сувязі з ліквідацыяй беспрацоўя п. «е» ў адпаведнай частцы страціў сілу.

[2]) У Вярхоўны Совет.

БССР ... ЛЕНІНА

або іншай саюзнай рэспубліці, па прыналежнасці, аб пазбаўленні асуджанага даных імі знакаў узнагароды[1]).

Пазбаўленне іншых знакаў узнагароды і ганаровых званняў робіцца судом.

Заўвага. Калі асуджаны пазбаўлен бацькоўскіх правоў без паражэння правоў поўнага або частковага, то ганаровых званняў і знакаў узнагароды ён не пазбаўляецца.

**36.** Суд абавязан абмеркаваць пытанне аб паражэнні правоў поўным або частковым кожны раз, калі ён прымяняе да асуджанага пазбаўленне волі больш чым на адзін год. Пры прымяненні больш мяккай меры соцыяльнай аховы паражэнне правоў поўнае або частковае не дапускаецца.

**37.** Паражэнне правоў поўнае або частковае прымяняецца не менш як на адзін год і не больш як на пяць год.

Паражэнне правоў поўнае або частковае, як дадатковая да пазбаўлення волі мера соцыяльнай аховы, распаўсюджваецца на ўвесь час зняволення асуджанага і, звыш таго, на тэрмін, вызначаны прыгаворам.

Пазбаўленне правоў на пенсіі, якія выдаюцца ў парадку соцыяльнага страхавання і дзяржаўнага забеспячэння, можа прымяняцца толькі як дадатковая мера соцыяльнай аховы на тэрмін, установлены судом, за злачынствы, прадугледжаныя: а) артыкуламі 64—76, 79—91, 93, 94, 94[1], 95, 103, пп. «б» і «в» арт. 106, 106[2], п. «б» арт. 107, п. «б» арт. 116, 117, п. «б» арт. 121[1], 155, 166, 167, 170, 172, 175, 176, 180, 183, 184—191, 198, 199, 204, 205, 207, 208, 214, 217, 219, 225, 227, 228, п. «б» арт. 231, 233, 234, 235, 236, п. «б» арт. 240, 241, 242, 243, пп. «б» і «в» арт. 245, 246, 247, 250 і 262 Крымінальнага кодэкса і б) Пастановай ЦВК і СНК Саюза ССР ад 7 жніўня 1932 г. «Аб ахове маёмасці дзяржаўных прадпрыемстваў, калгасаў і кааперацыі і ўмацаванні грамадскай (соцыялістычнай) уласнасці» (ЗЗ СССР 1932 г. № 62, арт. 360).

У ваенны час суд можа пазбавіць права на пенсію і за злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 165, 168, 169, 171, 173, 174, 177, 178, 179, 181, 182, 192, 193 і 194 Крымінальнага кодэкса.

Пазбаўляюцца права на ўсе віды пенсій і дапамог у парадку дзяржаўнага забеспячэння асобы сярэдняга, старшага і вышэйшага начальніцкага саставу, асобы малодшага начальніцкага і радавога саставу звыштэрміновай службы і курсанты школ Ваеннапаветраных сіл РСЧА, а таксама члены сем'яў гэтых асоб, прыгавораныя да пазбаўлення волі з паражэннем або без паражэння права выбіраць у Советы або да высялення з назначэннем або без назначэння месца жыхарства за злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі: 64—76, 79, 80, 80[1], 80[2], 80[3], 82, 84, 85, 87, 88, 91, 93, 94, 94[1], 95, 103, пп. «б» і «в» арт. 106, 106[2], п. «б» арт. 116, 117, п. «б» арт. 121[1], 155, пп. «в» і «г» арт. 165, 166, пп. «б» і «в» арт. 167, п. «д» арт. 170, п. «б» арт. 171, п. «а» арт. 172, 173, п. «б» арт. 175, п. «б» арт. 180, 183, 184, 185, 186, 187, пп. «а» і «б» арт. 188, 190, 191, 198, 199, 204, 205, 207, 208, 214, 219, 241, 242, 243, пп. «б» і «в» арт. 245, 246, 247, п. «б» арт. 250, 262 Крымінальнага кодэкса і Пастановай ЦВК і СНК Саюза ССР ад 7 жніўня 1932 г. «Аб ахове маёмасці дзяржаўных

---

[1]) Пазбаўленне ордэнаў СССР робіцца Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР.

прадпрыемстваў, калгасаў і кааперацыі і ўмацаванні грамадскай (социялістычнай) уласнасці» (ЗЗ 1932 г. № 62, арт. 360). [3 сакавіка 1933 г. (ЗЗ № 7, п. 40)].

38. Выдаленне з БССР або з яе асобнай мясцовасці з забаронай пражываць у тых ці іншых мясцовасцях або без такой забароны можа прымяняцца судом на тэрмін ад аднаго да пяці год да асоб, пражыванне якіх у данай мясцовасці па іх злачыннай дзейнасці або па сувязі іх са злачынным асяроддзем суд прызнае социяльна-небяспечным.

Выдаленне з БССР або з асобнай яе мясцовасці з абавязковым пасяленнем у другой мясцовасці ў злучэнні з папраўча-працоўнымі работамі або без папраўча-працоўных работ прымяняецца судом на тэрмін ад трох да дзесяці год у выпадках, калі суд прызнае, што социяльная небяспека злачынца можа быць устаронена пасяленнем яго ў пэўнай мясцовасці.

Выдаленне з БССР або з асобнай яе мясцовасці з абавязковым пасяленнем у другой мясцовасці ў злучэнні з папраўча-працоўнымі работамі можа прымяняцца толькі ў якасці асноўнай меры социяльнай аховы. Прычым папраўча-працоўныя работы могуць назначацца як на ўвесь тэрмін, так і на частку яго.

Выдаленне з БССР або з асобнай яе мясцовасці з абавязковым пасяленнем у іншай мясцовасці ў якасці дадатковай меры социяльнай аховы можа прымяняцца на тэрмін толькі да пяці год.

Прысуджаныя да выдалення з абавязковым пасяленнем у іншай мясцовасці, як дадатковай меры да пазбаўлення волі ў папраўча-працоўных лагерах у аддаленых мясцовасцях Саюза ССР, пасля адбыцця зняволення пасяляюцца на тэрмін, указаны ў прыгаворы, у раёне лагера з надзяленнем зямлёй або з прадастаўленнем аплачваемай работы [19 снежня 1933 г. (ЗЗ № 52, п. 341)].

* 39. Выдаленне з БССР або з асобнай мясцовасці яе з назначэннем або без назначэння месца жыхарства, а таксама з забаронай пражывання ў тых або іншых мясцовасцях або без такой забароны можа прымяняцца па прыгавору суда не менш як на адзін год і не больш як на пяць год да асоб, прыцягнутых да крымінальнай адказнасці, хоць-бы прад'яўленае ім абвінавачанне і не было на судзе даказана, калі суд прызнае пражыванне гэтых асоб у данай мясцовасці па іх злачыннай дзейнасці або па сувязі іх са злачынным асяроддзем социяльна-небяспечным.

Тыя-ж меры социяльнай аховы і на той-жа тэрмін могуць прымяняцца па прыгавору суда таксама да асоб, не прыцягнутых да крымінальнай адказнасці за злачынствы, калі суд прызнае пражыванне гэтых асоб у данай мясцовасці па іх злачыннай дзейнасці або па сувязі іх са злачынным асяроддзем социяльна-небяспечным. Пытанне аб выдаленні такіх асоб можа быць узбуджана пракурорам па ўласнай ініцыятыве або па ініцыятыве мясцовага Совета.

40. Звальненне ад пасады прымяняецца, калі суд прызнае немагчымым пакінуць асуджанага на пасадзе, якую ён займаў у час учынення злачынства або ў час асуджэння. Адначасова са звальненнем суд можа забараніць асуджанаму займаць тую ці іншую пасаду на працягу не менш аднаго года і не больш пяці год.

41. Забарона займацца той ці іншай дзейнасцю або промыслам прымяняецца не менш як на адзін год і не больш як на пяць год, калі суд прызнае, што асуджаны пры займанні сваёй дзейнасцю або промыслам рабіў злоўжыванні і што далейшае займанне асуджанага гэтай дзейнасцю або промыслам недапушчальна.

У прыватнасці, суд можа забараніць асуджанаму прымаць на сябе абавязацельства па дзяржаўных падрадах і пастаўках, заключаць здзелкі з дзяржаўнымі, грамадскімі і кааператыўнымі прадпрыемствамі і ўстановамі, кіраваць ад свайго імя або па даручэнню іншых асоб гандлёвымі і камісійнымі прадпрыемствамі.

42. Грамадскае ганьбаванне абавязкова аб'яўляецца ў друку.

* 43. Канфіскацыя маёмасці заключаецца ў прымусовым бязвыплатным адчужэнні ў карысць дзяржавы ўсёй або дакладна вызначанай судом маёмасці, належачай асабіста асуджанаму.

Поўная або частковая канфіскацыя ў якасці асноўнай або дадатковай меры сацыяльнай аховы можа прымяняцца толькі ў выпадку, калі яна прадугледжана ў тым артыкуле гэтага Кодэкса, пад які падпадае данае злачынства. Не можа быць канфіскавана маёмасць, пералічаная ў спецыяльным законе.

44. Пры канфіскацыі ўсёй або часткі маёмасці дзяржава не адказвае па даўгах і абавязацельствах, якія падаюць на маёмасць, калі яны ўзніклі пасля прыняцця следчай або судовай уладай мер аховы маёмасці і без згоды ахоўваючага гэтую маёмасць органа.

Па іншых прэтэнзіях, якія падлягаюць задавальненню за кошт канфіскуемай маёмасці, дзяржава адказвае толькі гэтай маёмасцю, прычым прэтэнзіі гэтыя задавальняюцца ў парадку чарговасці, прадугледжанай Грамадзянскім і Грамадзянскім працэсуальным кодэксамі [17 снежня 1929 г. (ЗЗ № 45, п. 271)].

45. Штраф заключаецца ў прымусовым спагнанні ў карысць дзяржавы грашовай сумы, дакладна вызначанай судом у адпаведнасці з маёмасным становішчам асуджанага.

Штраф у якасці асноўнай меры сацыяльнай аховы прымяняецца ў выпадках, прадугледжаных тымі артыкуламі гэтага Кодэкса, пад якія падпадае данае злачынства.

Штраф у якасці дадатковай меры сацыяльнай аховы прымяняецца ў тых выпадках, калі суд знойдзе гэта неабходным, і ў тым размеры, які ён вызначыць для данага выпадку.

Заўвага 1. Штраф не можа быць спагнан шляхам продажу маёмасці, якая не падлягае канфіскацыі на падставе спецыяльнага закона.

Заўвага 2. Калі прысуджаны да штрафу не выплаціць яго і штраф не можа быць спагнан у прымусовым парадку, то суд замяняе штраф папраўча-працоўнымі работамі без пазбаўлення волі не больш як на адзін год з разліку адзін дзень папраўча-працоўных работ за аднадзённы сярэдні заработак у данай мясцовасці. Замена штрафу пазбаўленнем волі не дапускаецца.

46. Перасцярога можа быць аб'яўлена ў апраўдальным прыгаворы, калі прад'яўленае падсуднаму абвінавачанне не будзе даказана, але паводзіны падсуднага дадуць суду падставу лічыць, што ён можа зрабіць злачынства ў будучым.

47. Час зняволення да ўступлення прыгавору ў законную сілу

абавязкова поўнасцю залічваецца ў вызначаны прыгаворам тэрмін пазбаўлення волі.

Калі асоба, падвергнутая зняволенню да суда, прысуджана да папраўча-працоўных работ без пазбаўлення волі, то час зняволення да суда абавязкова залічваецца ў вызначаны прыгаворам тэрмін папраўча-працоўных работ без пазбаўлення волі, лічачы адзін дзень зняволення за тры дні папраўча-працоўных работ без пазбаўлення волі.

Пры прымяненні да асуджанага ўсіх іншых мер сацыяльнай аховы судова-папраўчага характару, апрача ўказаных у пп. «а», «м» і «н» арт. 27 гэтага Кодэкса, суд абавязкова прымае пад увагу час зняволення да суда і адпаведна змякчае выбраную ім меру сацыяльнай аховы або зусім не прымяняе да асуджанага гэтай меры.

**48.** Пры вызначэнні мер сацыяльнай аховы суд прымае пад увагу ступень і характар небяспекі злачынца і зробленага ім злачынства, асобу злачынца, матывы злачынства, а таксама наколькі само злачынства ў даных умовах месца і часу з'яўляецца грамадска-небяспечным.

**49.** Больш строгая мера сацыяльнай аховы вызначаецца судом:

а) калі злачынства зроблена ў мэтах аднаўлення ўлады буржуазіі;

б) калі злачынства хоць і не накіравана непасрэдна супроць інтарэсаў Савецкай дзяржавы або інтарэсаў працоўных, але па сваіх аб'ектыўных выніках можа прынесці шкоду гэтым інтарэсам;

в) калі злачынства зроблена групай або бандай;

г) калі злачынства зроблена асобай, якая ўжо судзілася за якое-небудзь злачынства, за выключэннем выпадкаў, калі даная асоба прызнаецца несудзіўшайся (арт. 21), або калі з часу ўчынення першага злачынства ці вынясення па ім прыгавору прайшлі тэрміны даўнасці (арт. 16), пры гэтым, аднак, суд мае права ў залежнасці ад характару першага злачынства не прызнаць за ім абцяжваючага значэння;

д) калі злачынства зроблена з карысных або іншых нізкіх пабуджэнняў або ў адносінах асоб, падпарадкаваных зрабіўшаму злачынства, або знаходзіўшыхся на яго апекаванні, або ў асабліва бездапаможным па ўзросту ці іншых умовах стане;

е) калі злачынства зроблена з асаблівай жорсткасцю, насіллем або хітрасцю [17 снежня 1929 г. (ЗЗ № 45, п. 271)].

**50.** Больш мяккая мера сацыяльнай аховы вызначаецца судом, калі злачынства зроблена:

а) хоць і з перавышэннем мер неабходнай абароны, але для аховы ад пасягання на савецкую ўладу, на рэвалюцыйны правапарадак або на асобу і правы таго, хто абараняўся, ці іншай асобы;

б) першы раз;

в) без карыслівых і якіх-бы там ні было нізкіх пабуджэнняў;

г) пад уплывам службовай або эканамічнай залежнасці, пагрозы або прымусу;

д) пад уплывам моцнага нервовага хвалявання;

е) у стане голаду, галечы і наогул пад уплывам цяжкіх асабістых або сямейных умоў;

ж) па несвядомасці;
з) няпоўналетняй асобай або цяжарнай жанчынай.

**51.** Калі суд прызнае мэтазгодным назначыць меру соцыяльнай аховы ніжэй ніжэйшай мяжы размеру, устаноўленага адпаведным артыкулам гэтага Кодэкса, або выбраць іншую менш цяжкую меру, не ўказаную ў гэтым артыкуле, то суд можа гэта зрабіць, але не інакш, як дакладна выклаўшы ў прыгаворы матывы змякчэння.

Калі суд лічыць, што абвінавачваемы к часу разгляду справы не з'яўляецца соцыяльна-небяспечным, то суд мае права, указаўшы ў прыгаворы адпаведныя матывы, зусім не прымяняць да яго мер соцыяльнай аховы [17 снежня 1929 г. (ЗЗ № 45, п. 271)].

**52.** Права вызваляць асуджаных ад прымянення мер соцыяльнай аховы і паніжаць устаноўленую законам меру соцыяльнай аховы належыць у адносінах прыгавораў народных і акруговых судоў і Вярхоўнага суда БССР Цэнтральнаму Выканаўчаму Камітэту БССР [1]) [17 снежня 1929 г. (ЗЗ № 45, п. 271)].

* **53.** Калі ў дзеянні, якое зроблена абвінавачваемым, ёсць адзнакі некалькіх злачынстваў, прадугледжаных рознымі артыкуламі гэтага Кодэкса, то мера соцыяльнай аховы вызначаецца судом на падставе артыкула, які выклікае больш строгую меру.

* **54.** Калі абвінавачваемы зробіць да прыгавору два або больш злачынстваў, то меры соцыяльнай аховы вызначаюцца за кожнае злачынства ў паасобку, але прымяняецца больш цяжкая з вызначаных судом мер.

**55.** Калі асуджаны зробіць адно або больш злачынстваў пасля прыгавору па раней зробленаму злачынству, але да адбыцця назначанай у ім меры соцыяльнай аховы, то мера соцыяльнай аховы за новае злачынства вызначаецца самастойна, аднак з такім разлікам, каб мера соцыяльнай аховы за ўсе гэтыя злачынствы разам не перавышала найвышэйшай мяжы, устаноўленай гэтым Кодэксам для данага віду меры соцыяльнай аховы.

**56.** Калі пры вынясенні прыгавору, які прысуджае да папраўча-працоўных работ або да пазбаўлення волі, выявіцца, што ступень грамадскай небяспекі асуджанага не патрабуе ізаляцыі яго або назначэння яму папраўча-працоўных работ, то суд мае права пастанавіць аб непрывядзенні прыгавору ў выкананне пад умовай, што асуджаны не зробіць новага не менш цяжкага злачынства на працягу назначанага судом выпрабавальнага тэрміну. Пры гэтым, пры назначэнні ў прыгаворы папраўча-працоўных работ або пазбаўлення волі да аднаго года, выпрабавальны тэрмін назначаецца ад аднаго года да трох год, а пры назначэнні пазбаўлення волі больш аднаго года — выпрабавальны тэрмін назначаецца ад трох да дзесяці год.

**57.** Калі ўмоўна асуджаны на працягу выпрабавальнага тэрміну зробіць новае злачынства, то суд мае права або далучыць умоўна адтэрмінаваную меру соцыяльнай аховы поўнасцю ці часткова да меры соцыяльнай аховы, назначанай па новай справе, або прымяніць да асуджанага толькі меру соцыяльнай аховы, на-

---

[1]) Права памілавання асуджаных судовымі органамі БССР (народнымі, абласнымі судамі і Вярхоўным судом БССР) належыць Прэзідыуму Вярхоўнага Совета БССР (п. «ж» арт. 31 Канстытуцыі БССР).

значаную па другому прыгавору. Аднак увесь тэрмін пазбаўлення волі не можа перавышаць дзесяці год, а ўвесь тэрмін папраўча-працоўных работ — аднаго года [17 снежня 1929 г. (ЗЗ № 45. п. 271)].

**58.** Мерамі соцыяльнай аховы медыцынскага характару з'яўляюцца:

а) прымусовае лячэнне;

б) змяшчэнне ў медыка-ізаляцыйныя ўстановы.

**59.** Мерамі соцыяльнай аховы медыка-педагагічнага характару з'яўляюцца:

а) аддача няпоўналетняга на апеку бацькам, усынаўляльнікам, апекунам, папячыцелям, сваякам, калі яны могуць яго ўтрымліваць, або іншым асобам і ўстановам;

б) змяшчэнне ў спецыяльныя ўстановы.

**60.** Меры соцыяльнай аховы медыцынскага і медыка-педагагічнага характару, калі яны не былі прыменены адпаведнымі органамі да судовага разбору, могуць быць прыменены судом у выпадку, калі ён прызнае нямэтазгодным прымяненне мер соцыяльнай аховы судова-папраўчага характару.

**61.** Да асоб, якія асуджаны да адбыцця пакарання ў месцах зняволення і даказалі сваё выпраўленне сумленнымі адносінамі да працы і прыкладнымі паводзінамі, пасля адбыцця імі не менш двух трэцей тэрміну пакарання можа быць прыменена ўмоўна-датэрміновае вызваленне.

Умоўна-датэрміновае вызваленне выражаецца або ў вызваленні ад далейшага адбыцця меры пакарання, або ў замене яе больш мяккай мерай пакарання і вырашаецца судом па месцу ўтрымання асуджанага, на падставе прадстаўлення адміністрацыі месц зняволення (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 18 студзеня 1955 г.).

**62.** Калі ўмоўна-датэрмінова вызвалены зробіць на працягу неадбытага тэрміну пакарання новае злачынства, за якое можа быць назначана пазбаўленне волі, то суду прадастаўляецца права далучэння неадбытай ім часткі тэрміну да той меры пакарання, якая будзе назначана судом за новае злачынства.

У гэтым выпадку агульны тэрмін пазбаўлення волі павінен устанаўлівацца ў адпаведнасці з дзеючым законадаўствам (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 18 студзеня 1955 г.).

## II. КОНТРРЭВОЛЮЦЫЙНЫЯ ЗЛАЧЫНСТВЫ

**63.** Контррэволюцыйным прызнаецца ўсякае дзеянне, накіраванае да звяржэння, падрыву або аслаблення ўлады рабоча-сялянскіх Советаў і выбраных імі, на падставе Канстытуцыі Саюза ССР і канстытуцый саюзных рэспублік рабоча-сялянскіх урадаў Саюза ССР, саюзных і аўтаномных рэспублік, або да падрыву ці аслаблення знешняй бяспекі Саюза ССР і асноўных гаспадарчых, палітычных і нацыянальных заваёў пролетарскай рэволюцыі.

У сілу міжнароднай салідарнасці інтарэсаў усіх працоўных такія-ж дзеянні прызнаюцца контррэволюцыйнымі і тады, калі яны накіраваны на ўсякую іншую дзяржаву працоўных, хоць-бы і не ўваходзячую ў Саюз ССР.

63[1]. Здрада радзіме, г. зн. дзеянні, зробленыя грамадзянамі Саюза ССР у шкоду ваеннай магутнасці Саюза ССР, яго дзяржаўнай незалежнасці або недатыкальнасці яго тэрыторыі, як: шпіянаж, выдача ваеннай або дзяржаўнай тайны, пераход на бок ворага, бегства або пералёт за граніцу, караецца —

вышэйшай мерай крымінальнага пакарання — расстрэлам [1]) з канфіскацыяй усёй маёмасці, а пры змякчаючых акалічнасцях — пазбаўленнем волі на тэрмін дзесяць год з канфіскацыяй усёй маёмасці [29 чэрвеня 1934 г. (ЗЗ № 29, п. 141)].

63[2]. Тыя-ж злачынствы (арт. 63 [1]), зробленыя ваеннаслужачымі, караюцца —

вышэйшай мерай крымінальнага пакарання — расстрэлам [1]) з канфіскацыяй усёй маёмасці [29 чэрвеня 1934 г. (ЗЗ № 29, п. 141)].

63[3]. У выпадку пабегу або пералёту за граніцу ваенна-служачага поўналетнія члены яго сям'і, калі яны чым-небудзь садзейнічалі рыхтуемай або зробленай здрадзе або хоць-бы ведалі аб ёй, але не давялі аб гэтым да ведама ўлад, караюцца —

пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці год з канфіскацыяй усёй маёмасці.

Астатнія поўналетнія члены сям'і здрадніка, якія сумесна з ім пражывалі або знаходзіліся на яго ўтрыманні к моманту ўчынення злачынства, падлягаюць пазбаўленню выбарчых правоў і ссылцы ў аддаленыя раёны Сібіры на пяць год [29 чэрвеня 1934 г. (ЗЗ № 29, п. 141)].

63[4]. Неданясенне ваеннаслужачым аб рыхтуемай або зробленай здрадзе выклікае —

пазбаўленне волі на дзесяць год.

Неданясенне астатнімі грамадзянамі (не ваеннаслужачымі) праследуецца згодна з арт. 73 гэтага Кодэкса [29 чэрвеня 1934 г. (ЗЗ № 29, п. 141)].

64. Узброенае паўстанне або ўварванне ў контррэвалюцыйных мэтах на совецкую тэрыторыю ўзброеных банд, захоп улады ў цэнтры або на месцах у тых-жа мэтах і, у прыватнасці, з мэтай насільна адарваць ад Саюза ССР і асобнай саюзнай рэспублікі якую-небудзь частку яе тэрыторыі або скасаваць заключаныя Саюзам ССР з замежнымі дзяржавамі дагаворы выклікаюць —

вышэйшую меру соцыяльнай аховы — расстрэл або аб'яўленне ворагам працоўных з канфіскацыяй маёмасці і з пазбаўленнем грамадзянства БССР або іншай саюзнай рэспублікі і тым самым грамадзянства Саюза ССР і з выгнаннем з межаў Саюза ССР назаўсёды, з дапушчэннем пры змякчаючых акалічнасцях паніжэння да пазбаўлення волі на тэрмін не ніжэй трох год з канфіскацыяй усёй або часткі маёмасці.

65. Зносіны ў контррэвалюцыйных мэтах з замежнай дзяржавай або асобнымі яе прадстаўнікамі, а таксама садзейнічанне якім-бы там ні было спосабам замежнай дзяржаве, якая знаходзіцца з Саюзам ССР у стане вайны або вядзе з ім барацьбу шляхам інтэрвенцыі або блакады, выклікаюць —

меры соцыяльнай аховы, указаныя ў арт. 64 гэтага Кодэкса.

---

[1]) Гл. зноску 3 да заўвагі артыкула 27, стар. 7.

66. Аказанне якім-бы там ні было спосабам дапамогі той часткі міжнароднай буржуазіі, якая, не прызнаючы роўнапраўя камуністычнай сістэмы, прыходзячай на змену капіталістычнай сістэме, імкнецца да яе звяржэння, а таксама знаходзячымся пад уплывам або непасрэдна арганізаваным гэтай буржуазіяй грамадскім групам і арганізацыям у ажыццяўленні варожай супроць Саюза ССР дзейнасці выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй трох год з канфіскацыяй усёй або часткі маёмасці, з павышэннем пры асабліва абцяжваючых акалічнасцях аж да вышэйшай меры соцыяльнай аховы — расстрэлу [1]) або аб'яўлення ворагам працоўных з канфіскацыяй маёмасці і з пазбаўленнем грамадзянства БССР або іншай саюзнай рэспублікі і тым самым грамадзянства Саюза ССР і з выгнаннем з межаў Саюза ССР назаўсёды.

67. Схіленне замежнай дзяржавы або якіх-небудзь у ёй грамадскіх груп шляхам зносін з іх прадстаўнікамі, выкарыстання фальшывых дакументаў або іншымі сродкамі да аб'яўлення вайны, узброенага ўмяшання ў справы Саюза ССР або іншых варожых дзеянняў, у прыватнасці да блакады, да захопу дзяржаўнай маёмасці Саюза ССР або саюзных рэспублік, разрыву дыпламатычных зносін, разрыву заключаных з Саюзам ССР дагавораў і да т. п. выклікае —

меры соцыяльнай аховы, указаныя ў арт. 64 гэтага Кодэкса.

68. а) Шпіянаж, г. зн. перадача, выкраданне або збіранне з мэтай перадачы звестак, якія з'яўляюцца па свайму зместу спецыяльна ахоўваемай дзяржаўнай тайнай, замежным дзяржавам, контррэволюцыйным арганізацыям або прыватным асобам, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй трох год з канфіскацыяй усёй або часткі маёмасці, а ў тых выпадках, калі шпіянаж выклікаў або мог выклікаць асабліва цяжкія вынікі для інтарэсаў Саюза ССР,— вышэйшую меру соцыяльнай аховы — расстрэл [1]) або аб'яўленне ворагам працоўных з канфіскацыяй маёмасці і з пазбаўленнем грамадзянства БССР або іншай саюзнай рэспублікі і тым самым грамадзянства Саюза ССР і з выгнаннем з межаў Саюза ССР назаўсёды.

б) Перадача, выкраданне або збіранне з мэтай перадачы эканамічных звестак, якія не складаюць па свайму зместу спецыяльна ахоўваемай дзяржаўнай тайны, але не падлягаюць агалашэнню па прамой забароне закону або распараджэнню кіраўнікоў ведамстваў, устаноў і прадпрыемстваў, за ўзнагароджанне або дармова, арганізацыям і асобам, указаным вышэй, выклікаюць —

пазбаўленне волі на тэрмін да трох год.

Заўвага 1. Спецыяльна ахоўваемай дзяржаўнай тайнай лічацца звесткі, названыя ў асобым пераліку, які зацвярджаецца Советам Народных Камісараў Саюза ССР па ўзгадненню з Советамі народных камісараў саюзных рэспублік і апублікоўваецца да ўсеагульнага ведама.

Заўвага 2. У адносінах шпіянажу асоб, упамянутых у арт. 164 гэтага Кодэкса, прымяняецца арт. 187 Кодэкса.

---

[1]) Гл. зноску 3 да заўвагі артыкула 27, стар. 7.

* **69.** Падрыў дзяржаўнай прамысловасці, транспарту, гандлю, грашовага абароту або крэдытнай сістэмы, а таксама каапера-цыі, зроблены ў контррэволюцыйных мэтах шляхам адпаведнага выкарыстання дзяржаўных устаноў і прадпрыемстваў або процідзеянне іх нармальнай дзейнасці, а таксама выкарыстанне дзяржаўных устаноў і прадпрыемстваў або процідзеянне іх дзейнасці, якое робіцца ў інтарэсах былых уласнікаў або зацікаўленых капіталістычных арганізацый, выклікаюць —

меры соцыяльнай аховы, указаныя ў арт. 64 гэтага Кодэкса.

**70.** Выкананне тэрарыстычных актаў, накіраваных супроць прадстаўнікоў совецкай улады або дзеячоў рэволюцыйных рабочых і сялянскіх арганізацый, і ўдзел у выкананні такіх актаў, хоць-бы і асобамі, якія не належаць да контррэволюцыйнай арганізацыі, выклікаюць —

меры соцыяльнай аховы, указаныя ў арт. 64 гэтага Кодэкса.

* **71.** Разбурэнне або пашкоджанне з контррэволюцыйнай мэтай узрывам, падпалам або іншымі спосабамі чыгуначных ці іншых шляхоў і сродкаў зносін, сродкаў народнай сувязі, водаправода, грамадскіх складаў і іншых збудаванняў або дзяржаўнай ці грамадскай маёмасці выклікае —

меры соцыяльнай аховы, указаныя ў арт. 64 гэтага Кодэкса.

**72.** а) Прапаганда або агітацыя, якія змяшчаюць заклік да звяржэння, падрыву або аслаблення совецкай улады, або да ўчынення асобных контррэволюцыйных злачынстваў (арт. арт. 64—71), а таксама распаўсюджванне або выраб ці захоўванне літаратуры таго-ж зместу выклікаюць —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй шасці месяцаў.

б) Тыя-ж дзеянні пры масавых хваляваннях або з выкарыстаннем рэлігійных ці нацыянальных забабонаў мас, або ў ваеннай абстаноўцы, або ў мясцовасцях, аб'яўленых на ваенным становішчы, выклікаюць —

меры соцыяльнай аховы, указаныя ў арт. 64 гэтага Кодэкса.

**73.** Неданясенне аб дакладна вядомым рыхтуючымся або зробленым контррэволюцыйным злачынстве выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй шасці месяцаў.

**74.** Актыўныя дзеянні або актыўная барацьба супроць рабочага класа і рэволюцыйнага руху, праяўленыя на адказнай або сакрэтнай (агентура) пасадзе пры царскім ладзе або ў контррэволюцыйных урадаў у перыяд грамадзянскай вайны, выклікаюць —

меры соцыяльнай аховы, указаныя ў арт. 64 гэтага Кодэкса.

* **75.** Контррэволюцыйны сабатаж, г. зн. свядомае невыкананне кім-небудзь пэўных абавязкаў або наўмысна неахайнае іх выкананне са спецыяльнай мэтай аслаблення ўлады ўрада і дзейнасці дзяржаўнага апарата, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй аднаго года з канфіскацыяй усёй або часткі маёмасці, з павышэннем пры асабліва абцяжваючых акалічнасцях аж да вышэйшай меры соцыяльнай аховы — расстрэлу [1]) з канфіскацыяй маёмасці.

**76.** Усякага роду арганізацыйная дзейнасць, накіраваная да падрыхтоўкі або ўчынення прадугледжаных у арт. арт. 63—75 гэтага Кодэкса злачынстваў, а таксама ўдзел у арганізацыі, утворанай

---

[1]) Гл. зноску 3 да заўвагі артыкула 27, стар. 7.

для падрыхтоўкі або ўчынення аднаго з гэтых злачынстваў, выклікаюць —

меры социяльнай аховы, указаныя ў артыкуле, які прадугледжвае гэтае злачынства.

## III. ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРОЦЬ ПАРАДКУ ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАВАННЯ

77. Злачынствам супроць парадку дзяржаўнага кіравання прызнаецца ўсякае зробленае без контррэволюцыйнай мэты дзеянне, якое парушае правільную дзейнасць органаў дзяржаўнага кіравання або народнай гаспадаркі альбо аслабляе сілу і аўтарытэт улады і злучана з супраціўленнем органам улады, перашкоджаннем іх дзейнасці або непадпарадкаваннем законам.

### А. Злачынствы супроць парадку дзяржаўнага кіравання, асабліва небяспечныя для Саюза ССР

78. Асабліва небяспечнымі для Саюза ССР злачынствамі супроць парадку дзяржаўнага кіравання прызнаюцца тыя, зробленыя без контррэволюцыйных мэт, злачынствы супроць парадку дзяржаўнага кіравання, якія хістаюць асновы дзяржаўнага кіравання і гаспадарчай магутнасці Саюза ССР і саюзных рэспублік.

79. а) Масавыя беспарадкі, якія суправаджаюцца пагромамі, разбурэннем чыгуначных пуцей або іншых сродкаў зносін і сувязі, забойствамі, падпаламі і іншымі падобнымі дзеяннямі, выклікаюць—

1) у адносінах арганізатараў і кіраўнікоў масавых беспарадкаў, а таксама ўсіх удзельнікаў, якія зрабілі ўказаныя вышэй злачынствы або аказалі ўзброенае супраціўленне ўладзе, —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй двух год з канфіскацыяй усёй або часткі маёмасці, з павышэннем пры асабліва абцяжваючых акалічнасцях аж да вышэйшай меры социяльнай аховы— расстрэлу[1]) з канфіскацыяй маёмасці;

2) у адносінах іншых удзельнікаў —

пазбаўленне волі на тэрмін да трох год.

б) Масавыя беспарадкі, не абцяжаныя злачынствамі, указанымі вышэй, але злучаныя з яўным непадпарадкаваннем законным патрабаванням улады або з процідзеяннем выкананню апошнімі ўскладзеных на іх абавязкаў або прымушэннем іх да выканання яўна незаконных патрабаванняў, выклікаюць —

пазбаўленне волі на тэрмін да аднаго года.

80. Бандытызм, г. зн. арганізацыя ўзброеных банд і ўдзел у іх і ў арганізуемых імі нападах на савецкія і прыватныя ўстановы або асобных грамадзян, спыненне паяздоў і разбурэнне чыгуначных пуцей і іншых сродкаў зносін і сувязі, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй трох год з канфіскацыяй часткі або ўсёй маёмасці, з павышэннем у асабліва абцяжваючых акалічнасцях аж да вышэйшай меры социяльнай аховы — расстрэлу[1]) з канфіскацыяй маёмасці.

---

[1]) Гл. зноску 3 да заўвагі артыкула 27, стар. 7.

D 53462

80[1]. Тайнае або адкрытае выкраданне вогнестрэльнай зброі, частак да яе і агнявых прыпасаў: 1) са складаў і сховішчаў Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, ваенізаванай аховы і ваенізаванай пажарнай аховы прадпрыемстваў і збудаванняў, якія маюць асаблівае дзяржаўнае значэнне, Рабоча-Сялянскай Міліцыі, Экспедыцыі падводных работ (ЭПРОН), папраўча-працоўных устаноў, а таксама тылавога апалчэння і працоўных часцей з асоб, вызваленых ад ваеннай службы па рэлігійных перакананнях, альбо 2) з месц пастаяннага або часовага размяшчэння часцей Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі, ваенізаванай аховы і ваенізаванай пажарнай аховы, Рабоча-Сялянскай Міліцыі, Экспедыцыі падводных работ (ЭПРОН), тылавога апалчэння і працоўных часцей і з папраўча-працоўных устаноў у тых выпадках, калі вогнестрэльная зброя, часткі да яе і агнявыя прыпасы знаходзіліся пад аховай або асобым наглядам, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй аднаго года.

б) Такія-ж дзеянні, у выпадку прымянення злачынцамі насілля, небяспечнага для жыцця і здароўя асоб, якія нясуць ахову або нагляд, —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй трох год з павышэннем пры асабліва абцяжваючых акалічнасцях аж да вышэйшай меры социяльнай аховы — расстрэлу[1]) з канфіскацыяй маёмасці [30 красавіка 1934 г. (ЗЗ № 17, п. 89)][2]).

80[2]. Разбурэнне або пашкоджанне чыгуначных і іншых шляхоў зносін, збудаванняў на іх, засцерагальных знакаў рухомага саставу і суднаў з мэтай выклікаць крушэнне поезда або судна выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй трох год з канфіскацыяй усёй або часткі маёмасці, з павышэннем пры асабліва абцяжваючых акалічнасцях аж да вышэйшай меры социяльнай аховы — расстрэлу[1]) з канфіскацыяй маёмасці [18 мая 1929 г. (ЗЗ № 18, п. 109)].

* 80[3]. Парушэнне работнікамі транспарту працоўнай дысцыпліны (парушэнне правіл руху, нядобраякасны рамонт рухомага саставу і пуці і да т. п.), калі гэтае парушэнне пацягнула або магло пацягнуць пашкоджанне або знішчэнне рухомага саставу, пуці і пуцявых збудаванняў альбо няшчасныя выпадкі з людзьмі, нясвоечасовую адпраўку паяздоў і суднаў, скапленне на месцах выгрузкі паражняка, прастой вагонаў і суднаў і іншыя дзеянні, якія цягнуць за сабой зрыў (невыкананне) намечаных урадам планаў перавозак або пагрозу правільнасці і бяспекі руху, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін да дзесяці год.

У тых выпадках, калі гэтыя злачынныя дзеянні носяць яўна злосны характар, прымяняецца вышэйшая мера социяльнай аховы — расстрэл[1]) з канфіскацыяй маёмасці [5 лютага 1931 г. (ЗЗ № 6, п. 45)].

80[4]. Парушэнне работнікамі грамадзянскай авіяцыі і грамадзянскага паветраплавання службовых абавязкаў (парушэнне начальнікам аэрапорта правіл аб выпуску паветраных суднаў у палёт,

---

[1]) Гл. зноску 3 да заўвагі артыкула 27, стар. 7.

[2]) Арт. 80[1] не прымяняецца. Гл. Пастанову Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 22 жніўня 1947 г. «Аб парадку прымянення Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 4 чэрвеня 1947 г.», стар. 65.

вылет з аэрадрома без распараджэння начальніка аэрапорта, парушэнне правіл аб палётах і да т. п.), калі гэтае парушэнне пацягнула або магло пацягнуць пашкоджанне або знішчэнне паветранага судна або зямнога абсталявання для палётаў, альбо няшчасны выпадак з людзьмі, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін да дзесяці год, а пры асабліва абцяжваючых акалічнасцях — вышэйшую меру пакарання [1]) [13 лістапада 1935 г. (ЗЗ № 36, п. 191)].

80[5]. Парушэнне правіл аб міжнародных палётах (улёт у Саюз ССР і вылет з Саюза ССР без дазволу, незахаванне ўказаных у дазволе маршрутаў, месц пасадкі, паветраных варот, вышыні палётаў і г. д.), пры адсутнасці прызнакаў здрады радзіме або іншых контррэвалюцыйных злачынстваў выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй аднаго года або штраф у размеры да 10 тысяч рублёў з канфіскацыяй або без канфіскацыі паветранага судна [13 лістапада 1935 г. (ЗЗ № 36, п. 191)].

81. а) Ухіленне ад чарговага прызыву на сапраўдную ваенную службу выклікае —

папраўча-працоўныя работы на тэрмін да аднаго года.

б) Ухіленне ад чарговага прызыву на сапраўдную ваенную службу пры абцяжваючых акалічнасцях, у прыватнасці пры дапамозе нанясення сабе цялеснага пашкоджання, сімуляцыі хваробы, падлогу дакументаў, подкупу службовай асобы і да т. п. або пад выглядам рэлігійных перакананняў [2]), выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін да пяці год [30 кастрычніка 1930 г. (ЗЗ № 39, п. 260)].

82. Ухіленне асоб, залічаных у тылавое апалчэнне, і асоб, вызваленых ад ваеннай службы па рэлігійных перакананнях [2]) ад прызыву ў ваенны час у часці тылавога апалчэння і працоўныя часці, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй аднаго года [30 красавіка 1934 г. (ЗЗ № 17, п. 89)].

82[1]. Ухіленне асоб, вызваленых ад абавязковай ваеннай службы па рэлігійных перакананнях [2]), і асоб, залічаных у тылавое апалчэнне, ад выканання ў мірны час агульнакарысных работ шляхам няяўкі на прызыўныя пункты, злоснага парушэння правіл работы і сімуляцыі хваробы выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін да пяці год [25 сакавіка 1931 г. (ЗЗ № 14, п. 123)].

83. Адмаўленне або ўхіленне ва ўмовах ваеннага часу ад унясення падаткаў або ад выканання павіннасцей (у прыватнасці, ваенна-аўтатранспартнай, ваенна-конскай, ваенна-павозачнай і ваеннасуднавай) выклікаюць —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй шасці месяцаў, з павышэннем пры асабліва абцяжваючых акалічнасцях аж да вышэйшай меры сацыяльнай аховы — расстрэлу [1]) з канфіскацыяй маёмасці.

---

[1]) Гл. зноску 3 да заўвагі артыкула 27, стар. 7.

[2]) Законам аб усеагульным воінскім абавязку ад 1 верасня 1939 г. вызваленне ад ваеннай службы па рэлігійных перакананнях і тылавое апалчэнне не прадугледжаны. У сувязі з гэтым арт. арт. 82 і 82[1] фактычна страцілі сілу.

84. а) Прапаганда або агітацыя, накіраваныя да ўзбуджэння нацыянальнай або рэлігійнай варожасці або розні, а таксама распаўсюджванне або выраб і захоўванне літаратуры таго-ж характару выклікаюць —

пазбаўленне волі на тэрмін да двух год.

б) Тыя-ж дзеянні ў ваеннай абстаноўцы або пры масавых хваляваннях выклікаюць —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй як на два гады з канфіскацыяй усёй або часткі маёмасці, з павышэннем пры асабліва абцяжваючых акалічнасцях аж да вышэйшай меры соцыяльнай аховы — расстрэлу [1]) з канфіскацыяй маёмасці.

85. а) Падробліванне або збыт у выглядзе промысла падробленай металічнай манеты, дзяржаўных казначэйскіх білетаў, білетаў Дзяржаўнага банка, дзяржаўных каштоўных папер і падробленай замежнай манеты выклікаюць —

вышэйшую меру соцыяльнай аховы — расстрэл [1]) з канфіскацыяй маёмасці, з дапушчэннем пры змякчаючых акалічнасцях паніжэння да пазбаўлення волі на тэрмін не ніжэй двух год з канфіскацыяй усёй або часткі маёмасці.

б) Падробліванне ў выглядзе промысла чэкаў, дакументаў на грашовыя ўклады і ўклады ў каштоўных паперах, а таксама пасведчанняў па грашовых акрэдытывах выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй двух год з канфіскацыяй усёй або часткі маёмасці.

в) Падробліванне або збыт у выглядзе промысла падробленых знакаў паштовай аплаты, білетаў чыгуначнага і воднага транспарту і іншых праязных або на правоз грузаў дакументаў выклікаюць —

пазбаўленне волі на тэрмін да трох год [11 студзеня 1930 г. (ЗЗ № 4, п. 21); 17 чэрвеня 1935 г. (ЗЗ № 25, п. 134)].

85¹. а) Пераплаўка дзяржаўнай разменнай металічнай манеты (сярэбранай, нікелевай, меднай, бронзавай) у злiткі, а таксама выкарыстанне гэтай манеты для вырабу розных рэчаў караецца —

пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год з канфіскацыяй адпаведных зліткаў і рэчаў з разменнай манеты;

б) тыя-ж дзеянні, зробленыя ў выглядзе промысла, караюцца —

пазбаўленнем волі на тэрмін не ніжэй трох год з канфіскацыяй усёй маёмасці асуджанага [2 чэрвеня 1935 г. (ЗЗ № 22, п. 124)].

85². а) За незаконны выпуск усякага роду пазык, аблігацый і іншых відаў каштоўных папер, а таксама бон і ўсіх іншых відаў грашовых сурагатаў кіраўнікі ўстаноў, прадпрыемстваў і арганізацый караюцца —

пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці год.

б) За выраб указаных у п. «а» гэтага артыкула каштоўных папер і грашовых сурагатаў кіраўнікі друкарняў, гравёрных майстэрань, літаграфій, шклаграфій і да т. п. караюцца—

пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год.

в) За прыём ва ўплату ўказаных у п. «а» гэтага артыкула каштоўных папер або грашовых сурагатаў замест грошай загадчыкі магазінаў, крам, ларкоў і іншых рознічных гандлёвых прадпрыемстваў, а таксама касіры гэтых прадпрыемстваў караюцца—

пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год [17 чэрвеня 1935 г. (ЗЗ № 25, п. 134)].

---

[1]) Гл. зноску 3 да заўвагі артыкула 27, стар. 7.

**86.** Неданясенне аб дакладна вядомых рыхтуемых або зробленых злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 79, 80 і 85 гэтага Кодэкса, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін да аднаго года.

* **87.** Кваліфікаваная кантрабанда цягне звыш зробленых таможным упраўленнем канфіскацый тавараў і накладання штрафаў —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй аднаго года з канфіскацыяй усёй або часткі маёмасці, а пры асабліва абцяжваючых акалічнасцях — павышэнне аж да вышэйшай меры соцыяльнай аховы — расстрэлу [1]) з канфіскацыяй маёмасці.

Заўвага. Адменена. [18 мая 1929 г. (ЗЗ №18, п. 109)].

**88.** Садзейнічанне незаконнаму пераходу дзяржаўных граніц, зробленае ў выглядзе промысла або службовымі асобамі, выклікае—

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй аднаго года.

**89.** Парушэнне палажэнняў аб манаполіі знешняга гандлю выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін да дзесяці год з канфіскацыяй усёй або часткі маёмасці.

* **90.** Парушэнне правіл аб валютных аперацыях выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін да трох год з канфіскацыяй усёй або часткі маёмасці.

**91.** Усякага роду арганізацыйная дзейнасць, накіраваная на падрыхтоўку або ўчыненне прадугледжаных у артыкулах 78—90 гэтага Кодэкса злачынстваў, а таксама ўдзел у арганізацыі, утворанай для падрыхтоўкі або ўчынення аднаго з гэтых злачынстваў, выклікаюць —

меры соцыяльнай аховы, указаныя ў артыкуле, які прадугледжвае гэтае злачынства.

## Б. Іншыя злачынствы супроць парадку дзяржаўнага кіравання

**92.** а) Скрыццё або няправільнае паказанне колькасці падлягаючых абкладанню або ўліку прадметаў, у прыватнасці вядзенне гандлю або промысла ад імя асобы ці арганізацыі, якія карыстаюцца ільготамі, утварэнне фіктыўных кааператываў або кампаній, заведама ілжывыя паказанні ў справаздачах або дэкларацыях, вядзенне ў прамысловых і гандлёвых прадпрыемствах двайных кніг выклікае—

штраф да дзесяцікратнага размеру падатку са скрытай маёмасці або пазбаўленне волі да двух год.

б) Тыя-ж дзеянні, зробленыя па ўзаемнаму ўзгадненню, —

пазбаўленне волі да трох год і штраф да дзесяцікратнага размеру падатку са скрытай маёмасці.

* **93.** а) Неплацеж асобнымі грамадзянамі ва ўстаноўлены тэрмін падаткаў [2]) або збораў па абавязковаму акладному страхаван-

---

[1]) Гл. зноску 3 да заўвагі артыкула 27, стар. 7.

[2]) Гл. пункт «в» артыкула 24 Закону «Аб сельскагаспадарчым падатку», прынятага пятай сесіяй Вярхоўнага Совета СССР ад 8 жніўня 1953 г. («Ведамасці Вярхоўнага Совета СССР» 1953 г. № 7) і пункт «в» артыкула 37 Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 30 красавіка 1943 г. («Ведамасці Вярхоўнага Совета СССР» 1943 г. № 17), стар. 105.

ню, нягледзячы на наяўную магчымасць выплаціць іх, і прымяненне ў адміністрацыйным парадку прымусовых мер спагнання, калі гэтае дзеянне робіцца не ў першы раз, —

штраф да дзесяцікратнага размеру нявыплачанага падатку ці збору або папраўча-працоўныя работы да аднаго года ці пазбаўленне волі да трох год.

б) Злосны неплацеж падаткаў, у тым ліку і скрыццё маёмасці шляхам пераводу яе на чужое імя або выдача фіктыўных абавязацельстваў, хоць-бы і ў першы раз, —

штраф да дзесяцікратнага размеру нявыплачанага падатку або пазбаўленне волі не менш як на адзін год без высялення або з высяленнем да пяці год.

Тыя-ж дзеянні, зробленыя кулакамі, апрача ўказаных мер сацыяльнай аховы, выклікаюць —

канфіскацыю маёмасці.

Заўвага. Неплацяжом не ў першы раз прызнаецца пратэрміноўка плацяжу хоць-бы ў першы раз у бягучым акладным перыядзе, калі даны неплацельшчык у папярэднім акладным перыядзе пратэрмінаваў выплату, а таксама пратэрміноўка двух тэрмінаў плацяжу ў бягучым акладным перыядзе [17 лістапада 1929 г. (ЗЗ № 41, п. 242); 25 сакавіка 1931 г. (ЗЗ № 12, п. 96)].

94. Адмаўленне асобных грамадзян ад выканання павіннасцей і работ, якія маюць агульнадзяржаўнае значэнне, выклікае —

штраф, які накладаецца адпаведным органам улады ў межах да пяцікратнага размеру кошту павіннасці або работы.

Тыя-ж дзеянні, калі яны зроблены ў другі раз, або злоснае адмаўленне ад выканання ўказаных павіннасцей і работы, хоць-бы ў першы раз, —

папраўча-працоўныя работы да аднаго года або пазбаўленне волі да трох год.

Тыя-ж дзеянні, калі яны зроблены кулакамі, хоць-бы і ў першы раз, —

пазбаўленне волі на тэрмін не менш чым на тры гады з канфіскацыяй маёмасці [9 кастрычніка 1933 г. (ЗЗ № 44, п. 208)].

94¹. Злоснае невыкананне пастаноў і правіл, якія забяспечваюць паспяховую калектывізацыю сельскай гаспадаркі, у тым ліку злосны забой і распродаж жывёлы (рагатай і асабліва коней) з мэтай перашкоджання правядзенню мерапрыемстваў па абагульненню жывёлы выклікае —

пазбаўленне волі да трох год з высяленнем з данай мясцовасці або без высялення.

Тыя-ж дзеянні, зробленыя кулакамі, апрача ўказаных мер сацыяльнай аховы, выклікаюць —

канфіскацыю маёмасці [27 студзеня 1930 г. (ЗЗ № 9, п. 59); 25 сакавіка 1931 г. (ЗЗ № 12, п. 96)].

94². Забой коней без дазволу ветэрынарнага нагляду кулакамі і прыватнымі скупшчыкамі або падбухторванне імі да незаконнага забою коней іншых асоб, а таксама наўмыснае скалечанне коней і іншыя злосныя дзеянні, якія пацягнулі за сабой падзеж каня або прывялі каня ў непрыгодны стан, выклікаюць —

пазбаўленне волі да двух год з высяленнем або без высялення з данай мясцовасці [9 лютага 1932 г. (ЗЗ № 9, п. 38)].

95. Адмаўленне або ўхіленне ад унясення падаткаў або ад выканання павіннасцей, арганізаваныя па ўзаемнаму ўзгадненню, выклікаюць —

1) У адносінах падбухторшчыкаў, кіраўнікоў і арганізатараў — пазбаўленне волі не менш аднаго года з высяленнем з дадзенай мясцовасці або без высялення, з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.

2) У адносінах іншых удзельнікаў —

штраф да дзесяцікратнага размеру належачых з іх падаткаў або павіннасцей або пазбаўленне волі да трох год, а калі ўдзельнікі — кулакі, то, апрача таго, і канфіскацыю маёмасці [27 студзеня 1930 г. (ЗЗ № 9, п. 59); 25 сакавіка 1931 г. (ЗЗ № 12, п. 96)].

96. Скрыццё ў цэлым або часткі спадчыннай маёмасці або маёмасці, якая пераходзіць па актах дарэння, а таксама штучнае памяншэнне кошту маёмасці, у мэтах абходу закону аб падатку са спадчын і маёмасцей, што пераходзяць па актах дарэння, выклікаюць —

штраф да дзесяцікратнага размеру падатку са скрытай маёмасці або са скрытага кошту маёмасці [1]).

* 97. Парушэнне правіл, устаноўленых для ўліку ваеннаабавязаных радавога і сержанцкага саставу, зробленае ў першы раз ваеннаабавязаным радавога і сержанцкага саставу, — штраф да пяцідзесяці рублёў, які накладаецца ў адміністрацыйным парадку начальнікамі аддзяленняў міліцыі або старшынямі выканкомаў сельскіх (пасялковых) Саветаў.

Парушэнне правіл, устаноўленых для ўліку ваеннаабавязаных афіцэрскага саставу, зробленае ў першы раз ваеннаабавязанымі афіцэрскага саставу, — штраф да ста рублёў, які накладаецца ў адміністрацыйным парадку раённымі (гарадскімі) ваеннымі камісарамі.

Незахаванне кіраўніком дома, камендантам дома або домаўладальнікам устаноўленых арт. арт. 63 і 64 Закону «Аб усеагульным воінскім абавязку» правіл уліку ваеннаабавязаных,— штраф да ста рублёў, які накладаецца ў адміністрацыйным парадку начальнікамі аддзяленняў міліцыі.

Паўторнае парушэнне правіл воінскага ўліку, зробленае:

а) асобамі радавога або сержанцкага саставу, — прымусовыя работы на тэрмін да аднаго месяца або штраф да двухсот рублёў;

б) асобамі афіцэрскага саставу, — прымусовыя работы на тэрмін да двух месяцаў або штраф да чатырохсот рублёў (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 26 студзеня 1945 г.).

98. а) Ухіленне ад допрызыўнай падрыхтоўкі і паверачных збораў выклікае —

штраф да двухсот рублёў або папраўча-працоўныя работы да двух месяцаў.

б) Ухіленне сярэдняга, старшага і вышэйшага начальніцкага саставу запасу Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі ад вучэбных і

---

[1]) Артыкул 96 страціў сілу, таму што ўказаны ў ім падатак адменен Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 9 студзеня 1943 г.

рухомых збораў, манеўраў і іншых вучэбных заняткаў, а таксама ад удзелу ў якасці інструктараў для пазавайсковай падрыхтоўкі ваеннаслужачых і для навучання дапрызыўнікаў —

штраф да трохсот рублёў або папраўча-працоўныя работы да трох месяцаў.

**99.** Ухіленне ад паверачных або вопытных мабілізацый выклікае —

пазбаўленне волі да трох месяцаў або штраф да пяцісот рублёў.

**100.** а) Парушэнне правіл аб ваенным уліку рабочых жывёл (коней, валоў), павозак, вупражы, аўтамабіляў, матацыклаў, веласіпедаў і іншых транспартных сродкаў, якія падлягаюць ваеннаму ўліку, таксама аб ваенным уліку прыналежнасцей і запасных частак да іх і непрадстаўленне іх без уважлівых прычын на пераўчот, перапіс і пры вопытных або паверачных мабілізацыях выклікаюць —

штраф да двухсот рублёў або папраўча-працоўныя работы да аднаго месяца [5 кастрычніка 1931 г. (ЗЗ № 41, п. 261)].

б) Ухіленне ад пастаўкі коней, павозак і вупражы на ўкамплектаванне тэрытарыяльных частак Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі ў час навучання, а таксама ў час вучэбных і кароткатэрміновых збораў —

папраўча-працоўныя работы да шасці месяцаў або канфіскацыя падлягаючых пастаўцы жывёл і прадметаў.

**101.** Адменен [15 верасня 1932 г. (ЗЗ № 63, п. 305)].

**102.** Ухіленне ад устаноўленага законам персанальнага ўліку інжынераў, тэхнікаў, аграномаў і іншых спецыялістаў народнай гаспадаркі выклікае —

штраф да трохсот рублёў або папраўча-працоўныя работы да трох месяцаў або пазбаўленне волі на той-жа тэрмін.

**102[1].** Адмаўленне або ўхіленне інжынерна-тэхнічных работнікаў ад пераходу на іншую работу па сваёй спецыяльнасці па патрабаваннях органаў працы[1]) выклікае —

штраф да пяцісот рублёў або папраўча-працоўныя работы да аднаго года [6 сакавіка 1931 г. (ЗЗ № 9, п. 76)].

**103.** Адменен [6 снежня 1937 г. (ЗЗ 1938 г., № 6, п. 49)].

**104.** Выдумка і распаўсюджванне ілжывых чутак або неправераных звестак, якія могуць выклікаць грамадскую паніку або недавер'е да ўлады ці дыскрэдытаваць яе, выклікаюць —

папраўча-працоўныя работы да аднаго года або пазбаўленне волі на той-жа тэрмін.

**105.** а) Падробліванне пасведчанняў і іншых выдаваемых дзяржаўнымі і грамадскімі ўстановамі дакументаў, прадастаўляючых правы або вызваляючых ад павіннасцей, а таксама збыт такіх дакументаў выклікаюць —

пазбаўленне волі да двух год.

б) Калі абвінавачваемы судзіцца за такія дзеянні ў другі раз або рабіў іх сістэматычна —

пазбаўленне волі да пяці год.

в) Выкарыстанне ўказаных вышэй заведама падложных дакументаў, не злучанае з іншымі злачыннымі дзеяннямі, —

папраўча-працоўныя работы да шасці месяцаў або пазбаўленне волі на той-жа тэрмін.

---

[1]) Артыкул фактычна страціў сілу.

**106.** а) Супраціўленне асобных грамадзян прадстаўнікам улады пры выкананні імі ўскладзеных на іх законам абавязкаў выклікае —

пазбаўленне волі да шасці месяцаў або папраўча-працоўныя работы на той-жа тэрмін.

б) Тое-ж дзеянне, злучанае з насіллем над прадстаўніком улады або з прымушэннем яго да выканання незаконных патрабаванняў, —

пазбаўленне волі не менш як на адзін год.

в) Тое-ж дзеянне, злучанае з забойствам прадстаўніка ўлады або з нанясеннем яму цяжкіх цялесных пашкоджанняў, —

пазбаўленне волі не менш як на восем год.

**106[1].** Пагроза забойствам, насіллем або знішчэннем маёмасці, зробленая ў сувязі са службовай або грамадскай дзейнасцю асобы, якой пагражаюць, караецца —

пазбаўленнем волі да трох год або папраўча-працоўнымі работамі да аднаго года [2 чэрвеня 1935 г. (ЗЗ № 22, п. 124)].

**106[2].** Нанясенне пабояў або ўчыненне іншых насільных дзеянняў у адносінах грамадскіх актывістаў, ударнікаў на вытворчасці, а таксама калгаснікаў у сувязі з іх грамадскай або вытворчай дзейнасцю, калі гэтыя дзеянні па характару, абстаноўцы іх учынення або выніках не могуць разглядацца, як тэрарыстычны акт, выклікаюць —

пазбаўленне волі да пяці год з высяленнем або без высялення з данай мясцовасці [15 чэрвеня 1932 г. (ЗЗ № 45, п. 202)].

**107.** а) Хуліганскія дзеянні на прадпрыемствах, ва ўстановах і ў грамадскіх месцах караюцца —

турэмным зняволеннем тэрмінам на адзін год, калі гэтыя дзеянні па свайму характару не цягнуць за сабой больш цяжкага пакарання (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 22 жніўня 1940 г.).

б) Тыя-ж дзеянні, калі яны заключаліся ў буйстве або бясчынстве, або зроблены не ўпершыню, або ўпарта не спыняліся, нягледзячы на папярэджанне органаў міліцыі ці іншага органа, на які ўскладзены абавязкі аховы грамадскага парадку, або адрозніваліся асаблівым бясчынствам ці грубіянствам, або зроблены групай асоб, або ў адносінах малалетніх, —

пазбаўленне волі да пяці год[1]) [10 красавіка 1935 г. (ЗЗ № 17, п. 91)].

**108.** Невыкананне законнага распараджэння або патрабавання міліцыянера, які знаходзіцца на пасту, ваеннай варты або іншых органаў улады, ахоўваючых грамадскі парадак і бяспеку, выклікае —

штраф да ста рублёў або папраўча-працоўныя работы да аднаго месяца.

**108[1].** Парушэнне ўстаноўленых абавязковымі пастановамі Народнага камісарыята шляхоў зносін, Народнага камісарыята воднага транспарту, Усесаюзнага цэнтральнага ўпраўлення шасэйных і грунтавых дарог і аўтамабільнага транспарту і іх органаў правіл аб ахове парадку і бяспекі руху, ахове маёмасці транспарту, папярэджанні і спыненні незаконнага выкарыстання транспарту, а таксама правядзенні санітарных і процілажарных мерапрыем-

---

[1]) Гл. Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 30 снежня 1956 г. «Аб адказнасці за дробнае хуліганства», стар. 79.

ству, калі парушэнне пацягнула за сабой цяжкія вынікі, выклікае —

пазбаўленне волі да трох год або штраф да трох тысяч рублёў [27 мая 1937 г. (ЗЗ № 41, п. 180)].

108². Парушэнне пазапартовых вод, устаноўленых законам або распараджэннем належных органаў правіл аб папярэджанні сутыкнення суднаў на моры, аб мерах аховы падводных тэлеграфных кабеляў і іншых правіл, якія рэгулююць марское суднаходства, калі парушэнне не з'яўляецца для выканаўцы службовым злачынствам, выклікае —

штраф да трохсот рублёў, а ў тых выпадках, калі парушэнне пацягнула за сабой цяжкія вынікі,— пазбаўленне волі да трох год або штраф да трох тысяч рублёў [18 мая 1939 г. (ЗЗ № 18, п. 109)].

108³. Парушэнне ўстаноўленых правіл аб правядзенні фатаграфічных, кінематаграфічных і іншых здымак выклікае —

штраф да тысячы рублёў або папраўча-працоўныя работы да аднаго года [27 кастрычніка 1929 г. (ЗЗ № 38, п. 218)].

108⁴. Парушэнне ўстаноўленых Паветраным кодэксам Саюза ССР і выдаваемых Галоўным упраўленнем грамадзянскага паветранага флоту правіл аб ахове парадку і бяспекі паветраных перамяшчэнняў і аб ахове маёмасці грамадзянскага паветранага флоту, а таксама санітарных і процілажарных правіл грамадзянскага паветранага флоту, калі парушэнне пацягнула або магло пацягнуць за сабой цяжкія вынікі і не з'яўляецца для парушальніка службовым злачынствам, выклікае —

пазбаўленне волі да трох год або штраф да трох тысяч рублёў [13 лістапада 1935 г. (ЗЗ № 36, п. 191)].

108⁵. Выключан (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 12 красавіка 1955 г.).

* 108⁶. Самавольнае без патрэбы спыненне поезда стоп-кранам, калі гэтае дзеянне па свайму характару не цягне за сабой па закону больш цяжкага пакарання, караецца турэмным зняволеннем тэрмінам ад аднаго да трох год (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 11 студзеня 1945 г.).

109. Публічная знявага прадстаўнікоў улады ў сувязі з выкананнем імі службовых абавязкаў выклікае —

папраўча-працоўныя работы да аднаго года або пазбаўленне волі на той-жа тэрмін.

110. а) Самавольнае прысваенне ўлады або звання службовай асобы з учыненнем на гэтай падставе тых ці іншых дзеянняў выклікае —

пазбаўленне волі да аднаго года або папраўча-працоўныя работы на той-жа тэрмін.

б) Тое-ж дзеянне, злучанае з дыскрэдытаваннем савецкай улады або з учыненнем якіх-небудзь грамадска-небяспечных дзеянняў,—

пазбаўленне волі да трох год.

111. Займанне ўрачаваннем, як прафесіяй, асобай, якая не мае належна пасведчанай медыцынскай асветы, а таксама займанне медыцынскім работнікам такога роду медыцынскай практыкай, на якую ён не мае права, выклікае —

штраф да пяцісот рублёў або папраўча-працоўныя работы да шасці месяцаў.

112. Парушэнне ў час эпідэміі устаноўленых правіл аб ахове народнага здароўя або ў мясцовасцях, аб'яўленых паграважальнымі па эпідэміі, або калі парушэнне мела цяжкія вынікі, выклікае —

пазбаўленне волі да трох месяцаў або штраф да трохсот рублёў.

113. Нашэнне ордэна Саюза ССР — ордэна Леніна, Чырвонага Сцяга, Працоўнага Чырвонага Сцяга і Чырвонай Зоркі — асобамі, якія не маюць на гэта права, выклікае —

штраф да трохсот рублёў або папраўча-працоўныя работы да трох месяцаў з канфіскацыяй гэтых ордэнаў [5 верасня 1930 г. (ЗЗ № 33, п. 212)].

114. Нашэнне знакаў Чырвонага Крыжа або Чырвонага Поўмесяца асобамі, якія не маюць на гэта права, выклікае —

штраф да трохсот рублёў або папраўча-працоўныя работы да трох месяцаў з канфіскацыяй гэтых знакаў.

115. Выкарыстанне асобамі, якія не маюць на гэта права, устаноўленых міжнароднай канвенцыяй 1906 года ў Жэневе эмблемы і распазнавальных знакаў санітарнай службы арміі («Чырвоны Крыж» і «Чырвоны Поўмесяц»), а таксама назвы «Чырвонага Крыжа» і «Чырвонага Поўмесяца» ў камерцыйных мэтах пры дапамозе фабрычных і гандлёвых знакаў або, наогул, для атрымання ад гэтага тых ці іншых асабістых выгад выклікае —

пазбаўленне волі да аднаго года або штраф да пяці тысяч рублёў з забаронай займання гандлем на тэрмін да пяці год.

116. а) Выкраданне, пашкоджанне, скрыццё або знішчэнне афіцыяльных ці прыватных дакументаў, якія знаходзяцца ў дзяржаўных, грамадскіх і кааператыўных установах, у мэтах перашкоджання правільнаму вырашэнню спраў або, наогул, дзейнасці ўстаноў выклікае —

пазбаўленне волі да аднаго года.

б) Тыя-ж дзеянні, зробленыя ў адносінах асабліва сакрэтных або асаблівай важнасці дзяржаўных дакументаў,—

пазбаўленне волі да трох год.

117. а) Садзейнічанне пабегу арыштаванага з-пад варты або з месца зняволення шляхам падману, узлому, падкопу або іншымі сродкамі выклікае—

пазбаўленне волі да двух год.

б) Вызваленне арыштаванага, злучанае з насіллем над вартай,—

пазбаўленне волі да пяці год.

в) Вызваленне арыштаванага, злучанае з узброеным нападам на варту або з насіллем над вартай, небяспечным для жыцця,—

пазбаўленне волі да дзесяці год.

118. а) Пабег з месца абавязковага пасялення або са шляху следавання да яго, а таксама паяўленне ў мясцовасці, дзе пражыванне данай асобе забаронена, выклікае —

пазбаўленне волі да аднаго года.

б) Пабег арыштаванага з-пад варты або з месца зняволення выклікае —

пазбаўленне волі да двух год [15 жніўня 1931 г. (ЗЗ № 44, п. 255)].

119. Скрыццё перад органамі, якія вядуць рэгістрацыю актаў грамадзянскага стану, акалічнасцей, што перашкаджаюць уступ-

ленню ў шлюб, а таксама паведамленне гэтым органам заведама ілжывых звестак, выклікае —

штраф да адной тысячы рублёў або папраўча-працоўныя работы да шасці месяцаў або пазбаўленне волі на той-жа тэрмін.

**120.** Выезд за граніцу або ўезд у СССР без устаноўленага пашпарта або дазволу належных органаў улады выклікае —

зняволенне ў лагер ад аднаго года да трох год [13 снежня 1936 г. (ЗЗ № 34, п. 187)].

**120[1].** а) Паўторнае парушэнне ўстаноўленых правіл прапіскі пашпартаў або часовых пасведчанняў асобамі, якія прыязджаюць у мясцовасці, дзе ўведзена пашпартная сістэма, і маюць устаноўленыя дакументы, выклікае —

папраўча-працоўныя работы да аднаго года.

б) Пражыванне ў мясцовасцях, дзе ўведзена пашпартная сістэма, асоб, якія не маюць пашпарта або часовага пасведчання і ўжо падвяргаліся адміністрацыйнаму спагнанню за ўказанае парушэнне,—

пазбаўленне волі да двух год [15 жніўня 1934 г. (ЗЗ № 34, п. 166)].

**121.** Парушэнне законаў і правіл аб дзяржаўных манаполіях, за выключэннем прадугледжаных артыкулам 89 гэтага Кодэкса, выклікае —

штраф да пяці тысяч рублёў або пазбаўленне волі да трох год.

**121[1].** С т р а ц і ў с і л у (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 22 кастрычніка 1947 г.).

**121[2].** Парушэнне правіл, устаноўленых для выпуску і размнажэння твораў друку, а таксама правіл фотакіноцэнзуры выклікае—

пазбаўленне волі да трох год або папраўча-працоўныя работы да аднаго года [14 красавіка 1935 г. (ЗЗ № 17, п. 92)].

**121[3].** Выраб, распаўсюджванне і рэкламаванне парнаграфічных твораў, друкаваных выданняў, малюнкаў і іншых прадметаў, а таксама гандаль імі або захоўванне з мэтай продажу ці распаўсюджвання іх выклікае —

пазбаўленне волі да пяці год з абавязковай канфіскацыяй парнаграфічных прадметаў і сродкаў іх вытворчасці [5 снежня 1935 г. (ЗЗ № 38, п. 199)].

* **122.** Купля, продаж, запродаж, завяшчанне, дарэнне, залог або самавольная мена зямлі або іншая недазволеная законам пераўступка права карыстання зямлёй выклікаюць—

пазбаўленне волі да аднаго года або штраф да пяцісот рублёў.

**123.** а) Самавольная парубка ў лясах агульнадзяржаўнага або мясцовага значэння, а таксама парушэнне пастаноў, выданых у мэтах аховы лясоў ад раскрадання і знішчэння, калі страта ад гэтых дзеянняў перавышае сто рублёў па цэнах, устаноўленых для водпуску лесу, выклікае —

штраф да трохкратнага кошту незаконна здабытага ці знішчанага, або папраўча-працоўныя работы да аднаго года, або пазбаўленне волі да трох год з канфіскацыяй ва ўсіх выпадках незаконна здабытага лесу.

б) Калі-ж абвінавачваемы судзіцца за такія-ж дзеянні ў другі раз або зрабіў іх не ўпершыню, незалежна ад кошту незаконна здабытага або знішчанага,—

пазбаўленне волі да пяці год з канфіскацыяй незаконна здабытага лесу [5 красавіка 1934 г. (ЗЗ № 14, п. 68)].

**124.** а) Купля або збыт заведама самавольна высечанага лесу (арт. 123) выклікае —

пазбаўленне волі да шасці месяцаў або папраўча-працоўныя работы на той-жа тэрмін з канфіскацыяй ва ўсіх выпадках гэтага лесу.

б) Тыя-ж дзеянні, зробленыя ў выглядзе промысла, —

пазбаўленне волі да трох год з канфіскацыяй лесу і з выдаленнем з данай мясцовасці на тэрмін да трох год або без выдалення.

**125.** Паляванне на асабліва каштоўных звяроў, як: бабра, зубра, лася і іншых, калі яно забаронена, або паляванне і рыбная лоўля ў заказніках і запаведніках, а таксама сістэматычнае паляванне і рыбная лоўля без належнага на гэта дазволу, альбо ў забаронены час, альбо недазволенымі прыладамі і спосабамі выклікаюць —

штраф да пяцісот рублёў або папраўча-працоўныя работы да аднаго года або пазбаўленне волі на той-жа тэрмін з канфіскацыяй ва ўсіх выпадках незаконна здабытага.

**126.** Купля, збыт, захоўванне або правоз пушніны, заведама здабытай шляхам незаконнага палявання (арт. 125), выклікае —

штраф да пяцісот рублёў або пазбаўленне волі да аднаго года з канфіскацыяй ва ўсіх выпадках незаконна здабытага.

**127.** Распрацоўка нетраў зямлі з парушэннем правіл аб ахове нетраў і аб тэхнічным наглядзе выклікае —

штраф да пяцісот рублёў або папраўча-працоўныя работы да аднаго года або пазбаўленне волі на той-жа тэрмін з канфіскацыяй ва ўсіх выпадках незаконна здабытага.

**128.** Увоз або вываз шкурак марскіх коцікаў або марскіх баброў у кавалках або ў цэлым выглядзе, вырабленых або нявырабленых, без асобых пломбаў або клеймаў або без дазваляючых на іх вываз дакументаў ад належных органаў улады Саюза ССР або замежных, якія пацвярджаюць, што шкуркі здабыты законным шляхам, выклікаюць —

штраф да дзесяці тысяч рублёў або пазбаўленне волі да аднаго года з канфіскацыяй ва ўсіх выпадках гэтых шкурак.

**129.** а) Сарванне або пашкоджанне пячаці або іншых знакаў, якія накладваюцца па распараджэнню органаў улады з мэтай ахоўвання пэўных прадметаў, сховішчаў або іншых памяшканняў, выклікае —

штраф да трохсот рублёў або папраўча-працоўныя работы да трох месяцаў.

б) Знішчэнне, псаванне, знос або перамяшчэнне пастаўленых пры землеўпарадкаванні і лесаўпарадкаванні межавых часовых або пастаянных знакаў, а таксама пастаноўка новых, у месцах, дзе іх не павінна быць,—

штраф да пяцідзесяці рублёў або папраўча-працоўныя работы да аднаго месяца.

в) Наўмыснае пашкоджанне, знішчэнне і выкраданне пастаянных геадэзічных знакаў (сігналы, цэнтры трыангуляцый, астрапунктаў і базісаў, нівелірныя маркі і рэперы), якія ўзводзяцца або закладваюцца пры правядзенні геадэзічных работ (асноўных, тапаграфічных, нівелірных), а таксама перабудова і перамяшчэнне

іх без узгаднення з органамі, у веданні якіх яны знаходзяцца, выклікае —

штраф да пяцісот рублёў або папраўча-працоўныя работы да аднаго года [15 верасня 1932 г. (ЗЗ № 60, п. 285)].

**130.** Скрыццё калекцый або помнікаў старадаўнасці і мастацтва або архіўных матэрыялаў, якія падлягаюць рэгістрацыі, уліку ці перадачы ў дзяржаўныя сховішчы, выклікае —

штраф да трохсот рублёў з канфіскацыяй скрытай маёмасці.

* **131.** Самавольнае ажыццяўленне кім-небудзь свайго сапраўднага або мяркуемага права з парушэннем такога-ж права другой асобы (самаўпраўства) выклікае —

штраф да трохсот рублёў або папраўча-працоўныя работы да трох месяцаў.

* **132.** Удзел у выбарах дэпутатаў у Советы асоб, пазбаўленых выбарчых правоў у адпаведнасці з арт. 110 Канстытуцыі БССР, выклікае —

папраўча-працоўныя работы да шасці месяцаў або штраф да пяцісот рублёў [21 кастрычніка 1937 г. (Пастанова Прэзідыума ЦВК БССР)].

**132[1].** а) Перашкоджанне асобам наёмнай працы з боку наймальніка ў сельскіх мясцовасцях ажыццяўляць іх выбарчыя правы выклікае —

штраф да пяцісот рублёў або папраўча-працоўныя работы да шасці месяцаў.

б) Тое-ж дзеянне, калі яно накіравана супроць групы рабочых з трох і больш асоб або хоць і зроблена ў адносінах да меншага ліку рабочых, але не ўпершыню,—

штраф да тысячы рублёў або папраўча-працоўныя работы да аднаго года.

Тыя-ж дзеянні, зробленыя кулакамі, апрача ўказаных мер сацыяльнай аховы, выклікаюць —

канфіскацыю маёмасці [9 сакавіка 1929 г. (ЗЗ № 10, п. 52); 25 сакавіка 1931 г. (ЗЗ № 12, п. 96)].

**133.** Адначасовы ўдзел у якасці члена ў двух або больш таварыствах узаемнага крэдыту[1]) выклікае —

штраф да адной тысячы рублёў.

**134.** Няяўка сведкі, эксперта, перакладчыка або панятога па выкліку судовага або следчага органа або органа дазнання ці адмаўленне ад выканання ўскладзеных на іх абавязкаў, а таксама перашкоджанне яўцы сведкі, эксперта, перакладчыка або панятога з боку асобы, ад якой нез'явіўшыйся залежыць матэрыяльна, выклікае—

штраф да ста рублёў або папраўча-працоўныя работы да аднаго месяца.

**135.** Заведама ілжывы данос органу судовай або следчай улады, або службовай асобе, якая мае права ўзбуджаць праследаванне аб зробленым пэўнай асобай злачынстве, выклікае —

папраўча-працоўныя работы да аднаго года або пазбаўленне волі на той-жа тэрмін.

**136.** Заведама ілжывае паказанне сведкі, эксперта або перакладчыка на дазнанні, следстве або на судзе выклікае —

пазбаўленне волі да аднаго года.

---

[1]) Гэтыя таварыствы цяпер не існуюць, у сувязі з чым артыкул страціў значэнне.

137. Заведама ілжывы данос або паказанне, злучаныя з абвінавачваннем у цяжкім злачынстве, або з карыслівымі матывамі, або са штучнымі доказамі абвінавачвання, выклікае —

пазбаўленне волі да трох год.

138. Агалашэнне даных папярэдняга следства, дазнання або рэвізійнага абследавання без дазволу пракурора, следчага або адказнага за вядзенне дазнання або рэвізіі службовай асобы выклікае —

папраўча-працоўныя работы да шасці месяцаў або пазбаўленне волі на той-жа тэрмін або штраф да пяцісот рублёў.

139. а) Парушэнне наймальнікам законадаўства аб працы і соцыяльным страхаванні, а таксама выданых у развіццё гэтага законадаўства пастаноў і інструкцый, калі яно не падлягае праследаванню ў адміністрацыйным парадку, выклікае—

штраф да трохсот рублёў або папраўча-працоўныя работы да шасці месяцаў.

б) Тое-ж дзеянне, калі яно накіравана супроць групы рабочых з трох асоб і больш, аднародна па свайму складу ў адносінах усіх рабочых данай групы і зроблена ў адносінах усіх іх адначасова,—

пазбаўленне волі да аднаго года або штраф да дзесяці тысяч рублёў.

в) Такое парушэнне правіл аб ахове працы, пры якім работнік страціў або мог страціць сваю працаздольнасць,—

пазбаўленне волі да двух год або штраф да адной тысячы рублёў.

139[1]. Адмаўленне ў прыёме жанчын на работу і зніжэнне ім заработнай платы па матывах цяжарнасці, а таксама адмаўленне ў прыёме на работу мацярэй, якія кормяць груддзю, і зніжэнне ім заработнай платы па гэтых матывах, выклікае —

папраўча-працоўныя работы да шасці месяцаў або штраф да тысячы рублёў.

Пры паўторнасці ўказаных парушэнняў пакаранне можа быць павышана да двух год пазбаўлення волі (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 4 чэрвеня 1949 г.).

140. а) Парушэнне наймальнікам заключаных ім з прафесіянальным саюзам калектыўных дагавораў, тарыфных пагадненняў і пагадненняў, дасягнутых у прымірэнчых камерах і прымірэнчых камісіях, выклікае —

штраф да трохсот рублёў або папраўча-працоўныя работы да шасці месяцаў.

б) Тое-ж парушэнне, калі яно накіравана супроць групы рабочых з трох асоб і больш, аднародна па свайму складу ў адносінах усіх рабочых данай групы і зроблена ў адносінах усіх іх адначасова,—

пазбаўленне волі да аднаго года або штраф да дзесяці тысяч рублёў [27 снежня 1929 г. (ЗЗ 1930 г. № 2, п. 8)].

141. Перашкоджанне законнай дзейнасці фабрычна-заводскіх і мясцовых камітэтаў, прафесіянальных саюзаў і іх упаўнаважаных выклікае —

пазбаўленне волі да аднаго года або штраф да адной тысячы рублёў.

**141[1].** Парушэнне кіраўнікамі органаў працы і кіраўнікамі прадпрыемстваў, установ і гаспадарак законаў аб найме і планавым размеркаванні рабочай сілы [1]) выклікае —

штраф да трохсот рублёў або папраўча-працоўныя работы да шасці месяцаў [6 сакавіка 1931 г. (ЗЗ № 9, п. 76)].

**141[2].** а) Парушэнне тэхнічнага рэжыму, вытворча-тэхнічнай дысцыпліны або ўмоў працы, якія забяспечваюць бяспеку вытворчасці, а таксама курэнне, паяўленне ў п'яным выглядзе або сон на вытворчасці ў выбухованебяспечных цэхах караюцца —

пазбаўленнем волі да трох год.

б) Тыя-ж дзеянні, якія пацягнулі за сабой выбух або пажар, караюцца —

пазбаўленнем волі не ніжэй трох год [29 верасня 1935 г. (ЗЗ № 32, п. 170)].

**141[3].** а) Парушэнне тэхнічнага рэжыму або ўмоў працы ў выбухованебяспечных цэхах асобамі, якія адказваюць за ўстаноўленую вытворча-тэхнічную дысцыпліну, караецца —

пазбаўленнем волі да пяці год.

б) Тыя-ж дзеянні, якія пацягнулі за сабой выбух або пажар, караюцца —

пазбаўленнем волі не ніжэй пяці год [29 верасня 1935 г. (ЗЗ № 32, п. 170)].

**142.** Спагнанне кватэрнай платы вышэй устаноўленага органамі ўлады размеру з рабочых і служачых і з іншых прыроўненых да іх па закону асоб выклікае —

штраф да пяцісот рублёў.

* **143.** Выраб, захоўванне, купля з мэтай збыту або збыт прадуктаў, матэрыялаў і вырабаў, адносна якіх ёсць спецыяльная забарона або абмежаванне, калі гэтыя дзеянні маюць характар промысла, выклікаюць —

пазбаўленне волі да двух год з забаронай займання гандлем на тэрмін да пяці год або без такой забароны або штраф да двух тысяч рублёў з канфіскацыяй ва ўсіх выпадках такіх прадуктаў, матэрыялаў і вырабаў.

**144.** а) Выраб, захоўванне, набыццё і збыт моцнадзеючых ядавітых рэчываў без спецыяльнага на гэта дазволу, а таксама парушэнне ўстаноўленых правіл вытворчасці, захоўвання, водпуску, уліку і перавозкі моцнадзеючых ядавітых рэчываў караецца—

пазбаўленнем волі да пяці год з канфіскацыяй названых рэчываў.

б) Пасеў опійнага маку і індыйскіх канапель без адпаведнага на гэта дазволу зямельных органаў выклікае —

штраф да адной тысячы рублёў або пазбаўленне волі да аднаго года з канфіскацыяй ва ўсіх выпадках гэтых пасеваў [3 студзеня 1935 г. (ЗЗ № 1, п. 1); 9 мая 1936 г. (ЗЗ № 16, п. 79)].

144[1]. Тайнае або адкрытае выкраданне вогнестрэльнай зброі (апрача зброі паляўнічага ўзору і мелкакаліберной) і агнявых прыпасаў да яе, не прадугледжанае артыкулам 80[1] гэтага Кодэкса, выклікае —

---

[1]) Артыкул фактычна страціў значэнне.

пазбаўленне волі на тэрмін да пяці год [13 красавіка 1929 г. (ЗЗ № 14, п. 74)][1]).

**145.** а) Выраб, захоўванне, купля і збыт выбуховых рэчываў або снарадаў і вогнестрэльнай (апрача паляўнічай) зброі без належнага дазволу, а таксама выраб, захоўванне, збыт і нашэнне кінжалаў, фінскіх нажоў і да т. п. халоднай зброі без дазволу Народнага камісарыята ўнутраных спраў ва ўстаноўленым парадку выклікае —

пазбаўленне волі да пяці год з канфіскацыяй названых рэчываў, снарадаў і зброі [10 красавіка 1935 г. (ЗЗ № 17, п. 91)].

б) Перасылка па пошце і іншымі спосабамі вогнестрэльнай зброі (непаляўнічай), выбуховых і лёгкіх на загаранне рэчываў, як: порах, патроны і да т. п., выклікае —

пазбаўленне волі да пяці год з канфіскацыяй адпраўлення [7 красавіка 1933 г. (ЗЗ № 15, п. 96)].

в) Купля, захоўванне і продаж заведама выкрадзенай вогнестрэльнай зброі (апрача зброі паляўнічага ўзору і мелкакалібернай) і агнявых прыпасаў да яе выклікае —

пазбаўленне волі да пяці год [30 красавіка 1934 г. (ЗЗ № 17, п. 89)].

**146.** Парушэнне акцызных правіл[2]), калі яно не падлягае праследаванню, згодна з законам у адміністрацыйным парадку, выклікае —

штраф да адной тысячы рублёў і папраўча-працоўныя работы або пазбаўленне волі да аднаго года з канфіскацыяй прадметаў і прадуктаў, не аплачаных акцызам або аплачаных не ў належным размеры, а таксама сыравіны і прылад вытворчасці, якія служаць для вырабу падлягаючых акцызу прадметаў [11 студзеня 1930 г. (ЗЗ № 3, п. 15)].

**147.** Збыт, калі ён мае характар промысла, або хаванне для такога збыту без належнага дазволу хлебнага віна (гарэлкі), гарэлачных вырабаў, налівак і настоек выклікаюць —

пазбаўленне волі да двух год і штраф да адной тысячы рублёў з высяленнем з данай мясцовасці на тры гады або без высялення [17 студзеня 1930 г. (ЗЗ № 8, п. 54)].

**148.** Выраб з мэтай збыту він, гарэлак і наогул спіртных напіткаў і спіртаўтрымліваючых рэчываў (палітура, лак і да т. п.) без належнага дазволу або звыш устаноўленай законам моцнасці, а таксама збыт або незаконнае хаванне з мэтай збыту такіх напіткаў і рэчываў выклікае —

пазбаўленне волі да двух год і штраф да адной тысячы рублёў.

**149.** Выраб і захоўванне самагону для збыту і гандлю ім, калі яны маюць характар промысла, выклікаюць —

пазбаўленне волі да двух год і штраф да пяцісот рублёў з канфіскацыяй самагону і прылад для яго вырабу[3]).

---

[1] Арт. 144[1] не прымяняецца. Гл. пастанову Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 22 жніўня 1947 г. «Аб парадку прымянення Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 4 чэрвеня 1947 г.», стар. 65.

[2]) Артыкул фактычна страціў значэнне з адменай акцызнага збору.

[3]) Гл. Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 7 красавіка 1948 г. «Аб крымінальнай адказнасці за выраб і продаж самагону», стар. 61.

**150.** Выраб, захоўванне, рамонт і збыт апаратаў, якія спецыяльна служаць для вырабу самагону, калі гэтыя дзеянні маюць характар промысла, выклікаюць —

пазбаўленне волі да двух год і штраф да пяцісот рублёў [1]).

**151.** а) Выраб, захоўванне або купля з мэтай збыту або збыт без належнага дазволу какаіну, опію, морфію, эфіру і іншых адурманьваючых рэчываў выклікае —

пазбаўленне волі да аднаго года і штраф да пяцісот рублёў.

б) Тыя-ж дзеянні, калі яны маюць характар промысла, а таксама ўтрыманне прытонаў, у якіх праводзіцца збыт або спажыванне пералічаных у гэтым артыкуле рэчываў, —

пазбаўленне волі да трох год і штраф да трох тысяч рублёў.

* **152.** Парушэнне законаў, пастаноў і правіл, якія рэгулююць гандаль і прамысловасць, у тых выпадках, калі ў іх спецыяльна не ўказана праследаванне ў адміністрацыйным парадку, выклікае —

пазбаўленне волі да аднаго года або штраф да двух тысяч рублёў з забаронай займання гандлем або промыслам на тэрмін да пяці год або без такой забароны.

* **152[1].** а) За выпуск нядобраякаснай або некамплектнай прадукцыі і за выпуск прадукцыі з парушэннем абавязковых стандартаў — дырэктары, галоўныя інжынеры і начальнікі аддзелаў тэхнічнага кантролю прамысловых прадпрыемстваў караюцца як за працідзяржаўнае злачынства, роўназначнае шкодніцтву, турэмным зняволеннем тэрмінам ад пяці да васьмі год.

б) Масавы або сістэматычны выпуск з гандлёвых прадпрыемстваў нядобраякаснай прадукцыі выклікае —

пазбаўленне волі да пяці год або папраўча-працоўныя работы да аднаго года (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 26 студзеня 1945 г.).

**152[2].** Выключан (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 31 снежня 1955 г.).

**153.** Гандаль шкуркамі марскіх коцікаў і марскіх баброў у кавалках або ў цэлым выглядзе, вырабленымі або нявырабленымі, без асобых пломбаў або клеймаў ці сведчанняў ад належных органаў улады Саюза ССР або замежных, якія пацвярджаюць, што шкуркі здабыты законным шляхам, выклікае —

штраф да дзесяці тысяч рублёў або пазбаўленне волі да аднаго года з канфіскацыяй ва ўсіх выпадках такіх шкурак і з забаронай займацца гандлем на тэрмін да пяці год.

**154.** а) Захоўванне ў гандлёвым або прамысловым прадпрыемстве мер і вагаў няправільных або забароненых да ўжывання, або з падробленым, або неўстаноўленым кляймом, або без належнага кляйма выклікае —

пазбаўленне волі да шасці месяцаў або штраф да адной тысячы рублёў.

б) Ужыванне ў гандлі або прамысловасці, захоўванне для збыту і збыт указаных вышэй мер і вагаў, а таксама выраб або накладанне падробленых або неўстаноўленых клеймаў —

пазбаўленне волі да двух год або штраф да двух тысяч рублёў

---

[1]) Гл. Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 7 красавіка 1948 г. «Аб крымінальнай адказнасці за выраб і продаж самагону», стар. 61.

з забаронай займацца гандлем ці промыслам на тэрмін да пяці год або без такой забароны.

* 155. Скупка для перапродажу, а таксама перапродаж прыватнымі асобамі ў мэтах нажывы (спекуляцыі) прадуктаў сельскай гаспадаркі і прадметаў масавага ўжытку караецца —

пазбаўленнем волі не менш як на пяць год з поўнай або частковай канфіскацыяй маёмасці (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 25 лістапада 1940 г.).

156. Штучнае паніжэнне цэн на публічных таргах шляхам распаўсюджвання ілжывых звестак, якія ганьбуюць прадметы і ўмовы таргоў, або шляхам змовы спаборнікаў, або іншымі спосабамі выклікае —

пазбаўленне волі да двух год.

157. Невыкананне або парушэнне пры выкананні будаўнічых работ устаноўленых законам або распараджэннем органаў улады будаўнічых, санітарных або проціпажарных правіл, калі яно мела цяжкія вынікі, выклікае —

пазбаўленне волі да трох год або штраф да трох тысяч рублёў.

158. Парушэнне правіл аб устаноўцы механічных рухавікоў выклікае —

штраф да пяцісот рублёў або папраўча-працоўныя работы да шасці месяцаў.

159. Навучанне малалетніх або няпоўналетніх рэлігіі ў дзяржаўных або прыватных школах і, наогул, навучанне рэлігіі з парушэннем устаноўленых для гэтага правіл выклікае —

штраф да трохсот рублёў або папраўча-працоўныя работы да аднаго года.

160. Учыненне падманных дзеянняў з мэтай узбуджэння забабонаў у масах насельніцтва і атрымання такім спосабам якіх-небудзь выгад выклікае —

штраф да адной тысячы рублёў або папраўча-працоўныя работы да аднаго года.

161. Прымусовы збор у карысць царкоўных або рэлігійных груп выклікае —

папраўча-працоўныя работы да шасці месяцаў або штраф да трохсот рублёў.

162. Прысваенне царкоўнымі або рэлігійнымі групамі адміністрацыйных, судовых або іншых публічна-прававых функцый або правоў юрыдычных асоб выклікае ў адносінах зрабіўшых і дапусціўшых азначанае парушэнне асоб —

папраўча-працоўныя работы да шасці месяцаў або штраф да пяцісот рублёў.

163. Перашкоджанне выкананню рэлігійных абрадаў, паколькі гэтае выкананне не парушае грамадскага парадку, выклікае —

папраўча-працоўныя работы да шасці месяцаў.

## IV. ВОІНСКІЯ ЗЛАЧЫНСТВЫ

164. Воінскімі злачынствамі прызнаюцца накіраваныя супроць устаноўленага парадку нясення ваеннай службы злачынствы, зробленыя ваеннаслужачымі і ваеннаабавязанымі запасу Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі ў час знаходжання тых і другіх у радах Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

Заўвага 1. Паводле адпаведных артыкулаў гэтага палажэння нясуць адказнасць за злачынствы, накіраваныя супроць устаноўленага для іх парадку нясення службы, таксама асобы страявога і адміністрацыйна-гаспадарчага саставу Рабоча-Сялянскай Міліцыі[1]) і апаратыўнага саставу органаў Упраўлення дзяржаўнай бяспекі НКУС (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 13 снежня 1940 г.).

Заўвага 2. Саўдзел у воінскіх злачынствах асоб, не ўпамянутых у гэтым артыкуле, выклікае адказнасць паводле адпаведных артыкулаў гэтага раздзела Крымінальнага кодэкса [13 лістапада 1935 г. (ЗЗ № 36, п. 191)].

**165.** а) Невыкананне адданага ў парадку службы загаду караецца —

пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці год.

б) Тое-ж злачынства пры наяўнасці змякчаючых акалічнасцей выклікае —

прымяненне правіл дысцыплінарнага статута Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

в) Тое-ж злачынства, калі яно зроблена групай асоб або асобай начальніцкага саставу або калі яно мела ці магло мець асабліва цяжкія вынікі, караецца —

пазбаўленнем волі на тэрмін не ніжэй трох год.

г) Тое-ж злачынства, зробленае ў ваенны час, караецца —

пазбаўленнем волі на тэрмін не ніжэй пяці год, а пры наяўнасці абцяжваючых акалічнасцей — вышэйшай мерай крымінальнага пакарання — расстрэлам (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 8 красавіка 1957 г.).

д) Тое-ж злачынства, зробленае ў баявой абстаноўцы, караецца —

вышэйшай мерай крымінальнага пакарання — расстрэлам [22 кастрычніка 1934 г. (ЗЗ № 43, п. 205) і Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 8 красавіка 1957 г.].

**166.** а) Аказанне супраціўлення асобе, якая выконвае ўскладзеныя на яе абавязкі па ваеннай службе, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін да трох год.

б) Тое-ж дзеянне, зробленае групай асоб, або звязанае з насіллем, або прымяненнем зброі, або зробленае ў баявой абстаноўцы, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй трох год.

в) Дзеянне, прадугледжанае пунктам «б» гэтага артыкула, пры наяўнасці абцяжваючых акалічнасцей, выклікае —

вышэйшую меру сацыяльнай аховы.

**166[1].** а) Пагроза забойствам, прычыненнем цялесных пашкоджанняў або нанясеннем пабояў начальніку ў сувязі з яго службовай дзейнасцю выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін ад аднаго года да трох год.

б) Тое-ж дзеянне, зробленае ў ваенны час, выклікае —

---

[1]) Асобы страявога і адміністрацыйна-гаспадарчага саставу міліцыі не нясуць адказнасці па артыкулах Палажэння аб воінскіх злачынствах (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 11 верасня 1953 г.).

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй трох год (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 8 красавіка 1957 г.).

**167.** а) Прымушэнне асобы, якая знаходзіцца пры выкананні абавязкаў па ваеннай службе, да парушэння гэтых абавязкаў выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй аднаго года.

б) Тое-ж дзеянне, зробленае групай асоб, або звязанае з насіллем, або прымяненнем зброі, або зробленае ў баявой абстаноўцы, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй пяці год.

в) Дзеянне, прадугледжанае пунктам «б» гэтага артыкула, пры наяўнасці абцяжваючых акалічнасцей, выклікае —
вышэйшую меру соцыяльнай ахоны.

**168.** а) Знявага насільным дзеяннем падпарадкаваным начальніка або малодшым старшага пры выкананні, хоць-бы адным з іх, абавязкаў па ваеннай службе выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй шасці месяцаў.

б) Знявага, нанесеная пры тых-жа ўмовах на словах або немасільным дзеяннем, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін да шасці месяцаў.

в) Дзеянне, прадугледжанае пунктам «б» гэтага артыкула, пры наяўнасці змякчаючых акалічнасцей, выклікае —

прымяненне правіл дысцыплінарнага статута Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

г) Тыя-ж дзеянні, зробленыя пры тых-жа ўмовах начальнікам у адносінах падпарадкаванага або старшым у адносінах да малодшага, выклікаюць за сабой адказнасць на тых-жа падставах.

**169.** а) Знявага ў выпадку, калі зневажальнік і зняважаны належаць да ліку асоб, упамянутых у артыкуле 164, але не знаходзяцца паміж сабой у адносінах падпарадкаванасці або старшынства, і калі прытым хоць-бы адзін з іх знаходзіўся пры выкананні абавязкаў па ваеннай службе, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін да аднаго года.

б) Тое-ж дзеянне, пры наяўнасці змякчаючых акалічнасцей, выклікае —

прымяненне правіл дысцыплінарнага статута Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

**170.** а) Дэзерцірства, гэта значыць пакіданне воінскай часці або месца службы з мэтай ухіліцца ад ваеннай службы, а таксама няяўка з той-жа мэтай у часць або да месца службы пры назначэнні, пераводзе, з камандзіроўкі, з водпуску або з лячэбнай установы, зробленае асобай радавога або сержанцкага саставу тэрміновай службы, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін ад трох да пяці год.

б) Тое-ж дзеянне, зробленае ў ваенны час, выклікае —

вышэйшую меру пакарання — расстрэл, а пры наяўнасці змякчаючых акалічнасцей — пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй пяці год.

в) Дэзерцірства, зробленае асобай афіцэрскага саставу або ваеннаслужачым звыштэрміновай службы, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін ад пяці да сямі год.

г) Тое-ж дзеянне, зробленае ў ваенны час, выклікае —

вышэйшую меру пакарання — расстрэл, а пры наяўнасці змякчаючых акалічнасцей — пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй сямі год (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 8 красавіка 1957 г.).

171. а) Самавольнае пакіданне часці асобай радавога або сержанцкага саставу тэрміновай службы, а таксама няяўка яе ў тэрмін без уважлівых прычын у часць або да месца службы пры звальненні з часці, пры назначэнні, пераводзе, з камандзіроўкі, з водпуску або з лячэбнай установы працягласцю звыш трох сутак выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін ад аднаго года да пяці год.

б) Тое-ж дзеянне, зробленае ў ваенны час, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй пяці год.

в) Самавольнае пакіданне часці або месца службы асобай афіцэрскага саставу або ваеннаслужачым звыштэрміновай службы, а таксама няяўка яе ў часць або да месца службы без уважлівых прычын працягласцю звыш дзесяці сутак выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін ад аднаго года да пяці год.

г) Тое-ж дзеянне, зробленае ў ваенны час, калі самавольная адсутнасць працягвалася звыш адных сутак, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй пяці год (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 8 красавіка 1957 г.).

172. а) Самавольнае пакіданне часці або месца службы ў баявой абстаноўцы выклікае —

вышэйшую меру соцыяльнай аховы (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 8 красавіка 1957 г.).

б) Тое-ж дзеянне, пры наяўнасці змякчаючых акалічнасцей, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй трох год (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 8 красавіка 1957 г.).

173. а) Самавольная адлучка з часці або з месца службы ваеннаслужачага тэрміновай службы, а таксама няяўка яго ў тэрмін без уважлівых прычын на службу пры звальненні з часці, пры назначэнні, пераводзе, з камандзіроўкі, з водпуску або з лячэбнай установы працягласцю звыш адных сутак, але не больш трох сутак, або хоць і менш сутак, але зробленае паўторна на працягу трох месяцаў, выклікае —

накіраванне ў дысцыплінарны батальён на тэрмін ад трох месяцаў да двух год.

б) Тое-ж дзеянне, зробленае ў ваенны час, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй двух год.

в) Дзеянне, прадугледжанае пунктам «а» гэтага артыкула, зробленае ваеннаслужачым, які адбывае пакаранне ў дысцыплінарным батальёне, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін да трох год (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 8 красавіка 1957 г.).

173[1]. Ухіленне ад прызыву па мабілізацыі ў рады Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і ад далейшых прызываў для ўкамплектавання Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі ў саставе ваеннага часу выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй аднаго года, а для асоб начальніцкага саставу — не ніжэй двух год з павышэннем, пры асабліва абцяжваючых акалічнасцях, да вышэйшай меры со-

цыяльнай аховы — расстрэлу [30 кастрычніка 1930 г. (ЗЗ № 39, п. 260) і Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 8 красавіка 1957 г.].

174. Выключан (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 8 красавіка 1957 г.).

175. а) Ухіленне ваеннаслужачага ад нясення абавязкаў ваеннай службы шляхам прычынення сабе якога-небудзь пашкоджання або шляхам сімуляцыі хваробы, падлогу дакументаў або іншага падману караецца —

пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці год.

б) Тое-ж злачынства, пры наяўнасці абцяжваючых акалічнасцей, караецца —

пазбаўленнем волі на тэрмін не ніжэй трох год.

в) Тое-ж злачынства, зробленае ў ваенны час або ў баявой абстаноўцы, караецца —

вышэйшай мерай крымінальнага пакарання — расстрэлам [22 кастрычніка 1934 г. (ЗЗ № 43, п. 205) і Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 8 красавіка 1957 г.].

176. Ухіленне ад нясення абавязкаў ваеннай службы, у прыватнасці пад выглядам рэлігійных або іншых перакананняў, пры адсутнасці прызнакаў злачынстваў, прадугледжаных іншымі артыкуламі гэтага раздзела Крымінальнага кодэкса, выклікае —

меры соцыяльнай аховы, прадугледжаныя арт. 165.

177. а) Процізаконнае адчужэнне, залог або перадача ў карыстанне выданых для часовага або пастаяннага карыстання прадметаў казённага абмундзіравання і снаражэння (праматанне), наўмыснае знішчэнне або пашкоджанне гэтых прадметаў, а таксама парушэнне правіл іх захоўвання выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін да аднаго года.

б) Тыя-ж дзеянні, пры наяўнасці змякчаючых акалічнасцей, выклікаюць —

прымяненне правіл дысцыплінарнага статута Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

в) Тыя-ж дзеянні, зробленыя ў адносінах выданых для службовага карыстання халоднай або вогнестрэльнай зброі, патронаў і сродкаў перамяшчэння, выклікаюць —

пазбаўленне волі на тэрмін да трох год.

г) Дзеянні, прадугледжаныя п. «а» гэтага артыкула, зробленыя ў ваенны час або ў баявой абстаноўцы, выклікаюць —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй аднаго года.

д) Дзеянні, прадугледжаныя п. «в» гэтага артыкула, зробленыя ў ваенны час або ў баявой абстаноўцы, выклікаюць —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй трох год, а пры абцяжваючых акалічнасцях — вышэйшую меру соцыяльнай аховы.

Заўвага. Асобы, якія прынялі ўпамянутыя ў гэтым артыкуле прадметы, заведама для іх незаконна адчужаемыя, закладваемыя або перадаваемыя ў карыстанне ці на захоўванне, падлягаюць адказнасці як саўдзельнікі.

177[1]. Парушэнне правіл ваджэння або эксплуатацыі баявой або транспартнай машыны, якое выклікала няшчасныя выпадкі з людзьмі або іншыя цяжкія вынікі, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін ад трох да дзесяці год (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 8 красавіка 1957 г.).

177². Парушэнне правіл палётаў або падрыхтоўкі да іх, якое выклікала катастрофу або іншыя цяжкія вынікі, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін ад трох да дзесяці год (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 8 красавіка 1957 г.).

177³. Парушэнне правіл караблеваджэння, якое выклікала гібель або сур'ёзныя пашкоджанні карабля, чалавечыя ахвяры або іншыя цяжкія вынікі, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін ад трох да дзесяці год (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 8 красавіка 1957 г.).

178. а) Парушэнне статутных правіл вартавой або канвойнай службы і выданых у развіццё гэтых правіл распараджэнняў выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін да шасці месяцаў.

б) Тыя-ж дзеянні, пры наяўнасці змякчаючых акалічнасцей, выклікаюць —

прымяненне правіл дысцыплінарнага статута Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі [19 студзеня 1928 г. (ЗЗ № 30, п. 288)].

в) Парушэнне статутных правіл вартавой службы, зробленае на варце пры складах зброі, вогнестрэльных прыпасаў і выбуховых рэчываў, а таксама на іншых вартах, якія маюць асабліва важнае дзяржаўнае або ваеннае значэнне, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін да трох год [7 сакавіка 1935 г. (ЗЗ № 9, п. 46)].

г) Парушэнне статутных правіл вартавой або канвойнай службы, якое суправаджалася наступленнем шкодных вынікаў, у папярэджанне якіх устаноўлена гэтая варта або канвой, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй аднаго года.

д) Дзеянні, прадугледжаныя пунктамі «в» і «г» гэтага артыкула, зробленыя ў баявой абстаноўцы, выклікаюць —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй трох год, а пры наяўнасці абцяжваючых акалічнасцей — вышэйшую меру соцыяльнай аховы [19 студзеня 1928 г. (ЗЗ № 30, п. 288)].

178¹. а) Парушэнне правіл нясення пагранічнай службы асобай, якая ўваходзіць у састаў нарада па ахове дзяржаўнай граніцы СССР, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін ад аднаго года да трох год.

б) Тое-ж дзеянне, якое выклікала цяжкія вынікі, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй трох год.

в) Дзеянне, прадугледжанае пунктам «а» гэтага артыкула, пры наяўнасці змякчаючых акалічнасцей —

караецца ў дысцыплінарным парадку (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 8 красавіка 1957 г.).

178². а) Невыкананне правіл нясення службы на радыётэхнічных пастах, у дзяжурных падраздзяленнях і іншых аб'ектах, прызначаных для прадухілення парушэнняў паветранай або марской прасторы СССР, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін ад аднаго года да трох год.

б) Тое-ж дзеянне, якое выклікала цяжкія вынікі або зробленае ў ваенны час, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй трох год.

в) Дзеянне, прадугледжанае пунктам «а» гэтага артыкула, пры наяўнасці змякчаючых акалічнасцей —

караецца ў дысцыплінарным парадку (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 8 красавіка 1957 г.).

**179.** а) Парушэнне асобай, якая ўваходзіць у сутачны нарад часці (апрача варты), статутных правіл унутранай (вартавой) службы выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін да шасці месяцаў.

б) Тое-ж дзеянне, пры наяўнасці змякчаючых акалічнасцей, выклікае —

прымяненне правіл дысцыплінарнага статута Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

в) Тое-ж дзеянне, калі яно суправаджалася шкоднымі вынікамі, папярэджанне якіх уваходзіла ў абавязак данай асобы, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін да двух год.

г) Тое-ж дзеянне, зробленае ў ваенны час або ў баявой абстаноўцы, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй аднаго года.

д) Дзеянне, прадугледжанае пунктам «г» гэтага артыкула, пры наяўнасці змякчаючых акалічнасцей, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін да трох год.

* **180.** а) Злоўжыванне ўладай, перавышэнне ўлады, бяздзеянне ўлады, а таксама нядбайныя адносіны да службы асобы начальніцкага саставу Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, калі дзеянні гэтыя рабіліся сістэматычна, або з карыслівых меркаванняў, або іншай асабістай зацікаўленасці, а таксама калі яны мелі сваім вынікам дэзарганізацыю давераных яму сіл, або даручанай яму справы, або разгалашэнне ваенных тайн, або іншыя цяжкія вынікі, або хоць-бы і не мелі азначаных вынікаў, але заведама маглі іх мець, або былі зроблены ў ваенны час ці ў баявой абстаноўцы, выклікаюць —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй шасці месяцаў.

б) Тыя-ж дзеянні, пры наяўнасці асабліва абцяжваючых акалічнасцей, выклікаюць —

вышэйшую меру соцыяльнай аховы.

в) Тыя-ж дзеянні, пры адсутнасці прызнакаў, прадугледжаных пунктамі «а» і «б» гэтага артыкула, выклікаюць —

прымяненне правіл дысцыплінарнага статута Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

**181.** а) Дзеянні і распараджэнні начальніка, якія перашкаджаюць выкарыстанню падпарадкаванымі яму ваеннаслужачымі (або іх сем'ямі) ільгот і пераваг, устаноўленых для ваеннаслужачых Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і іх сем'яў, выклікаюць —

пазбаўленне волі на тэрмін да аднаго года.

б) Тыя-ж дзеянні, пры наяўнасці змякчаючых акалічнасцей, выклікаюць —

прымянне правіл дысцыплінарнага статута Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

в) Тыя-ж дзеянні, якія робяцца сістэматычна або з карыслівых меркаванняў ці іншай асабістай зацікаўленасці, выклікаюць —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй аднаго года.

**182.** Процізаконнае выкарыстанне начальнікам свайго падпа-

радкаванага для асабістых паслуг самому начальніку, яго сям'і або іншым асобам выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін да шасці месяцаў.

**183.** Здача непрыяцелю начальнікам давераных яму ваенных сіл, пакіданне непрыяцелю, знішчэнне або прывядзенне ў непрыгоднасць начальнікам давераных яму ўмацаванняў, ваенных караблёў, ваенналятальных апаратаў, артылерыі, ваенных складаў і іншых сродкаў вядзення вайны, а таксама непрыняцце начальнікам належных мер да знішчэння або прывядзення ў непрыгоднасць пералічаных сродкаў вядзення вайны, калі ім пагражае непасрэдная небяспека захопу непрыяцелем і ўжо выкарыстаны ўсе спосабы захаваць іх, калі ўказаныя ў гэтым артыкуле дзеянні зроблены не ў мэтах садзейнічання непрыяцелю, але насуперак ваенным правілам, выклікаюць —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй трох год, а пры наяўнасці абцяжваючых акалічнасцей — вышэйшую меру пакарання — расстрэл (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 8 красавіка 1957 г.).

**184.** Самавольнае адступленне начальніка ад дадзеных яму для бою распараджэнняў, зробленае не ў мэтах садзейнічання непрыяцелю, але насуперак ваенным правілам, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй трох год, а пры наяўнасці асабліва абцяжваючых акалічнасцей — вышэйшую меру пакарання — расстрэл (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 8 красавіка 1957 г.).

**185.** Самавольнае пакіданне поля бітвы ў час бою або адмаўленне ў час бою дзейнічаць зброяй выклікаюць —

вышэйшую меру пакарання — расстрэл (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 8 красавіка 1957 г.).

**185¹.** Добраахвотная здача ў палон з прычыны баязлівасці або маладушнасці выклікае —

вышэйшую меру пакарання — расстрэл, а пры наяўнасці змякчаючых акалічнасцей — пазбаўленне волі на тэрмін ад сямі да дзесяці год (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 8 красавіка 1957 г.).

**185².** а) Добраахвотны ўдзел ваеннаслужачага, які знаходзіцца ў палоне, у работах, маючых ваеннае значэнне, або ў іншых мерапрыемствах, якія заведама могуць нанесці шкоду Совецкаму Саюзу або саюзным з ім дзяржавам, пры адсутнасці прызнакаў здрады радзіме, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін ад трох да дзесяці год.

б) Насілле над іншымі ваеннапалоннымі або жорсткае абыходжанне з імі з боку ваеннапалоннага, які з'яўляецца старшым, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін ад трох да дзесяці год.

в) Учыненне ваеннаслужачым, які знаходзіцца ў палоне, дзеянняў, накіраваных у шкоду правам і законным інтарэсам іншых ваеннапалонных любой нацыянальнасці, з карыслівых матываў або з мэтай забеспячэння паблажлівых да сябе адносін з боку праціўніка, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін ад аднаго года да трох год (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 8 красавіка 1957 г.).

186. Пакіданне гінучага ваеннага карабля камандзірам, які не выканаў да канца сваіх службовых абавязкаў, а таксама асобамі каманды карабля без належнага на тое распараджэння камандзіра выклікае —

вышэйшую меру соцыяльнай аховы.

187. Выключан (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 8 красавіка 1957 г.).

188. а) Разгалашэнне звестак аб узброеных сілах і аб абароназдольнасці Саюза ССР, якія з'яўляюцца спецыяльна ахоўваемай тайнай [Пастанова Совета Народных Камісараў Саюза ССР ад 27 красавіка 1926 г., арт. арт. 1—6 (ЗЗ СССР 1926 г. № 32, арт. 213)], выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй аднаго года[1]).

б) Тое-ж дзеянне, калі яно пацягнула або заведама магло пацягнуць асабліва цяжкія вынікі, выклікае —

вышэйшую меру соцыяльнай аховы (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 8 красавіка 1957 г.)

в) Разгалашэнне ваенных звестак, якія не падлягаюць агалашэнню, але не з'яўляюцца спецыяльна ахоўваемай тайнай, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін да аднаго года.

г) Дзеянне, прадугледжанае п. «в» гэтага артыкула, пры наяўнасці змякчаючых акалічнасцей, выклікае —

прымяненне правіл дысцыплінарнага статута Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

189. Зносіны шляхам перапіскі або іншымі спосабамі ў час вайны з асобамі, якія належаць да саставу непрыяцельскай арміі або пражываюць на непрыяцельскай тэрыторыі або ў мясцовасцях, занятых войскамі непрыяцеля, выклікаюць —

пазбаўленне волі на тэрмін да трох год.

190. а) Выкраданне на полі бітвы рэчаў, якія знаходзяцца пры забітых і раненых (марадзёрства), выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй трох год.

б) Тое-ж дзеянне, пры наяўнасці абцяжваючых акалічнасцей, выклікае —

вышэйшую меру соцыяльнай аховы (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 8 красавіка 1957 г.).

191. Разбой, грабеж, процізаконнае знішчэнне маёмасці і насілле, а таксама процізаконнае адабранне маёмасці пад выглядам ваеннай неабходнасці, учыняемыя ў адносінах да насельніцтва ў раёне ваенных дзеянняў, выклікаюць —

пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй трох год, а пры наяўнасці абцяжваючых акалічнасцей — вышэйшую меру соцыяльнай аховы (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 8 красавіка 1957 г.).

192. а) Дрэннае абыходжанне з палоннымі, якое мела месца неаднаразова, або звязанае з асаблівай жорсткасцю, або накіраванае супраць хворых і раненых, а таксама нядбайнае выкананне абавязкаў у адносінах указаных хворых і раненых асобамі, на якіх ускладзены іх лячэнне і апекаванне іх, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін да трох год.

---

[1]) П. «а» арт. 188 страціў сілу (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 22 кастрычніка 1947 г.).

б) Дрэннае абыходжанне з палоннымі без указаных абцяжваючых акалічнасцей выклікае —

прымяненне правіл дысцыплінарнага статута Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

**193.** Нашэнне ў раёне ваенных дзеянняў знакаў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Поўмесяца асобамі, якія не маюць на тое права, а таксама аддача начальнікам распараджэнняў аб нашэнні іх упамянутымі асобамі выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін да аднаго года.

**194.** Злоўжыванне ў ваенны час флагамі або знакамі Чырвонага Крыжа і Чырвонага Поўмесяца або афарбоўкай, прысвоенай транспартным сродкам санітарнай эвакуацыі, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін да аднаго года.

## V. СЛУЖБОВЫЯ ЗЛАЧЫНСТВЫ

**195.** Усякае дзеянне або бяздзеянне службовай асобы, якое, не выклікаючыся меркаваннямі службовай неабходнасці, мела сваім вынікам парушэнне правільнай работы ўстановы або прадпрыемства, або нанесла яму маёмасную шкоду, або пацягнула за сабой парушэнне грамадскага парадку ці ахоўваемых законам правоў і інтарэсаў асобных грамадзян, або хоць і не было непасрэдна звязана са службовымі функцыямі данай службовай асобы, але падарвала аўтарытэт органаў улады ў вачах працоўных, прызнаецца службовай правіннасцю.

Тыя-ж дзеянні службовай асобы, калі яны мелі сістэматычны характар або рабіліся ёй з карыслівых або іншых асабістых матываў, або мелі асабліва цяжкія вынікі, або заведама для службовай асобы пагражалі цяжкімі вынікамі, прызнаюцца службовым злачынствам.

Службовыя злачынствы праследуюцца ў судовым парадку на падставе арт. арт. 196—212 гэтага Кодэкса, а службовыя правіннасці праследуюцца ў судовым або дысцыплінарным парадку на падставе арт. 213 гэтага Кодэкса.

Заўвага. Пад службовымі асобамі разумеюцца асобы, якія займаюць пастаянныя або часовыя пасады ў дзяржаўнай, грамадскай або кааператыўнай установе ці прадпрыемстве.

**196.** Нядбайныя або нядобрасумленныя адносіны службовай асобы да сваіх службовых абавязкаў, валакіта і пратэкцыянізм, а таксама невыкананне службовай асобай дзеянняў, якія яна па абавязку сваёй службы павінна была выканаць, пры наяўнасці прызнакаў, прадугледжаных 2 ч. арт. 195, выклікаюць —

пазбаўленне волі да трох год або папраўча-працоўныя работы да аднаго года.

**196[1].** Злоўжыванне ўладай або службовым становішчам, г. зн. такія дзеянні службовай асобы, якія яна магла зрабіць толькі дзякуючы свайму службоваму становішчу і якія не выклікаліся меркаваннямі службовай неабходнасці, мелі сваім вынікам яўнае парушэнне правільнай работы ўстановы або прадпрыемства, або нанеслі яму маёмасную шкоду, або парушылі грамадскі парадак ці ахоўваемыя законам правы і інтарэсы асобных грамадзян, калі маюцца прызнакі, прадугледжаныя 2 ч. арт. 195, выклікае —

пазбаўленне волі не ніжэй аднаго года [11снежня 1933 г. (ЗЗ № 51, п. 332)].

**196$^{2}$.** а) Абважванне, абмерванне пакупнікоў, карыстанне пры продажы няправільнымі вагамі, гірамі і іншымі няправільнымі вымяральнымі прыборамі;

б) парушэнне ўстаноўленых рознічных цэн на тавары шырокага ўжытку ў магазінах, крамах, ларках, сталовых, буфетах і да т. п., продаж тавараў ніжэйшага гатунку па цэнах вышэйшага, скрыццё ад пакупнікоў прэйскурантных цэн тавараў караюцца —

як абкрадванне спажыўца і ашуканства совецкай дзяржавы пазбаўленнем волі на тэрмін да дзесяці год [23 жніўня 1934 г. (ЗЗ № 35, п. 173)].

**197.** а) Учыненне службовай асобай дзеянняў, якія выходзяць за межы прадастаўленых ёй па закону правоў або поўнамоцтваў (перавышэнне ўлады), пры наяўнасці прызнакаў, прадугледжаных 2 ч. арт. 195, выклікае —

пазбаўленне волі не менш як на шэсць месяцаў.

б) Тое-ж дзеянне, калі яно злучалася са зневажаючымі асобу пацярпеўшага дзеяннямі або з насіллем, не небяспечным для жыцця або здароўя,—

пазбаўленне волі не менш як на адзін год.

в) Тое-ж дзеянне, калі яно злучалася з насіллем, небяспечным для жыцця або здароўя пацярпеўшага,—

пазбаўленне волі не менш як на тры гады.

**198.** Незаконнае затрыманне, прывод або ўзяцце пад варту ў якасці меры стрымання, а таксама прымушэнне да дачы паказання пры допыце шляхам прымянення незаконных мер асобай, якая вядзе дазнанне або следства, пры наяўнасці прызнакаў, прадугледжаных 2 ч. арт. 195, выклікае —

пазбаўленне волі не менш як на адзін год.

**199.** Вынясенне суддзямі з карыслівых або іншых асабістых матываў неправасуднага рашэння, прыгавору або іншых пастаноў выклікае —

пазбаўленне волі не менш як на пяць год.

**200.** а) Парушэнне службовай асобай, як наймальнікам, заканадаўства аб працы і соцыяльным страхаванні, а таксама выданых у развіццё гэтага заканадаўства пастаноў і інструкцый, пры наяўнасці прызнакаў, прадугледжаных 2 ч. арт. 195, выклікае —

папраўча-працоўныя работы да аднаго года або пазбаўленне волі да шасці месяцаў.

б) Тое-ж парушэнне службовай асобы, калі яно накіравана супроць групы рабочых з трох асоб і больш, аднародна ў адносінах усіх рабочых данай групы і зроблена ў адносінах усіх іх адначасова, а таксама такое парушэнне службовай асобай правіл аб ахове працы, пры якім работнік страціў або мог страціць сваю працаздольнасць,—

пазбаўленне волі да двух год.

**201.** а) Парушэнне службовай асобай, як наймальнікам, калектыўных дагавораў, тарыфных пагадненняў і пагадненняў, дасягнутых у прымірэнчых камерах і прымірэнчых камісіях, калі прытым ёсць прызнакі, прадугледжаныя 2 ч. арт. 195, выклікае —

папраўча-працоўныя работы да аднаго года або пазбаўленне волі да шасці месяцаў.

б) Тое-ж парушэнне службовай асобы, калі яно накіравана

супроць групы рабочых з трох асоб і больш, аднародна ў адносінах усіх рабочых данай групы і зроблена ў адносінах усіх іх адначасова,—

пазбаўленне волі да двух год [27 снежня 1929 г. (ЗЗ 1930 г. № 2, п. 8)].

**202.** Парушэнне службовай асобай правіл аб гандлі і прамысловасці пры наяўнасці прызнакаў, прадугледжаных 2 ч. арт. 195, выклікае —

пазбаўленне волі да аднаго года.

**203.** а) Прымушэнне службовай асобай да палавой сувязі з ёй асобы, якая залежыць ад яе па службе, выклікае —

пазбаўленне волі да пяці год.

б) Тое-ж дзеянне, калі вынікам яго было самагубства або цяжкая хвароба пацярпеўшай асобы, —

пазбаўленне волі да дзесяці год.

**204.** а) Прысваенне або растрата службовай асобай грошай, каштоўнасцей або іншай маёмасці, якая знаходзіцца па яе службе ў яе веданні, выклікае —

пазбаўленне волі да пяці год.

б) Тое-ж дзеянне, калі яно зроблена адказнай службовай асобай, або мела для ўстановы ці прадпрыемства цяжкія вынікі, або калі прысвоенае ці растрачанае мелі асабліва буйныя размеры,—

пазбаўленне волі не менш як на тры гады з канфіскацыяй усёй або часткі маёмасці або без канфіскацыі[1]) [17 сакавіка 1935 г. (ЗЗ № 9, п. 46)].

**205.** а) Крадзеж з дзяржаўных, грамадскіх або кааператыўных устаноў, складаў, вагонаў, суднаў і іншых сховішчаў, зроблены службовай асобай, якая мела доступ да іх або якой даверана была іх ахова, выклікае —

пазбаўленне волі не менш як на шэсць месяцаў.

б) Тое-ж дзеянне, калі яно рабілася сістэматычна шляхам пакраж, падлогаў, складання няправільных актаў і да таго падобных злачынстваў, або зроблена адказнай службовай асобай, або ў асабліва буйных размерах выкрадзенага, —

пазбаўленне волі не менш як на тры гады[1]).

**205[1].** а) Псаванне або паломка трактараў і сельскагаспадарчых машын соўгасаў, машынна-трактарных станцый і калгасаў, калі псаванне або паломка выкліканы злачынна-нядбайнымі адносінамі да гэтай маёмасці, выклікаюць —

папраўча-працоўныя работы да шасці месяцаў.

б) Тыя-ж дзеянні, якія зроблены не ў першы раз або нанеслі буйную шкоду, выклікаюць —

пазбаўленне волі да трох год [25 сакавіка 1931 г. (ЗЗ № 11, п. 87)].

**205[2].** а) Забой коней без дазволу ветэрынарнага нагляду ў калгасах, соўгасах, машынна-конных станцыях, установах і прадпрыемствах, а таксама наўмыснае скалечанне коней і іншыя злос-

---

[1]) Артыкулы 204 і 205 не прымяняюцца. Гл. пастанову Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 22 жніўня 1947 г. «Аб парадку прымянення Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 4 чэрвеня 1947 г.», стар. 65.

ныя дзеянні, якія пацягнулі за сабой падзеж каня або прывялі каня ў непрыгодны стан, выклікаюць —

пазбаўленне волі да аднаго года.

б) Злачынна-нядбайнае абыходжанне з коньмі і асабліва жарэбнымі маткамі ў калгасах, соўгасах, машынна-конных станцыях, установах і прадпрыемствах, калі такое абыходжанне пацягнула за сабой падзеж каня або прывяло каня ў непрыгодны стан,—

папраўча-працоўныя работы да шасці месяцаў.

в) Тыя-ж дзеянні, калі яны мелі сістэматычны характар або пацягнулі за сабой страту значнай колькасці коней,—

пазбаўленне волі да трох год [9 лютага 1932 г. (ЗЗ № 9, п. 38)].

**206.** Заключэнне асобай, упаўнаважанай дзейнічаць ад імя дзяржаўнай, грамадскай або кааператыўнай установы, прадпрыемства, заведама нявыгадных дагавораў або здзелак, а таксама калі пры заключэнні іх асоба дзейнічала ў стачцы з контрагентамі гэтых установ або прадпрыемстваў ці намерана палічыла за лепшае іх выгаду выгадзе той установы або прадпрыемства, ад імя якога яна дзейнічала, выклікае —

пазбаўленне волі не менш як на тры гады.

* **207.** а) Атрыманне службовай асобай асабіста або праз пасрэднікаў хабару за выкананне або невыкананне ў інтарэсах даючага хабар дзеяння, якое службовая асоба магла або павінна была зрабіць выключна ў выніку свайго службовага становішча, выклікае —

пазбаўленне волі не менш як на шэсць месяцаў.

б) Атрыманне хабару, зробленае пры абцяжваючых акалічнасцях, як: 1) адказнай службовай асобай; 2) асобай, якая раней была асуджана за атрыманне хабару або неаднаразова атрымлівала хабар; 3) калі асоба, якая атрымала хабар, вымагала яго,—

пазбаўленне волі не менш як на пяць год з канфіскацыяй усёй або часткі маёмасці або без канфіскацыі.

* **208.** а) Дача хабару або пасрэдніцтва пры дачы хабару выклікае —

пазбаўленне волі не менш як на шэсць месяцаў.

б) Тое-ж дзеянне, калі асоба была раней асуджана за дачу хабару або давала хабар неаднаразова,—

пазбаўленне волі не менш як на пяць год з канфіскацыяй усёй або часткі маёмасці або без канфіскацыі.

З а ў в а г а. Асобы, якія далі хабар або былі пасрэднікамі пры дачы хабару, не прыцягваюцца да адказнасці: 1) калі даказана, што ад іх вымагалі хабар, або 2) калі яны раней узбуджэння праследавання добраахвотна заявяць аб дачы хабару.

**209.** Наўмыснае стварэнне службовай асобай абстаноўкі і ўмоў, якія выклікаюць прапанову або атрыманне хабару, у мэтах далейшага выкрыцця даўшага або прыняўшага хабар (правакацыя хабару), выклікае —

пазбаўленне волі не менш як на шэсць месяцаў.

**210.** Унясенне службовай асобай у афіцыяльныя дакументы або кнігі заведама ілжывых звестак, складанне і выдача ім заведама ілжывых дакументаў, падробка, падчыстка, а таксама ўказанне ў дакуменце няправільнай даты (службовы падлог), пры наяўнасці прызнакаў, прадугледжаных 2 ч. арт. 195, выклікаюць —



64

пазбаўленне волі да трох год.

**210-а.** Паведамленне службовай асобай Дзяржаўнаму банку або іншым крэдытным установам заведама няправільных звестак аб выкананні фінансавага плана, аб таварнай наяўнасці або іншых даных, прадстаўленне якіх абавязкова згодна з правіламі крэдытнай установы, выклікае —

пазбаўленне волі да трох год [5 верасня 1930 г. (ЗЗ № 34, п. 217)].

**211.** Паведамленне або перадача службовай асобай звестак, якія не падлягаюць агалашэнню, пры наяўнасці прызнакаў, прадугледжаных 2 ч. арт. 195, выклікае —

пазбаўленне волі да трох год.

**212.** Выкананне службовай асобай дзеянняў, хоць-бы і не звязаных з яе службовымі абавязкамі, але падрываючых у вачах працоўных аўтарытэт органаў улады, прадстаўніком якіх гэтая службовая асоба з'яўляецца (дыскрэдытаванне ўлады), пры наяўнасці прызнакаў, прадугледжаных 2 ч. арт. 195, выклікае —

пазбаўленне волі да трох год.

**213.** Дзеянні, прадугледжаныя арт. арт. 196, 196[1], 197, 198, 200, 201, 202, 210, 211 і 212, калі яны змяшчаюць у сабе толькі прызнакі, прадугледжаныя 1 ч. арт. 195, і не злучаны з абцяжваючымі акалічнасцямі, прадугледжанымі 2 ч. арт. 195 (службовыя правіннасці), выклікаюць —

папраўча-працоўныя работы да аднаго месяца або звальненне ад пасады з забаронай займання адказных пасад у дзяржаўных, грамадскіх і кааператыўных установах і прадпрыемствах на тэрмін да двух год, або без такой забароны, або забарона займання адказных пасад у дзяржаўных, грамадскіх і кааператыўных установах і прадпрыемствах на тэрмін да двух год, або грамадскае ганьбаванне [11 снежня 1933 г. (ЗЗ № 51, п. 332)].

Тыя-ж дзеянні выклікаюць адказнасць у дысцыплінарным парадку ў выпадках, калі асобы і органы, якія маюць па закону права накладання дысцыплінарных спагнанняў, судова-следчыя органы, пракурорскі нагляд або Рабоча-Сялянская Інспекцыя[1]) па акалічнасцях справы прызнаюць, што трэба ўзбудзіць праследаванне не ў судовым, а ў дысцыплінарным парадку.

## VI. ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРОЦЬ АСОБЫ

**214.** Наўмыснае забойства выклікае —

пазбаўленне волі да дзесяці год.

Забойства, зробленае ваеннаслужачымі, пры наяўнасці асабліва абцяжваючых акалічнасцей, выклікае —

вышэйшую меру крымінальнага пакарання — расстрэл[2]) [17 лістапада 1934 г. (ЗЗ № 47, п. 230)].

**215.** Наўмыснае забойства, зробленае ў стане раптоўнага моц-

---

[1]) Органы Міністэрства дзяржаўнага кантролю.

[2]) Гл. Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 30 красавіка 1954 г. «Аб узмацненні крымінальнай адказнасці за наўмыснае забойства», стар. 59.

нага нервовага хвалявання, выкліканага цяжкай знявагай з боку забітага, выклікае —

пазбаўленне волі да пяці год.

**216.** Перавышэнне межаў неабходнай абароны, якое пацягнула за сабой смерць нападаўшага, выклікае —

пазбаўленне волі да трох год.

**217.** а) Выкананне ўрачамі абортаў па-за бальніцамі або іншымі лячэбнымі ўстановамі выклікае —

турэмнае зняволенне ад аднаго года да двух год (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 26 сакавіка 1956 г.).

б) Выкананне абортаў у антысанітарнай абстаноўцы або асобамі, якія не маюць спецыяльнай медыцынскай адукацыі,—

турэмнае зняволенне не ніжэй трох год [29 кастрычніка 1936 г. (ЗЗ № 30, п. 160)].

**217[1].** Прымушэнне жанчын да аборту выклікае —

турэмнае зняволенне да двух год [29 кастрычніка 1936 г. (ЗЗ № 30, п. 160)].

**217[2].** Выключан (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 30 верасня 1954 г.).

**218.** Забойства па неасцярожнасці выклікае —

пазбаўленне волі да трох год.

**219.** а) Наўмыснае цяжкае цялеснае пашкоджанне, якое пацягнула за сабой поўнае парушэнне функцый якога-небудзь органа, непапраўнае знявечанне твару, псіхічную хваробу або іншае цяжкае расстройства здароўя, выклікае —

пазбаўленне волі да васьмі год.

б) Калі ад такога пашкоджання паследавала смерць, або калі яно прычынена спосабам, які мае характар пакут або катавання, або з'явілася вынікам сістэматычных, хоць-бы і лёгкіх, пашкоджанняў,—

пазбаўленне волі да дзесяці год.

**220.** Наўмыснае менш цяжкае цялеснае пашкоджанне, не небяспечнае для жыцця, але нанесшае працяглае парушэнне функцыі якога-небудзь органа або працяглае расстройства здароўя менш цяжкага характару, выклікае —

пазбаўленне волі да трох год.

**221.** Наўмыснае цяжкае або менш цяжкае цялеснае пашкоджанне, нанесенае ў стане раптоўнага моцнага нервовага хвалявання, выкліканага цяжкай знявагай з боку пацярпеўшага, выклікае —

пазбаўленне волі да аднаго года або папраўча-працоўныя работы на той-жа тэрмін.

**222.** Перавышэнне межаў неабходнай абароны, якое пацягнула за сабой цялеснае пашкоджанне нападаўшага, выклікае —

пазбаўленне волі да аднаго года або папраўча-працоўныя работы на той-жа тэрмін.

**223.** а) Наўмысныя пабоі або іншыя дзеянні, якія нанеслі фізічны боль, а таксама наўмыснае лёгкае цялеснае пашкоджанне выклікаюць —

штраф да трохсот рублёў, або папраўча-працоўныя работы да аднаго года, або пазбаўленне волі на той-жа тэрмін.

б) Тыя-ж дзеянні, калі яны насілі характар катаванняў,—

пазбаўленне волі да трох год.

**224.** Неасцярожнае цялеснае пашкоджанне выклікае —

пазбаўленне волі да шасці месяцаў або папраўча-працоўныя работы на той-жа тэрмін.

225. Заражэнне венерычнай хваробай асобай, якая ведала аб наяўнасці ў яе гэтай хваробы, выклікае —

пазбаўленне волі да трох год.

226. а) Незаконнае пазбаўленне волі выклікае —

пазбаўленне волі да аднаго года або папраўча-працоўныя работы на той-жа тэрмін.

б) Тыя-ж дзеянні, калі яны зроблены спосабам, небяспечным для жыцця і здароўя пацярпеўшага, або былі злучаны з прычыненнем яму фізічных пакут, —

пазбаўленне волі да трох год.

227. Змяшчэнне ў бальніцу для псіхічных хворых заведама здаровай асобы з карыслівых або іншых асабістых матываў выклікае —

пазбаўленне волі да трох год.

228. Выкраданне, скрыццё або падмен чужога дзіцяці з карыслівых або іншых асабістых матываў выклікае —

пазбаўленне волі да трох год.

229. Пакіданне без дапамогі асобы, якая знаходзіцца ў небяспечным для жыцця становішчы і пазбаўлена магчымасці самазахавання па малалецтву, старасці, хваробе і да т. п., калі пакінуўшы без дапамогі абавязан быў мець клопаты аб пакінутым і меў магчымасць аказаць дапамогу, выклікае —

пазбаўленне волі да аднаго года або папраўча-працоўныя работы на той-жа тэрмін.

229[1]. Выкарыстанне апекі ў карыслівых мэтах (заняцце жылой плошчы, выкарыстанне маёмасці, якое засталося пасля смерці бацькоў, і г. д.) і пакіданне апякуемых дзяцей без нагляду і неабходнай матэрыяльнай дапамогі караецца —

пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год [8 верасня 1935 г. (ЗЗ № 34, п. 180)].

230. Непаведамленне належным установам або асобам аб небяспечным для жыцця становішчы іншай асобы, неаказанне ёй дапамогі, якую можна было аказаць, калі вынікам гэтага была смерць або цяжкае цялеснае пашкоджанне, выклікае —

папраўча-працоўныя работы да шасці месяцаў.

230[1]. Неаказанне капітанам судна асобам, якія гінуць на моры або на іншым водным шляху, дапамогі, якую можна было аказаць без сур'ёзнай небяспекі для судна, экіпажа і пасажыраў, выклікае—

пазбаўленне волі да двух год [18 мая 1929 г. (ЗЗ № 18, п. 109)].

231. а) Неаказанне дапамогі хвораму без уважлівых прычын з боку асобы, якая абавязана яе аказваць у сілу закону або спецыяльных правіл, выклікае —

папраўча-працоўныя работы да аднаго года або штраф да трохсот рублёў.

б) Адмаўленне асобы, якая займаецца медыцынскай практыкай, ад аказання медычнай дапамогі, калі гэтае адмаўленне заведама магло мець небяспечныя для хворага вынікі,—

пазбаўленне волі да трох год.

232. а) Неплацеж прысуджаных судом сродкаў на ўтрыманне дзяцей выклікае —

турэмнае зняволенне да двух год з аднясеннем расходаў па

пошуках асобы, якая ўхіляецца ад плацяжу аліментаў, за яе кошт.

б) Пакіданне бацькамі дзяцей без неабходнай падтрымкі — меры крымінальнага пакарання, указаныя ў п. «а» гэтага артыкула [17 красавіка 1935 г. (ЗЗ № 17, п. 93); 29 кастрычніка 1936 г. (ЗЗ № 30, п. 160)].

232[1]. Падбухторванне або прыцягненне няпоўналетніх да ўдзелу ў розных злачынствах, а таксама прымушэнне няпоўналетніх да займання спекуляцыяй, прастытуцыяй, жабрацтвам і да т. п. караюцца —

турэмным зняволеннем не ніжэй пяці год [17 красавіка 1935 г. (ЗЗ № 17, п. 93)].

233. а) Палавыя зносіны з асобамі, якія не дасягнулі палавой спеласці, выклікаюць —

пазбаўленне волі да трох год.

б) Тыя-ж дзеянні, злучаныя з растленнем або задавальненнем палавой страсці ў разбэшчаных формах,—

пазбаўленне волі да васьмі год.

234. Разбэшчванне малалетніх або няпоўналетніх, зробленае шляхам распусных дзеянняў у адносінах да іх, выклікае —

пазбаўленне волі да пяці год.

235. а) Палавыя зносіны з прымяненнем фізічнага насілля, пагроз, запалохвання або з выкарыстаннем, шляхам падману, безпапаможнага становішча пацярпеўшай асобы (згвалтаванне), а таксама прымушэнне кім-небудзь да палавой сувязі з ім асобы, матэрыяльна ад яго залежачай, выклікае —

пазбаўленне волі да пяці год.

б) Тыя-ж дзеянні, калі вынікам іх было самагубства або цяжкая хвароба пацярпеўшай асобы, або калі яны зроблены групай з трох асоб і больш, або над асобай, якая не дасягнула палавой спеласці,—

пазбаўленне волі да дзесяці год [1]).

235[1]. Палавыя зносіны мужчыны з мужчынам (мужаложства) выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін ад трох да пяці год.

Мужаложства, зробленае з прымяненнем насілля або з выкарыстаннем залежнага становішча пацярпеўшага, выклікае —

пазбаўленне волі на тэрмін ад пяці да васьмі год [30 красавіка 1934 г. (ЗЗ № 17, п. 88)].

236. а) Прымушэнне да займання прастытуцыяй, зводніцтва, утрыманне прытонаў распусты, а таксама ўцягненне жанчын у прастытуцыю выклікае —

пазбаўленне волі да пяці год.

б) Тыя-ж дзеянні, калі ўцягнутыя ў прастытуцыю былі на ўтрыманні або ў залежнасці ад уцягнуўшага іх,—

пазбаўленне волі да васьмі год [17 красавіка 1935 г. (ЗЗ № 17, п. 93)].

237. Зневага дзеяннем, словамі або на пісьме выклікае —

папраўча-працоўныя работы да трох месяцаў або штраф да двухсот рублёў або грамадскае ганьбаванне.

---

[1]) Гл. Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 4 студзеня 1949 г. «Аб узмацненні крымінальнай адказнасці за згвалтаванне», стар. 62.

**238.** Знявага ў распаўсюджаных або публічна выстаўленых творах друку або малюнках выклікае —

штраф да трохсот рублёў або папраўча-працоўныя работы да шасці месяцаў.

**239.** а) Распаўсюджванне заведама ілжывых, ганьбуючых іншую асобу звестак (паклёп) выклікае —

штраф да трохсот рублёў або папраўча-працоўныя работы да шасці месяцаў.

б) Распаўсюджванне такіх звестак у друкаваным або іншым спосабам размножаным творы —

штраф да пяцісот рублёў або пазбаўленне волі да аднаго года.

## VII. МАЁМАСНЫЯ ЗЛАЧЫНСТВЫ

**240.** а) Пакража маёмасці з прыватных сховішчаў выклікае —

пазбаўленне волі да шасці месяцаў або папраўча-працоўныя работы на той-жа тэрмін.

б) Тое-ж дзеянне, калі яно зроблена пасля адбыцця меры сацыяльнай аховы за аднароднае маёмаснае злачынства, або з прымяненнем тэхнічных сродкаў, або групай з трох асоб і больш, альбо ў час пажару, паводкі або іншага грамадскага бедства, —

пазбаўленне волі да двух год [1]).

**241.** а) Крадзеж маёмасці з дзяржаўных, грамадскіх або кааператыўных устаноў ці складаў выклікае —

пазбаўленне волі да двух год.

б) Тое-ж дзеянне, пры наяўнасці прызнакаў, указаных у п. «б» арт. 240, —

пазбаўленне волі да пяці год [1]).

З а ў в а г а. А д м е н е н а [7 сакавіка 1930 г. (ЗЗ № 15, п. 100)].

241[1]. Дробная пакража, незалежна ад яе размераў, зробленая на прадпрыемстве або ўстанове,—

караецца турэмным зняволеннем тэрмінам на адзін год, калі яна па свайму характару не цягне за сабой па закону больш цяжкага пакарання (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 22 жніўня 1940 г.) [1]).

**242.** а) Пакража буйной жывёлы, апрача коней (арт. 243), выклікае —

пазбаўленне волі да трох год [1]).

б) Тое-ж дзеянне, зробленае не ў першы раз або групай з трох асоб і больш,—

пазбаўленне волі да васьмі год [1]).

**243.** Пакража коней выклікае —

пазбаўленне волі да васьмі год [1]).

---

[1]) Артыкулы 240, 241, 241[1], 242, 243, 245, 246, 247 не прымяняюцца. Гл. пастанову Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 22 жніўня 1947 г. «Аб парадку прымянення Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 4 чэрвеня 1947 г.».

Да арт. 241[1] гл. Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 10 студзеня 1955 г. «Аб крымінальнай адказнасці за дробны крадзеж дзяржаўнай і грамадскай маёмасці», стар. 63.

**244.** Пакража электрычнай энергіі выклікае —
штраф да трохсот рублёў або папраўча-працоўныя работы да трох месяцаў або пазбаўленне волі на той-жа тэрмін.

**245.** а) Адкрытае завалоданне чужой маёмасцю ў прысутнасці асобы, якая валодае, карыстаецца або ведае ёю (грабеж), выклікае —
пазбаўленне волі да аднаго года.

б) Тое-ж дзеянне, злучанае з насіллем,—
пазбаўленне волі да трох год.

в) Тое-ж дзеянне, зробленае групай з трох асоб і больш або хоць-бы адной асобай, але пасля адбыцця меры соцыяльнай аховы за такое-ж злачынства,—
пазбаўленне волі да пяці год [1]).

**246.** а) Грабеж коней, валоў або іншай буйной жывёлы выклікае —
пазбаўленне волі да васьмі год.

б) Тое-ж дзеянне, зробленае групай з трох асоб і больш або хоць-бы адной асобай, але з насіллем ці пасля адбыцця меры соцыяльнай аховы за такое-ж злачынства,—
пазбаўленне волі да дзесяці год [1]).

**247.** а) Адкрыты з мэтай завалодання чужой маёмасцю напад, злучаны з насіллем, якое пагражае жыццю або здароўю пацярпеўшага (разбой) [1]), выклікае —
пазбаўленне волі не менш як на тры гады.

б) Тое-ж дзеянне, зробленае групай з трох асоб і больш або хоць-бы і адной асобай, але пасля адбыцця меры соцыяльнай аховы за такое-ж злачынства,—
пазбаўленне волі не менш як на пяць год.

в) Тое-ж дзеянне, зробленае з прымяненнем зброі,—
пазбаўленне волі не менш як на восем год, з павышэннем пры абцяжваючых акалічнасцях аж да вышэйшай меры соцыяльнай аховы — расстрэл [2]).

**248.** а) Прысваенне або растрата прыватнай асобай грошай або іншай маёмасці, даверанай ёй для пэўнай мэты, выклікае—
пазбаўленне волі да аднаго года або папраўча-працоўныя работы на той-жа тэрмін.

б) Тыя-ж дзеянні, калі прысвоеная або растрачаная маёмасць належала дзяржаўнай, грамадскай або кааператыўнай установе,—
пазбаўленне волі да пяці год.

**249.** Утойванне знойдзенай маёмасці выклікае —
пазбаўленне волі да двух месяцаў або папраўча-працоўныя работы да трох месяцаў.

**250.** а) Злоўжыванне давер'ем або падман у мэтах атрымання маёмасці або права на маёмасць ці іншых асабістых выгад (машэнніцтва) выклікае —
пазбаўленне волі да двух год.

б) Машэнніцтва, вынікам якога было прычыненне страты дзяржаўнай, грамадскай або кааператыўнай установе,—
пазбаўленне волі да пяці год.

---

[1]) Гл. зноску на стар. 54.
[2]) Гл. зноску 3 да заўвагі артыкула 27, стар. 7.

250[1]. Выдача чэкадавальнікам чэка, заведама для яго не падлягаючага аплаце плацельшчыкам, адмена чэка без уважлівых прычын або прымяненне якіх-небудзь іншых мер з мэтай перашкодзіць чэкатрымальніку атрымаць суму чэка, а таксама перадача чэкатрымальніку чэка, заведама для яго не падлягаючага аплаце плацельшчыкам, выклікаюць —

пазбаўленне волі да двух год [17 студзеня 1930 г. (ЗЗ № 7, п. 42)].

251. а) Купля маёмасці, заведама здабытай шляхам пакражы, грабяжу, разбою, прысваення, растраты або машэнніцтва, выклікае —

штраф да пяцісот рублёў або папраўча-працоўныя работы да шасці месяцаў або пазбаўленне волі да аднаго года.

б) Тое-ж дзеянне, зробленае ў выглядзе промысла,—

пазбаўленне волі да трох год.

252. а) Невыкананне дагавору з дзяржаўнай, грамадскай або кааператыўнай установай або прадпрыемствам, калі пры разглядзе справы ў парадку грамадзянскага судавядзення ўстаноўлен зламысны характар невыканання, выклікае —

пазбаўленне волі да пяці год з канфіскацыяй часткі маёмасці або без канфіскацыі.

б) Тое-ж дзеянне, калі яно зроблена ў баявой абстаноўцы або звязана з пастаўкай прадметаў забеспячэння Чырвонай Арміі і Флоту і магло шкодна адбіцца на іх боездольнасці,—

пазбаўленне волі не менш як на тры гады з канфіскацыяй усёй маёмасці.

253. Растрачванне арандатарам прадастаўленай яму па дагавору дзяржаўнай, грамадскай або кааператыўнай маёмасці выклікае —

пазбаўленне волі да пяці год з канфіскацыяй усёй або часткі маёмасці або без канфіскацыі.

254. Падраблiванне ў карыслівых мэтах дакументаў і распісак, якія ўстанаўліваюць маёмасныя правы або выгады, выклікае —

штраф да адной тысячы рублёў або пазбаўленне волі да аднаго года.

255. а) Падманнае змяненне з карыслівай мэтай віду або ўласцівасці прадметаў, прызначаных для збыту або грамадскага спажывання (фальсіфікацыя), а таксама збыт такіх прадметаў выклікае —

штраф да пяцісот рублёў або папраўча-працоўныя работы да аднаго года з канфіскацыяй фальсіфікаваных прадметаў.

б) Тыя-ж дзеянні, калі яны мелі або маглі мець сваім вынікам шкоду здароўю,—

пазбаўленне волі да аднаго года з канфіскацыяй фальсіфікаваных прадметаў і з забаронай займання гандлем на тэрмін да пяці год.

256. Збыт заведама непрыгоднага насеннага матэрыялу выклікае —

штраф да трох тысяч рублёў або пазбаўленне волі да трох год з забаронай займання гандлем на тэрмін да пяці год.

257. Выраб, захоўванне з мэтай збыту або збыт падробленага прабірнага кляйма, клеймаванне такім кляймом вырабаў і зліткаў з золата, серабра і плаціны, накладанне на вырабе з іншых металаў

клеймаў і марак, якія маюць падабенства з прабірным кляймом, а таксама збыт вырабаў з такімі клеймамі і маркамі выклікае —

пазбаўленне волі да двух год з канфіскацыяй падробленых вырабаў.

258. Захоўванне ў гандлёвым прадпрыемстве неклеймаваных вырабаў з золата, серабра і плаціны і збыт такіх вырабаў выклікае —

штраф у размеры не менш дзесяцікратнай прабірнай платы за выпрабаванне і клеймаванне выяўленых вырабаў і канфіскацыю гэтых вырабаў.

259. а) Спагнанне працэнтаў па пазыцы звыш размеру, устаноўленага для данай мясцовасці Советам Народных Камісараў БССР, а таксама спагнанне за прадастаўленыя ў карыстанне прылады вытворчасці, жывёлу, палявое або гароднае насенне платы, якая значна перавышае звычайную для данай мясцовасці норму (ліхвярства), выклікае—

пазбаўленне волі да аднаго года.

б) Тыя-ж дзеянні, зробленыя ў выглядзе промысла або з выкарыстаннем цяжкага матэрыяльнага становішча другога боку (кваліфікаванае ліхвярства)—

пазбаўленне волі да трох год.

260. Патрабаванне перадачы якой-небудзь маёмасці або маёмасных выгад, або правоў на маёмасць, або выкананне якіх-небудзь дзеянняў маёмаснага характару пад пагрозай учынення насілля над асобай пацярпеўшага, або знішчэння яго маёмасці, або агалашэння аб ім ганьбуючых яго звестак (вымаганне) выклікае —

пазбаўленне волі да трох год.

261. Наўмыснае знішчэнне або пашкоджанне чужой маёмасці або хоць-бы і ўласнай маёмасці, але з мэтай нанесці шкоду іншай асобе, выклікае—

штраф да пяцісот рублёў або папраўча-працоўныя работы да аднаго года або пазбаўленне волі на той-жа тэрмін.

262. а) Наўмыснае знішчэнне або пашкоджанне якой-небудзь маёмасці шляхам падпалу, затаплення або якім-небудзь іншым агульнанебяспечным спосабам выклікае—

пазбаўленне волі да пяці год.

б) Тыя-ж дзеянні, калі яны выклікалі смерць, цяжкае цялеснае пашкоджанне або грамадскае бедства, —

пазбаўленне волі да дзесяці год.

263. Самавольнае карыстанне вынаходствам з парушэннем правіл, устаноўленых у законах аб патэнтах на вынаходствы, а таксама самавольнае выкарыстанне літаратурных, музычных і іншых мастацкіх або навуковых твораў з парушэннем закону аб аўтарскім праве выклікае —

штраф да адной тысячы рублёў.

264. Самавольнае карыстанне ў мэтах нядобрасумленнай канкурэнцыі чужым таварным, фабрычным або рамесным знакам, рысункам, мадэллю, а таксама чужой фірмай або чужой назвай выклікае —

штраф да трох тысяч рублёў.

## ЗАКОН АБ АХОВЕ МІРУ

**12 сакавіка 1951 года**

*(«Ведамасці Вярхоўнага Совета СССР» 1951 г. № 5)*

Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, кіруючыся высокімі прынцыпамі совецкай міралюбівай палітыкі, якая ставіць мэты ўмацавання міру і дружалюбных адносін паміж народамі,—

прызнае, што сумленне і праваўсведамленне народаў, якія перанеслі на працягу жыцця аднаго пакалення бедствы двух сусветных войн, не могуць мірыцца з беспакаранасцю праводзімай агрэсіўнымі коламі некаторых дзяржаў прапаганды вайны і салідарызуецца з заклікам Другога Сусветнага Кангрэса прыхільнікаў міру, які выказаў волю ўсяго перадавога чалавецтва ў адносінах забароны і асуджэння злачыннай ваеннай прапаганды.

Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік пастанаўляе:

1. Лічыць, што прапаганда вайны, у якой-бы форме яна ні вялася, падрывае справу міру, стварае пагрозу новай вайны і з'яўляецца з прычыны гэтага найцяжэйшым злачынствам супроць чалавецтва.

2. Асоб, вінаватых у прапагандзе вайны, аддаваць пад суд і судзіць як цяжкіх крымінальных злачынцаў.

## АБ АДМЕНЕ ПАКАРАННЯ СМЕРЦЮ [1]

**Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 мая 1947 г.**

*(«Ведамасці Вярхоўнага Совета СССР» 1947 г. № 17)*

Гістарычная перамога совецкага народа над ворагам паказала не толькі ўзросшую магутнасць Совецкай дзяржавы, але і перш за ўсё выключную адданасць Совецкай радзіме і Совецкаму ўраду ўсяго насельніцтва Совецкага Саюза.

---

[1]) Гл. ніжэй Указы Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР: ад 12 студзеня 1950 г. «Аб прымяненні пакарання смерцю да здраднікаў радзімы, шпіёнаў, падрыўнікоў-дыверсантаў» і ад 30 красавіка 1954 г. «Аб узмацненні крымінальнай адказнасці за наўмыснае забойства».

Разам з тым міжнародная абстаноўка за прайшоўшы перыяд пасля капітуляцыі Германіі і Японіі паказвае, што справу міру можна лічыць забяспечанай на працяглы час, нягледзячы на спробы агрэсіўных элементаў справакаваць вайну.

Улічваючы гэтыя акалічнасці і ідучы насустрач пажаданням прафесіянальных саюзаў рабочых і служачых і іншых аўтарытэтных арганізацый, якія выказваюць думку шырокіх грамадскіх колаў, — Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР лічыць, што прымяненне пакарання смерцю больш не выклікаецца неабходнасцю ва ўмовах мірнага часу.

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР пастанаўляе:

1. Адмяніць у мірны час пакаранне смерцю, устаноўленае за злачынствы дзеючымі ў СССР законамі.

2. За злачынствы, якія караюцца па дзеючых законах пакараннем смерцю, прымяняць у мірны час зняволенне ў папраўча-працоўныя лагеры тэрмінам на 25 год.

3. Па прыгаворах да пакарання смерцю, не прыведзеных у выкананне да выдання гэтага Указа, замяніць пакаранне смерцю, па вызначэнню вышэйстаячага суда, пакараннем, прадугледжаным у артыкуле 2 гэтага Указа.

## АБ ПРЫМЯНЕННІ ПАКАРАННЯ СМЕРЦЮ ДА ЗДРАДНІКАЎ РАДЗІМЫ, ШПІЁНАЎ, ПАДРЫЎНІКОЎ-ДЫВЕРСАНТАЎ

**Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 12 студзеня 1950 г.**

*(«Ведамасці Вярхоўнага Совета СССР» 1950 г. № 3)*

З прычыны паступіўшых заяў ад нацыянальных рэспублік, ад прафсаюзаў, сялянскіх арганізацый, а таксама ад дзеячоў культуры аб неабходнасці ўнесці змяненні ва Указ аб адмене пакарання смерцю з тым, каб гэты Указ не распаўсюджваўся на здраднікаў радзімы, шпіёнаў і падрыўнікоў-дыверсантаў, Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР пастанаўляе:

1. Як выключэнне з Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 мая 1947 г. аб адмене пакарання смерцю, дапусціць прымяненне да здраднікаў радзімы, шпіёнаў, падрыўнікоў-дыверсантаў пакаранне смерцю як вышэйшай меры пакарання.

2. Гэты Указ увесці ў дзеянне з дня яго апублікавання.

## АБ УЗМАЦНЕННІ КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ ЗА НАЎМЫСНАЕ ЗАБОЙСТВА

**Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 30 красавіка 1954 г.**

*(«Ведамасці Вярхоўнага Совета СССР» 1954 г. № 11)*

У сувязі з хадайніцтвамі грамадзян і грамадскіх арганізацый аб прымяненні пакарання смерцю да забойцаў, у мэтах узмацнення аховы жыцця грамадзян, Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР пастанаўляе:

Распаўсюдзіць дзеянне Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 12 студзеня 1950 г. «Аб прымяненні пакарання смерцю да здраднікаў радзімы, шпіёнаў, падрыўнікоў-дыверсантаў» на асоб, якія зрабілі наўмыснае забойства пры абцяжваючых акалічнасцях.

## АБ АБ'ЯЎЛЕННІ ПА-ЗА ЗАКОНАМ СЛУЖБОВЫХ АСОБ — ГРАМАДЗЯН САЮЗА ССР ЗА ГРАНІЦАЙ, ЯКІЯ ПЕРАБЕГЛІ Ў ЛАГЕР ВОРАГАЎ РАБОЧАГА КЛАСА І СЯЛЯНСТВА І АДМАЎЛЯЮЦЦА ВЯРНУЦЦА Ў САЮЗ ССР

**Пастанова Прэзідыума ЦВК СССР ад 21 лістапада 1929 г.**

**1.** Адмаўленне грамадзяніна Саюза ССР — службовай асобы дзяржаўнай установы або прадпрыемства Саюза ССР, дзейнічаючага за граніцай, на прапанову органаў дзяржаўнай улады вярнуцца ў межы Саюза ССР разглядаць як перабежку ў лагер ворагаў рабочага класа і сялянства і кваліфікаваць як здраду.

**2.** Асобы, якія адмовіліся вярнуцца ў Саюз ССР, аб'яўляюцца па-за законам.

**3.** Аб'яўленне па-за законам цягне за сабой: а) канфіскацыю ўсёй маёмасці асуджанага; б) расстрэл [1]) асуджанага праз 24 гадзіны пасля пасведчання яго асобы.

**4.** Усе падобныя справы разглядаюцца Вярхоўным Судом Саюза ССР.

**5.** Імёны аб'яўленых па-за законам падлягаюць паведамленню ўсім выканаўчым камітэтам Советаў і органам Дзяржаўнага палітычнага ўпраўлення.

**6.** Гэты закон мае зваротную сілу.

## АБ АДКАЗНАСЦІ ЗА РАЗГАЛАШЭННЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ ТАЙНЫ І ЗА СТРАТУ ДАКУМЕНТАЎ, ЯКІЯ ЗМЯШЧАЮЦЬ ДЗЯРЖАЎНУЮ ТАЙНУ

**Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 9 чэрвеня 1947 г.**

*(«Ведамасці Вярхоўнага Совета СССР» 1947 г. № 20)*

У мэтах устанаўлення адзінства ў заканадаўстве і ўзмацнення адказнасці за разгалашэнне звестак, якія з'яўляюцца дзяржаўнай тайнай, пералік якіх устаноўлен Советам Міністраў СССР у яго Пастанове ад 8 чэрвеня гэтага года,— Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР пастанаўляе:

**1.** Разгалашэнне звестак, што складаюць дзяржаўную тайну, зробленае асобамі, якім былі давераны гэтыя звесткі або якія маглі атрымаць гэтыя звесткі ў сілу свайго службовага становішча, паколькі гэтыя дзеянні не могуць быць кваліфікаваны як здрада радзіме або шпіянаж,— караецца зняволеннем у папраўча-працоўны лагер на тэрмін ад васьмі да дванаццаці год.

**2.** Разгалашэнне ваеннаслужачымі звестак ваеннага характару, якія складаюць дзяржаўную тайну, паколькі гэтыя дзеянні не мо-

---

[1]) Гл. зноску 3 да заўвагі артыкула 27, стар. 7.

гуць быць кваліфікаваны як здрада радзіме або шпіянаж, — караецца зняволеннем у папраўча-працоўны лагер на тэрмін ад дзесяці да дваццаці год.

3. Разгалашэнне прыватнымі асобамі звестак, якія складаюць дзяржаўную тайну, паколькі гэтыя дзеянні не могуць быць кваліфікаваны як здрада радзіме або шпіянаж, — караецца зняволеннем у папраўча-працоўны лагер на тэрмін ад пяці да дзесяці год.

4. Страта службовымі асобамі матэрыялаў, дакументаў і выданняў, якія змяшчаюць звесткі, што складаюць дзяржаўную тайну, калі гэтыя дзеянні па свайму характару не цягнуць за сабой па закону больш цяжкага пакарання, — караецца зняволеннем у папраўча-працоўны лагер на тэрмін ад чатырох да шасці год.

Тое-ж злачынства, калі яно пацягнула за сабой цяжкія вынікі,— караецца зняволеннем у папраўча-працоўны лагер на тэрмін ад шасці да дзесяці год.

5. Страта ваеннаслужачымі дакументаў, якія змяшчаюць звесткі, што складаюць дзяржаўную тайну, калі гэтыя дзеянні па свайму характару не цягнуць за сабой па закону больш цяжкага пакарання,— караецца зняволеннем у папраўча-працоўны лагер на тэрмін ад пяці да васьмі год.

Тое-ж злачынства, калі яно пацягнула за сабой асабліва цяжкія вынікі,— караецца зняволеннем у папраўча-працоўны лагер на тэрмін ад васьмі да дванаццаці год.

6. Заяўка або перадача за граніцу вынаходстваў, адкрыццяў і тэхнічных удасканаленняў, складаючых дзяржаўную тайну, зробленых у межах СССР, а таксама зробленых за граніцай грамадзянамі СССР, камандзіраванымі дзяржавай, калі гэтыя злачынствы не могуць быць кваліфікаваны як здрада радзіме або шпіянаж,— караецца зняволеннем у папраўча-працоўны лагер на тэрмін ад дзесяці да пятнаццаці год.

7. Страціў сілу (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 11 верасня 1953 г.).

8. У сувязі з выданнем гэтага Указа прызнаць страціўшымі сілу:

а) Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 15 лістапада 1943 г. «Аб адказнасці за разгалашэнне дзяржаўнай тайны і за страту дакументаў, якія змяшчаюць дзяржаўную тайну».

б) Пункт «а» арт. 25 «Палажэння аб воінскіх злачынствах».

Прапанаваць Вярхоўным Советам саюзных рэспублік у адпаведнасці з гэтым Указам унесці неабходныя змены ў заканадаўства саюзных рэспублік.

## АБ КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ ЗА ВЫРАБ І ПРОДАЖ САМАГОНУ

**Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 7 красавіка 1948 г.**

*(«Ведамасці Вярхоўнага Совета СССР» 1948 г. № 14)*

У мэтах устанаўлення адзінства заканадаўства аб крымінальнай адказнасці за выраб і продаж самагону і ўзмацнення барацьбы з гэтымі злачынствамі Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР пастанаўляе:

1. Выраб і захоўванне самагону з мэтай збыту, збыт самагону,

а таксама выраб і збыт у выглядзе промысла апаратаў, якія спецыяльна служаць для вырабу самагону, —

караецца зняволеннем у папраўча-працоўным лагеры на тэрмін ад шасці да сямі год з канфіскацыяй усёй маёмасці або часткі маёмасці.

2. Выраб самагону без мэты збыту —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго да двух год з канфіскацыяй самагону і прылад яго вырабу.

**§ 1.** У мэтах ліквідацыі недахопаў у рабоце судоў па барацьбе з самагонаварэннем Пленум Вярхоўнага Суда СССР пастанаўляе даць судам наступныя ўказанні:

1. Указаць судам на неабходнасць рашучай барацьбы з самагонаварэннем шляхам дакладнага прымянення да вінаватых адпаведных артыкулаў Указа ад 7 красавіка 1948 г. і няўхільнага назначэння мер пакарання, устаноўленых гэтым Указам.

Прымяненне па гэтых справах арт. арт. 51 і 53 КК РСФСР [1]) і адпаведных артыкулаў КК іншых саюзных рэспублік можа мець месца толькі пры асабліва змякчаючых акалічнасцях.

2. Растлумачыць судам, што ў адпаведнасці з патрабаваннямі Указа ад 7 красавіка 1948 г. па арт. 1 гэтага Указа падлягаюць адказнасці не толькі асобы, вінаватыя ў вырабе і збыце самагону, але таксама вінаватыя ў вырабе самагону з мэтай збыту або ў яго захоўванні з той-жа мэтай.

3. Скупка і перапродаж самагону з мэтай нажывы павінна кваліфікавацца, як спекуляцыя, па арт. 107 КК РСФСР [2]) і адпаведных артыкулах КК іншых саюзных рэспублік.

4. Выраб для збыту хмяльных напіткаў з прадуктаў уласнай гаспадаркі ці з пакупной сыравіны або выраб іх з давальчаскай сыравіны належыць кваліфікаваць па арт. 99 КК РСФСР [3]) і адпаведных артыкулах КК іншых саюзных рэспублік.

5. Указаць судам, што эфектыўнасць барацьбы з самагонаварэннем патрабуе своечасовага разгляду гэтых спраў ва ўстаноўлены законам тэрмін з тым, каб вінаватыя неадкладна панеслі пакаранне за зробленае злачынства, з прычыны чаго валакіта, недапушчальная па любой справе, з'яўляецца асабліва нецярпімай па гэтай катэгорыі спраў (з пастановы Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 5 студзеня 1951 г. № 1/1/у са зменамі, унесенымі пратакольнай пастановай Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 17 верасня 1954 г.).

## АБ УЗМАЦНЕННІ КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ ЗА ЗГВАЛТАВАННЕ

**Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 4 студзеня 1949 г.**

*(«Зборнік дакументаў па гісторыі крымінальнага заканадаўства СССР і РСФСР 1917—1952 гг.», стар. 434)*

У мэтах узмацнення крымінальнай адказнасці за згвалтаванне Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР пастанаўляе:

Устанавіць, што згвалтаванне караецца зняволеннем у папраўча-працоўным лагеры на тэрмін ад дзесяці да пятнаццаці год.

---

[1]) Артыкулы 51 і 56 КК БССР.

[2]) Артыкул 155 КК БССР.

[3]) Артыкул 143 КК БССР.

Згвалтаванне няпоўналетняй, а таксама згвалтаванне, зробленае групай асоб або пацягнуўшае за сабой асабліва цяжкія вынікі,— караецца зняволеннем у папраўча-працоўным лагеры на тэрмін ад пятнаццаці да дваццаці год.

## АБ КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ ЗА КРАДЗЕЖ ДЗЯРЖАЎНАЙ І ГРАМАДСКАЙ МАЁМАСЦІ [1])

**Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 4 чэрвеня 1947 г.**

*(«Ведамасці Вярхоўнага Совета СССР» 1947 г. № 19)*

У мэтах устанаўлення адзінства законадаўства аб крымінальнай адказнасці за крадзеж дзяржаўнай і грамадскай маёмасці і ўзмацнення барацьбы з гэтымі злачынствамі Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР пастанаўляе:

**1.** Пакража, прысваенне, растрата або іншы крадзеж дзяржаўнай маёмасці —

караецца зняволеннем у папраўча-працоўным лагеры на тэрмін ад сямі да дзесяці год з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.

**2.** Крадзеж дзяржаўнай маёмасці, зроблены паўторна, а таксама зроблены арганізаванай групай (шайкай) або ў буйных размерах —

караецца зняволеннем у папраўча-працоўным лагеры на тэрмін ад дзесяці да дваццаці пяці год з канфіскацыяй маёмасці.

**3.** Пакража, прысваенне, растрата або іншы крадзеж калгаснай, кааператыўнай або іншай грамадскай маёмасці —

караецца зняволеннем у папраўча-працоўным лагеры на тэрмін ад пяці да васьмі год з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.

**4.** Крадзеж калгаснай, кааператыўнай або іншай грамадскай маёмасці, зроблены паўторна, а таксама зроблены арганізаванай групай (шайкай) або ў буйных размерах —

караецца зняволеннем у папраўча-працоўным лагеры на тэрмін ад васьмі да дваццаці год з канфіскацыяй маёмасці.

**5.** Неданясенне органам улады аб дакладна вядомым рыхтуемым або зробленым крадзяжы дзяржаўнай або грамадскай маёмасці, прадугледжаным артыкуламі 2 і 4 гэтага Указа, —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да трох год або ссылкай на тэрмін ад пяці да сямі год.

## АБ КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ ЗА ДРОБНЫ КРАДЗЕЖ ДЗЯРЖАЎНАЙ І ГРАМАДСКАЙ МАЁМАСЦІ

**Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 10 студзеня 1955 г.**

Устанавіць, што дробны крадзеж дзяржаўнай або грамадскай маёмасці, зроблены ўпершыню,—

караецца папраўча-працоўнымі работамі на тэрмін ад шасці месяцаў да аднаго года або пазбаўленнем волі тэрмінам на тры месяцы.

Тыя-ж дзеянні, зробленыя паўторна,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго года да двух год.

---

[1]) Гл. ніжэй Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 10 студзеня 1955 г. «Аб крымінальнай адказнасці за дробны крадзеж дзяржаўнай і грамадскай маёмасці».

## АБ ПРЫМЯНЕННІ УКАЗА ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР «АБ КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ ЗА ДРОБНЫ КРАДЗЕЖ ДЗЯРЖАЎНАЙ І ГРАМАДСКАЙ МАЁМАСЦІ» ДА АСОБ, ЯКІЯ ЗРАБІЛІ ГЭТЫЯ ЗЛАЧЫНСТВЫ ДА 10 СТУДЗЕНЯ 1955 ГОДА

**Пастанова Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 24 мая 1955 г.**

Растлумачыць, што ў адпаведнасці з артыкулам 3 Асноў крымінальнага судаводства СССР і саюзных рэспублік Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 10 студзеня 1955 года падлягае прымяненню і да асоб, якія зрабілі дробны крадзеж дзяржаўнай або грамадскай маёмасці да 10 студзеня 1955 года.

Пытанне аб прымяненні Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 10 студзеня 1955 г. да асоб, якія адбываюць пакаранне за дробны крадзеж дзяржаўнай або грамадскай маёмасці, зроблены да 10 студзеня 1955 года, разглядаецца Вярхоўным судом саюзнай, аўтаномнай рэспублікі, краявым, абласным судом, судом аўтаномнай вобласці па месцу ўтрымання асуджанага, а пры значнай аддаленасці гэтых судоў — бліжэйшым народным судом па прадстаўленню адпаведнага пракурора або суддзі.

Калі справа ў адносінах асобы, якая зрабіла дробны крадзеж дзяржаўнай або грамадскай маёмасці да 10 студзеня 1955 года, запатрабавана для праверкі ў парадку нагляду, пытанне аб прымяненні Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 10 студзеня 1955 года вырашаецца судом, які разглядае справу ў парадку нагляду.

## АБ УЗМАЦНЕННІ АХОВЫ АСАБІСТАЙ УЛАСНАСЦІ ГРАМАДЗЯН

**Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 4 чэрвеня 1947 г.**

(*«Ведамасці Вярхоўнага Совета СССР» 1947 г. № 19*)

У мэтах узмацнення аховы асабістай уласнасці грамадзян Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР пастанаўляе:

1. Пакража, гэта значыць тайнае або адкрытае выкраданне асабістай маёмасці грамадзян,—

караецца зняволеннем у папраўча-працоўным лагеры на тэрмін ад пяці да шасці год.

Пакража, зробленая зладзейскай шайкай або паўторна,—

караецца зняволеннем у папраўча-працоўным лагеры на тэрмін ад шасці да дзесяці год.

2. Разбой, гэта значыць напад з мэтай завалодання чужой маёмасцю, злучаны з насіллем або з пагрозай прымянення насілля, —

караецца зняволеннем у папраўча-працоўным лагеры на тэрмін ад дзесяці да пятнаццаці год з канфіскацыяй маёмасці.

Разбой, злучаны з насіллем, небяспечным для жыцця і здароўя пацярпеўшага, або з пагрозай смерцю або цяжкім цялесным пашкоджаннем, а таксама зроблены шайкай або паўторна,—

караецца зняволеннем у папраўча-працоўным лагеры на тэрмін ад пятнаццаці да дваццаці год з канфіскацыяй маёмасці.

3. Неданясенне органам улады аб дакладна вядомым рыхтуемым або зробленым разбоі —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго года да двух год або ссылкай на тэрмін ад чатырох да пяці год.

**§ 1.** З прычыны пытанняў, якія ўзніклі ў судовай практыцы ў сувязі з выданнем Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 4 чэрвеня 1947 г. «Аб узмацненні аховы асабістай уласнасці грамадзян» і «Аб крымінальнай адказнасці за крадзеж дзяржаўнай і грамадскай маёмасці»,— Міністр юстыцыі Саюза ССР, у парадку п. «в» арт. 7 Палажэння аб НКЮ СССР, увайшоў у Пленум Вярхоўнага Суда Саюза ССР з прапановай даць судам па гэтых пытаннях кіруючыя ўказанні.

Пленум Вярхоўнага Суда СССР пастанаўляе даць судам наступныя ўказанні:

1. Злачынствы, прадугледжаныя ўпамянутымі Указамі, зробленыя пасля іх выдання, падлягаюць кваліфікацыі па адпаведных артыкулах гэтых Указаў. У сувязі з гэтым не падлягаюць прымяненню Закон ад 7 жніўня 1932 года, артыкул 1 Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 10 жніўня 1940 года «Аб крымінальнай адказнасці за дробныя пакражы на вытворчасці і хуліганства», а таксама артыкулы $59^{3а}$, 116, 162, 165, 166, 166-а, 167 і 169 ч. 2 Крымінальнага кодэкса РСФСР і адпаведныя артыкулы крымінальных кодэксаў іншых саюзных рэспублік [1]).

2. Справы аб злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 2 і 4 Указа «Аб крымінальнай адказнасці за крадзеж дзяржаўнай і грамадскай маёмасці» пры буйных размерах пакрадзенага — падсудны краявым, абласным, акруговым судам і вярхоўным судам саюзных і аўтаномных рэспублік. Усе астатнія справы аб злачынствах, прадугледжаных Указамі ад 4 чэрвеня 1947 года, — падсудны народным судам.

3. Па ўсіх справах аб злачынствах, прадугледжаных Указамі ад 4 чэрвеня 1947 года, абавязкова папярэдняе расследаванне.

Накіраванне гэтых спраў у суды павінна рабіцца пракурорам (пастанова Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 22 жніўня 1947 г. № 12/6).

**§ 2.** У мэтах далейшага ўмацавання сацыялістычнай законнасці і ўстанаўлення адзінства ў судовай практыцы па прымяненню Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 4 чэрвеня 1947 года «Аб крымінальнай адказнасці за крадзеж дзяржаўнай і грамадскай маёмасці» Пленум Вярхоўнага Суда СССР пастанаўляе даць судам наступныя ўказанні:

1. Выходзячы з таго, што барацьба з крадзяжамі сацыялістычнай уласнасці з'яўляецца адной з асноўных задач савецкага правасуддзя, суды павінны і ў далейшым строга праводзіць у жыццё Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 4 чэрвеня 1947 года «Аб крымінальнай адказнасці за крадзеж дзяржаўнай і грамадскай маёмасці».

---

[1]) Артыкулы $80^1$, 204, 240, 241, $241^1$, 245, 242, 243, 246, $144^1$, 247, 250 п. «б» КК БССР. Гл. п. 9 пастановы Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 28 мая 1954 г. № 5 (стар. 67).

2. Пры разглядзе спраў аб крадзяжах соцыялістычнай уласнасці суды, як і па іншых справах, абавязаны індывідуальна падыходзіць да назначэння пакарання, улічваючы, згодна з арт. 45 КК РСФСР [1]) і адпаведнымі артыкуламі КК іншых саюзных рэспублік, ступень грамадскай небяспекі зробленага злачынства, канкрэтныя акалічнасці справы і асобу вінаватага.

Разам з тым па справах аб дробных крадзяжах, зробленых упершыню, пры наяўнасці змякчаючых акалічнасцей суды павінны ўлічваць указанні арт. 51 КК РСФСР [2]) і адпаведных артыкулаў КК іншых саюзных рэспублік, якія даюць права суду з прывядзеннем адпаведных матываў у прыгаворы назначыць пакаранне ніжэй ніжэйшай мяжы, указанай у законе [3]).

3. Звярнуць увагу судоў, што пры вырашэнні пытання аб кваліфікацыі злачынства па справах аб крадзяжах яны павінны зыходзіць з таго, што па сэнсу Указа ад 4 чэрвеня 1947 года наўмыснае незаконнае ператварэнне ў сваю ўласнасць дзяржаўнай і грамадскай маёмасці, незалежна ад форм і спосабаў яго выканання, павінна разглядацца як крадзеж.

4. Злоўжыванне службовым становішчам павінна кваліфікавацца па Указу ад 4 чэрвеня 1947 года толькі ў тых выпадках, калі службовая асоба скарыстоўвае сваё службовае становішча для незаконнага ператварэння дзяржаўнай і грамадскай маёмасці ў сваю ўласнасць або для незаконнай перадачы яе з карыслівай мэтай ва ўласнасць іншых асоб.

5. Як крадзеж павінна кваліфікавацца наўмыснае незаконнае атрыманне ад дзяржаўных або грамадскіх арганізацый прэмій, надбавак да заработнай платы і іншых выплат пры дапамозе прадстаўленых з гэтай мэтай заведама фіктыўных дакументаў.

6. Прадстаўленне падложных квітанцый або іншых фіктыўных дакументаў з мэтай вызвалення ад падаткаў, абавязковых паставак і іншых павіннасцей павінна кваліфікавацца па арт. 72 КК РСФСР [4]) і адпаведных артыкулах КК іншых саюзных рэспублік.

7. Крадзеж дзяржаўнай або грамадскай маёмасці, злучаны з разбойным нападам на асоб, у веданні або пад аховай якіх знаходзіцца гэтая маёмасць, павінен кваліфікавацца, як крадзеж пры абцяжваючых акалічнасцях, па арт. 2 або арт. 4 Указа ад 4 чэрвеня 1947 года, а калі ён суправаджаўся забойствам або зроблен пры акалічнасцях, якія маюць адзнакі бандытызму,— то па сукупнасці адпаведных злачынстваў.

8. Самавольнае кашэнне сена на сенакосных угоддзях соўгасаў, калгасаў або іншых дзяржаўных ці грамадскіх арганізацый, калі гэтыя дзеянні павінны выклікаць крымінальную адказнасць, падлягаюць кваліфікацыі па арт. 90 КК РСФСР [5]) і адпаведных артыкулах КК іншых саюзных рэспублік.

9. У частковае змяненне пастановы Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 22 жніўня 1947 года ўказаць судам, што машэн-

---

[1]) Артыкул 48 КК БССР.

[2]) Артыкул 51 КК БССР.

[3]) Гл. Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 10 студзеня 1955 года «Аб крымінальнай адказнасці за дробны крадзеж дзяржаўнай і грамадскай маёмасці», стар. 63.

[4]) Артыкул 105 КК БССР.

[5]) Артыкул 131 КК БССР.

ніцкія дзеянні, якія нанеслі шкоду дзяржаўным або грамадскім установам, прадпрыемствам або арганізацыям, падлягаюць кваліфікацыі па ч. 2 арт. 169 КК РСФСР[1]) і адпаведных артыкулах КК іншых саюзных рэспублік, калі яны не злучаны з крадзяжом дзяржаўнай або грамадскай маёмасці.

10. Растлумачыць, што не ўсякі крадзеж, зроблены сумесна дзвюма або больш асобамі, можа разглядацца як крадзеж, зроблены арганізаванай групай (шайкай), і што арт. арт. 2 або 4 Указа ад 4 чэрвеня 1947 года па гэтаму прызнаку могуць прымяняцца толькі ў тых выпадках, калі па акалічнасцях справы ўстанаўліваецца, што крадзеж зроблен па папярэдняй змове групай асоб, якая сарганізавалася для гэтай мэты.

11. Крадзеж дзяржаўнай або грамадскай маёмасці павінен разглядацца як паўторны, калі раней быў таксама зроблен крадзеж дзяржаўнай або грамадскай маёмасці. Роўным чынам, пакража асабістай маёмасці павінна разглядацца як паўторная, калі ёй папярэднічала пакража такой-жа маёмасці.

У выпадку ўчынення некалькіх неаднародных крадзяжоў, па якіх не было вынесена прыгавору, кожны з гэтых крадзяжоў павінен кваліфікавацца самастойна па адпаведнаму закону, і пакаранне павінна вызначацца па сукупнасці згодна з арт. 49 КК РСФСР[2]) і адпаведнымі артыкуламі КК іншых саюзных рэспублік.

12. Па справах аб крадзяжах дзяржаўнай і грамадскай маёмасці суд пры вынясенні абвінаваўчага прыгавору абавязан вырашыць пытанне аб спагнанні з вінаватага нанесенай страты.

У тых выпадках, калі да паступлення справы ў суд іск прад'яўлен не быў, суд да разгляду справы павінен своечасова папярэдзіць зацікаўленыя ўстановы, прадпрыемствы і арганізацыі аб прад'яўленні адпаведнага іску падсудным.

13. Пры разглядзе спраў аб крадзяжах соцыялістычнай уласнасці суды павінны, на падставе стараннага даследавання акалічнасцей справы, высвятляць прычыны, якія садзейнічалі крадзяжам, і даводзіць прыватнымі вызначэннямі да ведама адпаведных органаў аб выяўленых недахопах (дрэнная пастаноўка ўліку, аховы маёмасці і да т. п.) для іх ліквідацыі, а ў неабходных выпадках выносіць прыватныя вызначэнні аб прыцягненні вінаватых да дысцыплінарнай або крымінальнай адказнасці.

14. Звярнуць увагу судоў, што пры разглядзе ў касацыйным парадку або ў парадку нагляду спраў аб крадзяжах дзяржаўнай і грамадскай маёмасці яны павінны з асаблівай стараннасцю правяраць паўнату і ўсебаковасць даследавання справы, а таксама правільнасць кваліфікацыі злачынства і назначанага судом пакарання (пастанова Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 28 мая 1954 г. № 5).

§ 3. У мэтах ліквідацыі недахопаў у судовай практыцы па справах аб няпоўналетніх ва ўзросце ад 12 да 16 год, якія прыцягваюцца да крымінальнай адказнасці па Указах ад 4 чэрвеня 1947 г., Пленум Вярхоўнага Суда СССР пастанаўляе даць судам наступнае кіруючае ўказанне:

---

[1]) Пункт «б» артыкула 250 КК БССР.
[2]) Артыкулы 53, 54, 55 КК БССР.

1. Указаць судовым органам, што з выданнем Указаў ад 4 чэрвеня 1947 г. не страціла сілы Пастанова Соўнаркома СССР ад 15 чэрвеня 1943 г. № 659 «Аб узмацненні мер барацьбы з дзіцячай беспрытульнасцю, безнагляднасцю і хуліганствам». У адпаведнасці з гэтай Пастановай і выданай, па даручэнню Соўнаркома СССР, інструкцыяй НКУС, НКЮ і Пракуратуры СССР ад 21 чэрвеня 1943 г., суды ў выпадку ўчынення крадзяжоў нязначных размераў няпоўналетнімі ва ўзросце ад 12 да 16 год павінны ставіць на сваё абмеркаванне пытанне аб спыненні справы ў крымінальным парадку за нямэтазгоднасцю прымянення мер крымінальнага пакарання і накіраванні абвінавачваемых у працоўныя выхаваўчыя калоніі МУС.

Калі, зыходзячы з канкрэтных акалічнасцей справы, суд па справах аб дробных крадзяжах прыйдзе да вываду аб нямэтазгоднасці накіравання абвінавачваемага ў працоўную выхаваўчую калонію, ён мае права, спыняючы сваім вызначэннем справу ў крымінальным парадку, пастанавіць аб перадачы абвінавачваемага на папячэнне бацькоў або апекуноў з ускладаннем на бацькоў або на органы народнай асветы або апекі абавязкі ажыццяўляць штодзённы нагляд за паводзінамі і выхаваннем абвінавачваемага.

2. Указаць судовым органам, што ў тых выпадках, калі справа ў адносінах няпоўналетняга ва ўзросце ад 12 да 16 год не падлягае спыненню, суд можа ў неабходных выпадках, пры наяўнасці змякчаючых акалічнасцей, назначыць паніжанае пакаранне ў парадку арт. 51 КК РСФСР і адпаведных артыкулаў КК іншых саюзных рэспублік[1]) або прымяніць умоўнае асуджэнне з прывядзеннем у абодвух выпадках у прыгаворах абгрунтаваных матываў змякчэння пакарання.

Прымяняючы ўмоўнае асуджэнне, суды не павінны дапускаць, каб у няпоўналетняга засталося пачуццё беспакаранасці за зробленае ім злачынства. З прычыны гэтага суд павінен растлумачыць падсуднаму значэнне выпрабавальнага тэрміну і папярэдзіць, што ў выпадку ўчынення новага злачынства ён панясе пакаранне і за першае злачынства. Адначасова суд абавязан у прыгаворы або асобным вызначэннем ускласці на органы народнай асветы, апекі або на бацькоў абавязак ажыццяўлення штодзённага нагляду за паводзінамі і выхаваннем асуджанага.

3. Звярнуць увагу судовых органаў на недапушчальнасць асуджэння няпоўналетніх за асобныя дробныя крадзяжы, якія носяць характар дзіцячага свавольства (напрыклад, дробная пакража яблыкаў у садзе або гародніны ў агародзе і г. д.).

Роўным чынам не дапускаць асуджэння няпоўналетніх за пакражу ў бацькоў або іншых сумесна пражываючых з імі членаў сям'і, за выключэннем выпадкаў, калі самі пацярпеўшыя звернуцца ў адпаведныя органы з просьбай аб узбуджэнні супроць няпоўналетняга справы ў крымінальным парадку.

Гэтая пастанова не распаўсюджваецца на выпадкі разбою і крадзяжоў у буйных размерах, а таксама на асоб, раней асуджаных за крадзяжы, а таксама на арганізатараў і актыўных удзельнікаў арганізаваных груп (шаек) (пастанова Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 17 лютага 1948 г. № 4/2/у).

---

[1]) Артыкул 51 КК БССР.

§ 4. У мэтах ліквідацыі недахопаў у судовай практыцы па спагнанню страты, нанесенай злачынствам, Пленум Вярхоўнага Суда СССР пастанаўляе даць судам наступныя ўказанні:

1. Пры разглядзе крымінальных спраў суды павінны ўдзяляць сур'ёзную ўвагу грамадзянскаму іску, улічваючы яго важнае значэнне, як сродку аховы маёмасных інтарэсаў дзяржаўных і грамадскіх устаноў, прадпрыемстваў і арганізацый, пацярпеўшых ад злачынства, а таксама маёмасных правоў асобных грамадзян.

Прыняты да сумеснага разгляду з крымінальнай справай грамадзянскі іск павінен быць, як правіла, канчаткова вырашан адначасова з крымінальнай справай.

Улічваючы, што ад размеру нанесенай матэрыяльнай страты залежаць нярэдка кваліфікацыя злачынства і вызначэнне размеру пакарання,— перадача грамадзянскага іску ў парадку арт. 329 КПК РСФСР[1]) і адпаведных артыкулаў КПК іншых саюзных рэспублік у адпаведны суд для вызначэння ў парадку грамадзянскага судавядзення размераў задавальнення можа мець месца толькі як асобае выключэнне.

2. Пры разглядзе справы ў падрыхтоўчым пасяджэнні суд павінен высветліць, ці нанесена злачынствам матэрыяльная страта, ці прад'яўлен пацярпеўшым грамадзянскі іск, ці прадстаўлены доказы ў пацвярджэнне іску, ці прыняты меры да яго забеспячэння і ці ўказан грамадзянскі істец у ліку асоб, якія падлягаюць выкліку ў судовае пасяджэнне. Калі, нягледзячы на даныя, якія ёсць у справе, аб нанясенні злачынствам страты, следчыя органы не прынялі адпаведных мер да забеспячэння заяўленага грамадзянскага іску, суд па ўласнай ініцыятыве павінен пастанавіць аб прыняцці гэтых мер.

Па справах аб крадзяжах і недастачах дзяржаўнай і грамадскай маёмасці, па якіх грамадзянскі іск у працэсе папярэдняга следства не быў заяўлен, суд абавязан паведаміць зацікаўленым установам, прадпрыемствам і арганізацыям аб прыняцці справы да вядзення, з тым, каб яны мелі магчымасць прад'явіць грамадзянскі іск. У выпадку непрыняцця следчымі органамі мер забеспячэння заяўленага грамадзянскага іску па такога роду справах у працэсе папярэдняга следства, суд або вяртае справу пракурору, або сам прымае меры забеспячэння, калі яны не звязаны з вядзеннем следчых дзеянняў.

3. Калі матэрыяльная страта нанесена злачынным дзеяннем рабочага або служачага, які знаходзіцца з пацярпеўшай дзяржаўнай або грамадскай установай, прадпрыемствам або арганізацыяй у працоўных адносінах, то маёмасная адказнасць вінаватага павінна вызначацца на падставе пастановы ЦВК і СНК СССР ад 12 чэрвеня 1929 г. «Аб маёмаснай адказнасці рабочых і служачых перад наймальнікам» (арт. $83^1$ [2]), $83^6$ КЗаП РСФСР і адпаведныя артыкулы КЗаП іншых саюзных рэспублік).

Размер падлягаючай у гэтых выпадках пакрыццю страты павінен устанаўлівацца судом з улікам канкрэтных акалічнасцей справы, ступені віны работніка і яго матэрыяльнага становішча.

Пытанне аб матэрыяльнай адказнасці службовых асоб, якія не адносяцца да катэгорыі матэрыяльна-адказных работнікаў, ві-

---

[1]) Артыкул 329 КПК БССР.

[2]) Артыкул 83 КЗаП БССР.

наватых у некарыслівых злачынствах, павінна, як правіла, вырашацца ў парадку п. «н» арт. 20 КК РСФСР і адпаведных артыкулаў КК іншых саюзных рэспублік, калі суд наогул па акалічнасцях справы, апрача асноўнага пакарання, прызнае мэтазгодным ускласці на асуджанага абавязак загладзіць шкоду. Пры гэтым суд павінен улічыць, што гэтае дадатковае пакаранне па сваёй цяжкасці не павінна перавышаць назначанага па прыгавору асноўнага пакарання (арт. 44 КК РСФСР і адпаведныя артыкулы КК іншых саюзных рэспублік). У гэтым выпадку выключаецца адказнасць падсуднага па грамадзянскаму іску [1]).

Калі матэрыяльная страта нанесена злачыннымі дзеяннямі асобы, якая не знаходзіцца з пацярпеўшым у працоўных адносінах, то пры ўстанаўленні размеру пакрыцця страты суд павінен абмеркаваць пытанне аб прымяненні арт. 411 ГК РСФСР [2]) і адпаведных артыкулаў ГК іншых саюзных рэспублік.

4. Салідарную адказнасць павінны несці асобы, якія нанеслі страту сумеснымі дзеяннямі. Недапушчальна ўскладаць салідарную адказнасць на асоб, якія асуджаны па адной справе, але за самастойныя злачынствы, не звязаныя агульным намерам, або на асоб, з якіх адны, напрыклад, асуджаны за крадзеж, а другія — за нядбайнасць або некарыслівыя злоўжыванні, хоць-бы дзеянні апошніх у нейкай меры аб'ектыўна і садзейнічалі першым зрабіць крадзеж.

Пры групавых злачынствах кожны асуджаны нясе салідарную адказнасць толькі ў частцы тых фактаў (эпізодаў) злачынства, у якіх устаноўлен яго ўдзел.

У тых выпадках, калі падсудны нанёс шкоду сваімі злачыннымі дзеяннямі пры наўмысным садзейнічанні з боку іншых падсудных, на гэтых апошніх павінна ўскладацца салідарная з асобай, якая нанесла шкоду, адказнасць у размеры сумы, у якой яны садзейнічалі нанясенню шкоды.

Пры задавальненні грамадзянскага іску з некалькіх асуджаных суд павінен дакладна ўказаць у прыгаворы, ці ўскладае ён на асуджаных і на каго з іх салідарную і долевую адказнасць, і ў апошнім выпадку — якую іменна суму абавязан кожны з адказчыкаў заплаціць пацярпеўшаму.

5. Пры вынясенні апраўдальнага прыгавору за недаказанасцю падзеі злачынства або за недастатковасцю доказаў для абвінавачання суд згодна з арт. 327 КПК РСФСР [3]) і адпаведнымі артыкуламі КПК іншых саюзных рэспублік павінен адмовіць у грамадзянскім іску да падсуднага.

У выпадку апраўдання за адсутнасцю ў дзеяннях падсуднага саставу злачынства грамадзянскі іск павінен быць пакінут судом без разгляду. Роўным чынам, грамадзянскі іск пакідаецца без разгляду таксама ў выпадку спынення справы за смерцю падсуднага, у сілу акта аб амністыі, на падставе арт. 8, а таксама заўвагі да арт. 6 КК РСФСР [4]) і адпаведных артыкулаў КК і КПК іншых саюзных рэспублік, або за поўнай адсутнасцю памяці пад-

---

[1]) Абзац трэці п. 3 выключан пастановай Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 10 красавіка 1957 г. № 5.

[2]) Артыкул 453 ГК БССР.

[3]) Артыкул 327 КПК БССР.

[4]) Артыкул 4-а КПК БССР і артыкул 12 КК БССР.

суднага (арт. 322 КПК РСФСР[1]) і адпаведныя артыкулы КПК іншых саюзных рэспублік).

Ва ўсіх гэтых выпадках пацярпеўшы мае права прад'явіць іск да падсуднага ў парадку грамадзянскага судавядзення.

У тых выпадках, калі суд, разглядаючы справу ў судовым пасяджэнні, прызнаўшы падсуднага вінаватым, вызваляе яго ад пакарання ў сілу п. 2 арт. 326 КПК РСФСР[2]) і адпаведных артыкулаў КПК іншых саюзных рэспублік, пытанне аб грамадзянскім іску вырашаецца на такіх-жа падставах, як пры вынясенні абвінаваўчага прыгавору.

Парадак, устаноўлены ў арт. 327 КПК РСФСР[3]) і адпаведных артыкулах КПК іншых саюзных рэспублік, павінен прымяняцца і пры разглядзе справы ў касацыйным парадку і ў парадку нагляду.

Пры адмене прыгавору з перадачай справы на новы разгляд у адносінах адных асуджаных і пакіданні яго ў сіле ў адносінах другіх, звязаных з першымі салідарнай маёмаснай адказнасцю, прыгавор у частцы грамадзянскага іску падлягае адмене з перадачай на новы разгляд у адносінах усіх асуджаных, прызнаных па прыгавору салідарнымі адказчыкамі.

Калі пры змяненні прыгавору мяняецца падстава маёмаснай адказнасці, то ў залежнасці ад акалічнасцей справы вышэйстаячы суд або сам змяняе прыгавор у частцы грамадзянскага іску, або адмяняе ў гэтай частцы прыгавор і накіроўвае грамадзянскі іск на новы разгляд у парадку грамадзянскага судавядзення.

6. Пры вынясенні абвінаваўчага прыгавору суд павінен на падставе стараннага аналізу акалічнасцей справы высветліць пытанне аб абгрунтаванасці прад'яўленага іску і, як у выпадках яго задавальнення, так і адмаўлення ў ім, прывесці ў прыгаворы матывы ў абгрунтаванне свайго вываду ў адносінах грамадзянскага іску, доказы, на падставе якіх суд прызнаў іск даказаным ці недаказаным, а таксама закон, у адпаведнасці з якім вырашан грамадзянскі іск.

7. Пры разглядзе ў грамадзянскім парадку іску, прад'яўленага ў крымінальнай справе, суд не можа ўваходзіць у праверку таго, ці было зроблена злачынства і ці зроблена яно падсудным (арт. 13 КПК РСФСР[4]) і адпаведныя артыкулы КПК іншых саюзных рэспублік), а разглядае толькі пытанне аб размеры страты, якая падлягае спагнанню, выкарыстоўваючы для гэтага як матэрыялы крымінальнай справы, так і новыя доказы, прадстаўленыя суду бакамі і сабраныя па ініцыятыве суда.

Калі ў выніку ўстаноўленага ў парадку грамадзянскага судавядзення размеру страты суд прыходзіць да пераканання аб неабходнасці перагляду прыгавору па крымінальнай справе, суд павінен пастанавіць рашэнне па грамадзянскаму іску на падставе ўсіх разгледжаных ім доказаў і разам з тым зрабіць прадстаўленне Старшыні Вярхоўнага суда саюзнай рэспублікі або Вярхоўнага Суда СССР, па прыналежнасці, аб праверцы ў парадку нагляду прыгавору па крымінальнай справе.

8. Пры разглядзе ў парадку грамадзянскага судавядзення іску, які вынікае з крымінальнай справы, суд абавязан паведаміць

---

1) Артыкул 322 КПК БССР.
2) Пункт 2 артыкула 326 КПК БССР.
3) Артыкул 327 КПК БССР.
4) Артыкул 13 КПК БССР.

асуджанаму адказчыку аб дні слухання справы. Калі месца знаходжання адказчыка невядома і справа за немагчымасцю ўручэння адказчыку позвы падлягае разгляду па арт. 72 ГПК РСФСР[1]) і адпаведных артыкулах ГПК іншых саюзных рэспублік, суд павінен паведаміць аб дні слухання справы блізкім сваякам асуджанага або іншым асобам і ўстановам, у веданні якіх знаходзіцца маёмасць асуджанага і якія могуць прадстаўляць яго інтарэсы.

9. Прыгавор суда ў частцы грамадзянскага іску можа быць прад'яўлен да выканання ў межах тэрмінаў, устаноўленых у ГПК саюзных рэспублік для выканання рашэння па грамадзянскіх справах.

10. Суды павінны ўзмацніць кантроль за дзеяннямі судовых выканаўцаў па прывядзенню імі ў выкананне судовых прыгавораў і рашэнняў, якімі задаволены грамадзянскія іскі пацярпеўшых (з пастановы Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 28 мая 1954 г. № 6).

## АБ АДКАЗНАСЦІ ЗА НЕЗАКОННАЕ ЎЗНАГАРОДЖАННЕ ОРДЭНАМІ І МЕДАЛЯМІ СССР І НАГРУДНЫМІ ЗНАКАМІ, ЗА ПРЫСВАЕННЕ ОРДЭНАЎ, МЕДАЛЯЎ І НАГРУДНЫХ ЗНАКАЎ І ПЕРАДАЧУ ІХ УЗНАГАРОДЖАНЫМІ АСОБАМІ ІНШЫМ АСОБАМ

**Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 2 мая 1943 г.**

*(«Ведамасці Вярхоўнага Савета СССР» 1943 г. № 18)*

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 10 лістапада 1942 года[2]) камандуючым франтамі, флотамі, арміямі і флатыліямі, камандзірам карпусоў, дывізій, брыгад і палкоў прадастаўлена права ўзнагароджання ад імя Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ордэнамі і медалямі СССР і нагруднымі знакамі байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту, якія вызначыліся на фронце барацьбы з нямецкімі захопнікамі.

Між тым, маюць месца выпадкі парушэння законаў аб ордэнах, медалях СССР і нагрудных знаках, а іменна факты незаконнага ўзнагароджання асоб, якія не маюць прамых адносін да дзеючай арміі і флоту, як гэта мела, напрыклад, месца ў 21, 20 і 61 арміях.

Апрача таго, ёсць факты прысваення ордэнаў і медаляў СССР і нагрудных знакаў, а таксама факты перадачы ўзнагароджанымі асобамі ордэнаў, медаляў і нагрудных знакаў іншым асобам.

Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР пастанаўляе:

1. Устанавіць, што вінаватыя ў незаконным узнагароджанні ордэнамі і медалямі СССР і нагруднымі знакамі асоб, якія не маюць прамых адносін да арміі або флоту, прыцягваюцца да крымінальнай

---

[1]) Артыкул 72 ГПК БССР.

[2]) Страціў сілу (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 26 лютага 1947 г. «Аб прызнанні страціўшымі сілу Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прадастаўленні ваеннаму камандаванню права ўзнагароджання ордэнамі і медалямі СССР»).

адказнасці, як за службовае злачынства, і караюцца турэмным зняволеннем тэрмінам ад 6 месяцаў да 2 год.

2. Вінаватыя ў прысваенні ордэна, медаля або нагруднага знака караюцца турэмным зняволеннем тэрмінам ад 2 да 3 год.

3. За продаж або перадачу ў выглядзе падарунка ордэна, медаля або нагруднага знака іншай асобе вінаваты падлягае пазбаўленню ўзнагароды і караецца турэмным зняволеннем тэрмінам ад аднаго да 3 год.

4. Нашэнне ордэна, медаля або нагруднага знака асобамі, якія не маюць на гэта права, караецца турэмным зняволеннем тэрмінам ад 6 месяцаў да аднаго года.

5. Службовыя асобы, якія нясуць адказнасць за захоўванне ордэнаў, медаляў і нагрудных знакаў (у шпіталях, у штабах, судовых органах і да т. п.), па нядбайнасці якіх дапушчаны крадзяжы ордэна, медаля або нагруднага знака, караюцца турэмным зняволеннем тэрмінам ад аднаго да 2 год.

## АБ АДКАЗНАСЦІ ЗА ПАТРАВЫ ПАСЕВАЎ У КАЛГАСАХ І СОЎГАСАХ

**Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 11 студзеня 1955 г.**

*(«Ведамасці Вярхоўнага Савета СССР» 1955 г. № 1)*

Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР адзначае, што за апошні час з прычыны патурання мясцовых савецкіх органаў шырокае распаўсюджанне атрымалі патравы жывёлай і птушкай, пашкоджанні праязджаючым па палях конным і аўтамабільным транспартам калгасных і соўгасных пасеваў (асабліва азімых культур), лугоў, стагоў сена, а таксама пашкоджанні полеахоўных лесанасаджэнняў, пладова-ягадных і іншых насаджэнняў, што наносіць вялікую шкоду інтарэсам калгасаў, соўгасаў і дзяржавы. Тое, што ствараецца працоўнымі намаганнямі калгаснікаў і рабочых соўгасаў на працягу доўгага часу, нярэдка беспакарана знішчаецца, а барацьба з гэтым зусім не вядзецца. У адносінах патраў азімых культур ёсць ілжывае ўяўленне аб тым, што азімым не наносіцца шкода, а ў асобных выпадках нават прызнаюць неабходным праводзіць страўліванне азімых, наносячы такім чынам вялікую шкоду ўраджаю па гэтых культурах.

Савецкая дзяржава не можа дапусціць, каб у выніку злачынных адносін асобных грамадзян і службовых асоб да грамадскай, сацыялістычнай уласнасці наносілася шкода соўгасам, грамадскай гаспадарцы калгасаў і падрываўся матэрыяльны дабрабыт калгаснікаў.

У мэтах забеспячэння аховы калгасных і соўгасных пасеваў і насаджэнняў ад патраў і пашкоджанняў Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР пастанаўляе:

1. Устанавіць, што жывёла і птушка, якія належаць калгаснікам, рабочым, служачым і іншым грамадзянам, прадпрыемствам, арганізацыям і ўстановам і нанеслі патраву пасеваў і пашкоджанне насаджэнняў у калгасах, соўгасах і іншых дзяржаўных і грамадскіх

гаспадарках, затрымліваюцца гэтымі гаспадаркамі аж да пакрыцця ўладальнікамі жывёлы і птушкі страты, нанесенай патравай.

2. Устанавіць, што за патраву і іншую шкоду, нанесеную пасевам і насаджэнням калгасаў, соўгасаў і іншых дзяржаўных і грамадскіх гаспадарак, павінны прымяняцца наступныя меры матэрыяльнай адказнасці:

а) пры дапушчэнні ў першы раз патравы жывёлай і птушкай пасеваў або пашкоджанняў насаджэнняў у калгасах, соўгасах і іншых гаспадарках уладальнікі жывёлы або птушкі павінны поўнасцю пакрыць страту, нанесеную калгасам, соўгасам або іншым дзяржаўным і грамадскім гаспадаркам, і заплаціць штраф, які накладаецца сельскім або пасялковым, гарадскім Советам дэпутатаў працоўных, у размеры:

за затрыманых на пасевах, у насаджэннях і ля стагоў сена авечак, коз, свіней, цялят — 25 рублёў з галавы; за дарослую буйную рагатую жывёлу, коней і вярблюдаў — 50 рублёў з галавы; за птушку — 5 рублёў з галавы;

б) пры дапушчэнні ў тым-жа годзе паўторнай або неаднаразовай патравы пасеваў, стагоў сена і паўторнага або неаднаразовага пашкоджання насаджэнняў, апрача пакрыцця нанесенай страты, з уладальнікаў жывёлы і птушкі спаганяецца штраф у двайным размеры;

в) калі патрава пасеваў або пашкоджанне насаджэнняў зроблены жывёлай і птушкай, якія належаць калгасу, соўгасу або іншай дзяржаўнай і грамадскай гаспадарцы і знаходзяцца на адказнасці асобных людзей (пастухоў, конюхаў, чабаноў і іншых работнікаў ферм), то вінаватыя ў патравах або пашкоджанні калгаснікі або работнікі соўгасаў, дзяржаўных і грамадскіх гаспадарак павінны пакрыць страту, нанесеную калгасу, соўгасу або іншай дзяржаўнай і грамадскай гаспадарцы;

г) за праезд па пасевах або насаджэннях на гужавым транспарце з асоб, вінаватых у гэтым, спаганяецца штраф у размеры да 50 рублёў, а за праезд на аўтамабілі, трактары, камбайне і іншых машынах — да 100 рублёў.

3. У тым выпадку, калі жывёла і птушка не затрыманы на месцы патравы пасеваў або пашкоджання насаджэнняў, але калгасу, соўгасу або іншай дзяржаўнай і грамадскай гаспадарцы вядома, каму належаць жывёла і птушка, — іх уладальнік нясе такую-ж адказнасць, як і пры затрыманні жывёлы або птушкі на месцы патравы або пашкоджання.

4. Вызначэнне размеру страты, нанесенай патравай пасеваў або пашкоджаннем насаджэнняў, праводзіцца камісіяй у складзе прадстаўніка сельскага або пасялковага, гарадскога Совета дэпутатаў працоўных, агранома і прадстаўніка праўлення калгаса, дырэкцыі соўгаса або іншай дзяржаўнай і грамадскай гаспадаркі ў прысутнасці ўладальніка жывёлы і птушкі, якія нанеслі патраву пасеваў або пашкоджанне насаджэнняў.

Пры няяўцы ўладальніка жывёлы і птушкі вызначэнне размеру страты праводзіцца камісіяй у яго адсутнасці.

5. Спагнанне страты, нанесенай патравай пасеваў і пашкоджаннем насаджэнняў, і штрафу праводзіцца па рашэнню выканкома сельскага або пасялковага, гарадскога Совета дэпутатаў працоўных.

Штраф за праезд па пасевах і насаджэннях накладаецца сельскім або пасялковым, гарадскім Саветам дэпутатаў працоўных па прадстаўленню праўлення калгаса, дырэктара соўгаса або кіраўніка іншай дзяржаўнай і грамадскай гаспадаркі і спаганяецца органамі міліцыі.

Рашэнне сельскага або пасялковага, гарадскога Савета можа быць абскарджана ў 5-дзённы тэрмін у выканком раённага Савета дэпутатаў працоўных, рашэнне якога з'яўляецца канчатковым.

У выпадку адмаўлення ўладальніка жывёлы або птушкі, якія нанеслі патраву пасеваў або пашкоджанне насаджэнняў калгаса, соўгаса і іншай дзяржаўнай і грамадскай гаспадаркі, ад пакрыцця страты і выплаты штрафу спагнанне праводзіцца сельскім або пасялковым, гарадскім Саветам дэпутатаў працоўных у прымусовым парадку.

6. За наўмысную патраву пасеваў, а таксама наўмыснае пашкоджанне полеахоўчых лесанасаджэнняў, пладова-ягадных і іншых насаджэнняў, якія нанеслі буйную шкоду калгасу, соўгасу або іншай дзяржаўнай і грамадскай гаспадарцы, вінаватыя асобы падвяргаюцца па прыгавору суда пакаранню ў выглядзе папраўча-працоўных работ на тэрмін ад 6 месяцаў да аднаго года або пазбаўляюцца волі на тэрмін ад аднаго года да двух год.

## АБ ДАЛУЧЭННІ ДА ПРАЦЫ ЦЫГАНОЎ, ЯКІЯ ЗАЙМАЮЦЦА БАДЗЯЖНІЦТВАМ

**Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 5 кастрычніка 1956 г.**

*(«Ведамасці Вярхоўнага Совета СССР» 1956 г. № 21)*

У выніку мер, прынятых Савецкай дзяржавай па працаўладкаванню вандруючых цыганоў, паляпшэнню ўмоў іх жыцця, павышэнню культурнага ўзроўню, большасць з іх перайшла да працоўнага аселага спосабу жыцця. Аднак да гэтага часу некаторая частка цыганоў працягвае займацца бадзяжніцтвам, вядзе паразітычны спосаб жыцця і нярэдка робіць злачынствы.

У мэтах далучэння да грамадска-карыснай працы цыганоў, якія займаюцца бадзяжніцтвам, Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР пастанаўляе:

1. Забараніць цыганам займацца бадзяжніцтвам і прапанаваць ім перайсці да працоўнага аселага спосабу жыцця.

2. Абавязаць Советы Міністраў саюзных рэспублік прыняць меры да рассялення на пастаяннае месца жыхарства цыганоў, якія займаюцца бадзяжніцтвам, іх працаўладкавання і культурна-бытавога абслугоўвання.

3. Устанавіць, што дасягнуўшыя поўналецця цыганы, якія будуць злосна ўхіляцца ад грамадска-карыснай працы і займацца бадзяжніцтвам, караюцца па прыгавору народнага суда ссылкай на тэрмін да пяці год у злучэнні з папраўча-працоўнымі работамі.

Расследаванне гэтых спраў павінна праводзіцца органамі міліцыі ў адпаведнасці з дзеючымі крымінальна-працэсуальнымі кодэксамі саюзных рэспублік.

# АБ АДМЕНЕ СУДОВАЙ АДКАЗНАСЦІ РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ ЗА САМАВОЛЬНЫ ЎХОД З ПРАДПРЫЕМСТВАЎ І З УСТАНОЎ І ЗА ПРАГУЛ БЕЗ УВАЖЛІВАЙ ПРЫЧЫНЫ

**Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 25 красавіка 1956 г.**

*(«Ведамасці Вярхоўнага Савета СССР» 1956 г. № 10)*

(Вытрымка)

У выніку росту свядомасці працоўных, павышэння іх матэрыяльнага добрабыту і культурнага ўзроўню ўмацавалася дысцыпліна на прадпрыемствах і ва ўстановах. У гэтых умовах існуючая судовая адказнасць рабочых і служачых за самавольны ўход з прадпрыемстваў і з устаноў і за неаднаразовы або працяглы прагул без уважлівай прычыны не выклікаецца неабходнасцю і можа быць заменена мерамі дысцыплінарнага і грамадскага ўздзеяння.

Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР пастанаўляе:

1. Адмяніць судовую адказнасць рабочых і служачых за самавольны ўход з прадпрыемстваў і з устаноў і за неаднаразовы або працяглы прагул без уважлівай прычыны.

2. Вызваліць ад адбывання пакарання асоб, асуджаных за самавольны ўход з прадпрыемстваў і з устаноў і за прагул без уважлівай прычыны.

3. Спыніць судавядзеннем усе справы аб самавольным уходзе з прадпрыемстваў і з устаноў і аб прагулах, не разгледжаныя судамі да выдання гэтага Указа.

4. Зняць судзімасць з грамадзян, раней асуджаных і адбыўшых пакаранне за самавольны ўход з прадпрыемстваў і з устаноў і за прагул, а таксама вызваленых ад пакарання на падставе гэтага Указа.

8. Лічыць страціўшымі сілу:

а) Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 26 чэрвеня 1940 г. «Аб пераходзе на васьмігадзінны рабочы дзень, на сямідзённы рабочы тыдзень і аб забароне самавольнага ўходу рабочых і служачых з прадпрыемстваў і ўстаноў», за выключэннем арт. арт. 1 і 2 Указа;

б) Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 17 ліпеня 1940 г. «Аб забароне самавольнага ўходу з работы трактарыстаў і камбайнераў, якія працуюць у машынна-трактарных станцыях»;

в) Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 19 кастрычніка 1940 г. «Аб парадку абавязковага пераводу інжынераў, тэхнікаў, майстроў, служачых і кваліфікаваных рабочых з адных прадпрыемстваў і ўстаноў у другія»;

г) Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 14 ліпеня 1951 г. «Аб замене судовай адказнасці рабочых і служачых за прагул, апрача выпадкаў неаднаразовага і працяглага прагулу, мерамі дысцыплінарнага і грамадскага ўздзеяння»;

д) Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 13 лістапада 1952 г. «Аб унясенні змен і дадаткаў ва Указы Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 17 ліпеня 1940 г. «Аб забароне самаволь-

нага ўходу з работы трактарыстаў і камбайнераў, якія працуюць у машынна-трактарных станцыях», і ад 19 кастрычніка 1940 г. «Аб парадку абавязковага пераводу інжынераў, тэхнікаў, майстроў, служачых і кваліфікаваных рабочых з адных прадпрыемстваў і ўстаноў у другія».

## АБ ЗАМЕНЕ КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ ЗА САМАВОЛЬНЫ ПРАЕЗД У ТАВАРНЫХ ПАЯЗДАХ МЕРАМІ АДМІНІСТРАЦЫЙНАГА ЎЗДЗЕЯННЯ

**Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 11 сакавіка 1955 г.**

*(«Ведамасці Вярхоўнага Савета СССР» 1955 г. № 5)*

Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР пастанаўляе:

1. Адмяніць крымінальную адказнасць за самавольны праезд у таварных паяздах.

2. Устанавіць, што самавольны праезд у таварных паяздах выклікае штраф у размеры да 100 рублёў, які накладаецца ў адміністрацыйным парадку.

3. Асоб, асуджаных, але не адбыўшых пакаранне за самавольны праезд у таварных паяздах, ад далейшага адбывання пакарання вызваліць.

Зняць судзімасць з асоб, асуджаных за гэтыя дзеянні.

4. Лічыць страціўшым сілу артыкул 1 Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 9 красавіка 1941 года «Аб крымінальнай адказнасці за самавольны праезд у таварных паяздах і за самавольнае без патрэбы спыненне поезда стоп-кранам».

## АБ АДМЕНЕ УКАЗА ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР «АБ ЗАБАРОНЕ ПРОДАЖУ, АБМЕНУ І ВОДПУСКУ НА СТАРАНУ АБСТАЛЯВАННЯ І МАТЭРЫЯЛАЎ І АБ АДКАЗНАСЦІ ПА СУДУ ЗА ГЭТЫЯ НЕЗАКОННЫЯ ДЗЕЯННІ»

**Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 13 мая 1955 г.**

*(«Ведамасці Вярхоўнага Савета СССР» 1955 г. № 8)*

Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР пастанаўляе:

1. Адмяніць Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 10 лютага 1941 г. «Аб забароне продажу, абмену і водпуску на старану абсталявання і матэрыялаў і аб адказнасці па суду за гэтыя незаконныя дзеянні».

2. Асоб, асуджаных, але не адбыўшых пакаранне за продаж, абмен і водпуск на старану абсталявання і матэрыялаў, ад далейшага адбывання пакарання вызваліць.

Зняць судзімасць з асоб, асуджаных за гэтыя дзеянні.

3. Даручыць Совету Міністраў СССР устанавіць парадак пераразмеркавання і рэалізацыі лішняга, невыкарыстоўваемага абсталявання і матэрыялаў, маючы на ўвазе значна расшырыць правы Міністраў СССР, начальнікаў галоўных упраўленняў міністэрстваў СССР і дырэктараў прадпрыемстваў у выкарыстанні ўказанага абсталявання і матэрыялаў.

## АБ АДМЕНЕ КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ ЦЯЖАРНЫХ ЖАНЧЫН ЗА АБОРТ

**Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 5 жніўня 1954 г.**

*(«Ведамасці Вярхоўнага Совета СССР» 1954 г. № 15)*

1. Адмяніць крымінальную адказнасць у адносінах цяжарных жанчын, якія робяць сабе аборт, устаноўленую артыкулам 4-м Пастановы ЦВК СССР і СНК СССР ад 27 чэрвеня 1936 года, захаваўшы ўстаноўленую гэтай пастановай крымінальную адказнасць асоб, якія робяць незаконныя аборты, і асоб, якія прымушаюць жанчын рабіць аборт.

2. Прапанаваць Прэзідыумам Вярхоўных Советаў саюзных рэспублік прывесці крымінальнае законадаўства ў адпаведнасць з даным Указам.

## АБ АДМЕНЕ ЗАБАРОНЫ АБОРТАЎ

**Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 23 лістапада 1955 г.**

*(«Ведамасці Вярхоўнага Совета СССР» 1955 г. № 22)*

Мерапрыемствы па заахвочванню мацярынства і аховы дзяцінства, якія праводзяцца Совецкай дзяржавай, і няспынны рост свядомасці і культурнасці жанчын, прымаючых актыўны ўдзел ва ўсіх галінах народнагаспадарчага жыцця краіны, дазваляюць у цяперашні час адмовіцца ад забароны абортаў у законадаўчым парадку.

Зніжэнне ліку абортаў можа быць у далейшым забяспечана шляхам далейшага расшырэння дзяржаўных мер заахвочвання мацярынства, а таксама мер выхаваўчага і растлумачальнага характару.

Адмена забароны абортаў таксама дасць магчымасць ліквідаваць вялікую шкоду, якая наносіцца здароўю жанчын абортамі, што робяцца па-за лячэбнымі ўстановамі і часта невуцкімі асобамі.

У мэтах прадастаўлення жанчыне магчымасці самой вырашаць пытанне аб мацярынстве, а таксама папярэджання шкоды, якая наносіцца здароўю жанчын пазабальнічнымі абортамі, Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР п а с т а н а ў л я е:

1. Адмяніць артыкул 1 Пастановы ЦВК і СНК СССР ад 27 чэрвеня 1936 года аб забароне абортаў.

2. Аперацыю штучнага перарывання цяжарнасці дапусціць толькі ў бальніцах і іншых лячэбных установах згодна з інструкцыяй Міністра аховы здароўя СССР.

3. Захаваць устаноўленую крымінальную адказнасць як урачоў, так і асоб, якія не маюць спецыяльнай медыцынскай адукацыі і робяць аборты па-за бальніцамі або іншымі лячэбнымі ўстановамі.

## АБ АДКАЗНАСЦІ ЗА ДРОБНАЕ ХУЛІГАНСТВА

**Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 30 снежня 1956 г.**

*(«Советская Белоруссия» № 4 ад 5 студзеня 1957 г.)*

У мэтах узмацнення барацьбы з дробным хуліганствам, якое выражаецца ў парушэнні грамадскага парадку і спакою, вымаўленні брыдкіх слоў і іншых непрыстойных учынках, якія зневажаюць гонар і годнасць савецкіх грамадзян, Прэзідыум Вярхоўнага Совета Беларускай ССР пастанаўляе:

1. Устанавіць, што дробнае хуліганства выклікае арышт на тэрмін ад трох да пятнаццаці сутак, калі гэтыя дзеянні па свайму характару не выклікаюць пакарання, прадугледжанага артыкулам 107 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР.

2. Матэрыялы аб дробным хуліганстве разглядаюцца народным суддзёй аднаасобна на працягу сутак пасля паступлення іх у суд з органаў міліцыі з выклікам асобы, якая зрабіла хуліганскі ўчынак, і ў неабходных выпадках сведкаў.

Пастанова народнага суддзі аб арышце за дробнае хуліганства прыводзіцца ў выкананне неадкладна і абскарджанню не падлягае.

3. Арыштаваныя за дробнае хуліганства трымаюцца ў камеры папярэдняга зняволення або ў турме з выкарыстаннем на фізічных работах; за час знаходжання пад арыштам заработная плата па месцу пастаяннай работы ім не выплачваецца.

## АБ ПАРАДКУ ДАТЭРМІНОВАГА ВЫЗВАЛЕННЯ АД ПАКАРАННЯ АСУДЖАНЫХ ЗА ЗЛАЧЫНСТВЫ, ЗРОБЛЕНЫЯ ВА ЎЗРОСЦЕ ДА 18 ГОД

**Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 24 красавіка 1954 г.**

Улічваючы, што адбыццё ўсяго тэрміну пакарання зняволенымі, асуджанымі за злачынствы, зробленыя імі ва ўзросце да 18 год, і цвёрда стаўшымі на шлях выпраўлення, не выклікаецца неабходнасцю, Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР пастанаўляе:

Устанавіць, што асобы, асуджаныя да пазбаўлення волі за злачынствы, зробленыя імі ва ўзросце да 18 год, даказаўшыя сваё выпраўленне прыкладнымі паводзінамі і добрасумленнымі адносінамі да працы і навучання ў месцах зняволення, могуць быць вызвалены ад далейшага пакарання датэрмінова, пасля адбыцця імі

не менш адной трэці вызначанага судом тэрміну пазбаўлення волі, або ім можа быць скарочан тэрмін пакарання.

Разгляд спраў аб датэрміновым вызваленні ўказаных асоб або аб скарачэнні ім тэрміну пакарання робіцца судамі па месцу ўтрымання зняволеных па прадстаўленню адміністрацыі месц зняволення.

Справа аб скарачэнні тэрміну пакарання можа разглядацца судом пасля адбыцця асуджаным не менш шасці месяцаў пазбаўлення волі.

## АБ УВЯДЗЕННІ УМОЎНА-ДАТЭРМІНОВАГА ВЫЗВАЛЕННЯ З МЕСЦ ЗНЯВОЛЕННЯ

**Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 14 ліпеня 1954 г.**

(Вытрымка)

Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР пастанаўляе:

**1.** Увесці ўмоўна-датэрміновае вызваленне асуджаных з месц зняволення.

**2.** Да асоб, якія асуджаны да адбыцця пакарання ў месцах зняволення і даказалі сваё выпраўленне сумленнымі адносінамі да працы і прыкладнымі паводзінамі, пасля адбыцця імі не менш двух трэцей тэрміну пакарання можа быць прыменена ўмоўна-датэрміновае вызваленне.

**3.** Умоўна-датэрміновае вызваленне выражаецца або ў вызваленні ад далейшага адбывання меры пакарання, або ў замене яе больш мяккай мерай пакарання і рашаецца судом па месцу ўтрымання асуджанага, на падставе прадстаўлення адміністрацыі месц зняволення.

**4.** Калі датэрмінова вызвалены зробіць на працягу неадбытага тэрміну пакарання новае злачынства, за якое можа быць назначана пазбаўленне волі, то суду прадастаўляецца права далучэння неадбытай ім часткі тэрміну да той меры пакарання, якая будзе назначана судом за новае злачынства.

У гэтым выпадку агульны тэрмін пазбаўлення волі павінен ўстанаўлівацца ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

## АБ АМНІСТЫІ

**Пастанова Прэзідыума ЦВК СССР ад 2 лістапада 1927 г. (ЗЗ № 61)**

У выкананне маніфеста ЦВК Саюза ССР 15 кастрычніка 1927 г. і ў азнаменаванне дзесяцігоддзя Кастрычніцкай рэвалюцыі Прэзідыум ЦВК Саюза ССР пастанаўляе:

**1.** Усім асуджаным да вышэйшай меры сацыяльнай аховы (расстрэлу), за выключэннем асоб, выключаных з амністыі арт. 10 маніфеста ЦВК Саюза ССР 15 кастрычніка 1927 г., па справах, па якіх прыгаворы яшчэ не прыведзены ў выкананне, замяніць расстрэл дзесяцігадовым пазбаўленнем волі са строгай ізаляцыяй і канфіскацыяй маёмасці.

2. Асуджаных судамі да пазбаўлення волі на тэрміны да шасці месяцаў уключна вызваліць неадкладна ад утрымання пад вартай і ад іншых звязаных з прыгаворамі дадатковых мер соцыяльнай аховы.

Працоўных, чырвонаармейцаў і чырвонафлотцаў, асуджаных судамі ўпершыню да пазбаўлення волі на тэрміны да аднаго года ўключна, неадкладна вызваліць ад утрымання пад вартай і ўсіх дадатковых звязаных з прыгаворамі мер соцыяльнай аховы.

3. Працоўных, асуджаных да пазбаўлення волі на больш працяглыя тэрміны, вызваліць ад далейшага ўтрымання пад вартай і дадатковых звязаных з прыгаворамі мер соцыяльнай аховы, калі яны асуджаны ўпершыню і адбылі палавіну тэрміну, назначанага судовым прыгаворам, а тых з іх, хто не адбыў палавіны тэрміну, вызваліць пасля сканчэння палавіны тэрміну.

Усіх астатніх асуджаных да пазбаўлення волі на больш працяглыя тэрміны вызваліць ад далейшага ўтрымання пад вартай і дадатковых звязаных з прыгаворамі мер соцыяльнай аховы, калі яны адбылі дзве трэці ўстаноўленага судовым прыгаворам тэрміну.

Ільготы, указаныя ў гэтым артыкуле, не распаўсюджваюцца на актыўных членаў палітычных партый, якія ставяць сабе мэтай зніш- чэнне совецкага ладу, а таксама на асоб, асуджаных за злоснае хабарніцтва і злосныя растраты.

4. Вызваліць ад далейшага ўтрымання пад вартай усіх працоўных, асуджаных па прыгавору судоў або адміністрацыйных органаў за контррэволюцыйную дзейнасць, якая мела месца ў час грамадзянскай вайны па 1 студзеня 1923 года.

Усе незакончаныя судавядзеннем справы гэтага роду падлягаюць спыненню. Выключэнні з гэтага правіла могуць мець месца толькі па пастановах ЦВК Саюза ССР або цэнтральных выканаўчых камітэтаў саюзных рэспублік.

5. Вызваліць ад адбывання, у выглядзе дадатковай меры соцыяльнай аховы, высылкі і ссылкі ўсіх працоўных, асуджаных па суду ўпершыню і адбыўшых асноўную меру соцыяльнай аховы, а таксама зняць з асуджаных накладзенае на іх умоўнае асуджэнне.

6. У адносінах асоб, асуджаных органамі Аб'еднанага дзяржаўнага палітычнага ўпраўлення, апрача асоб, выключаных згодна з арт. 10 маніфеста з гэтай амністыі, спыніць далейшае прымяненне вызначаных для іх мер соцыяльнай аховы пасля адбыцця двух трэцей устаноўленага для іх вызначэннем Аб'еднанага дзяржаўнага палітычнага ўпраўлення тэрміну.

Асоб-жа, асуджаных органамі Аб'еднанага дзяржаўнага палітычнага ўпраўлення за дзяржаўныя злачынствы і ўзброены разбой, вызваліць пасля адбыцця трох чвэрцей устаноўленага прыгаворам тэрміну.

7. Зняць з асобага ўліку ўсіх былых афіцэраў і ваенных чыноўнікаў белых армій.

8. Вызваліць ад прымусовых работ усіх грамадзян, прыгавораных да гэтай меры соцыяльнай аховы ў адміністрацыйным або судовым парадку.

9. Зняць накладзеныя ў судовым або адміністрацыйным парадку і неспагнаныя штрафы да 100 руб. уключна.

Штрафы, накладзеныя за няўзнос падаткаў, знімаюцца ў памеры і парадку, які вызначаецца Пастановай ЦВК Саюза ССР 2 лі-

стапада 1927 г. аб зняцці нядоімак, штрафаў і пені па падатках і рэнце з маламаёмных слаёў насельніцтва.

10. Зняць усякае паражэнне правоў з працоўных, асуджаных упершыню, калі яны адбылі асноўную меру социяльнай аховы або былі датэрмінова вызвалены.

11. Зняць судзімасць у адносінах працоўных, асуджаных упершыню і адбыўшых к дню выдання гэтай пастановы аб амністыі асноўную меру социяльнай аховы, або датэрмінова вызваленых асоб, або прыгавораных да ўмоўнага асуджэння ці да прымусовых работ.

12. Спыніць усе следчыя справы па злачынствах, зробленых працоўнымі ўпершыню, за якія крымінальнымі кодэксамі саюзных рэспублік прадугледжана ў выглядзе меры социяльнай аховы пазбаўленне волі або прымусовыя работы на тэрмін да аднаго года.

У адносінах-жа астатніх грамадзян спыніць усе следчыя справы па зробленых імі злачынствах, за якія прадугледжана пазбаўленне волі да шасці месяцаў або прымусовыя работы на тэрмін да шасці месяцаў.

13. Гэтая пастанова падлягае прымяненню судамі і адміністрацыйнымі органамі Саюза ССР і саюзных рэспублік таксама па ўсіх справах аб злачынствах, зробленых да выдання гэтай пастановы аб амністыі, прыгаворы па якіх яшчэ не вынесены.

14. Правядзенне ў жыццё гэтай пастановы даручыць прэзідыумам цэнтральных выканаўчых камітэтаў саюзных рэспублік праз падведамасныя ім органы на працягу месячнага тэрміну з дня яго апублікавання.

У адносінах спраў, падсудных судовым установам і адміністрацыйным органам Саюза ССР, тое-ж абавязацельства ўскласці на Вярхоўны Суд і Пракуратуру Вярхоўнага Суда СССР і Аб'еднанае дзяржаўнае палітычнае ўпраўленне, па прыналежнасці.

## АБ АМНІСТЫІ У СУВЯЗІ З ПЕРАМОГАЙ НАД ГІТЛЕРАЎСКАЙ ГЕРМАНІЯЙ

**Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 7 ліпеня 1945 г.**

*(«Ведамасці Вярхоўнага Совета СССР» 1945 г. № 39)*

У азнаменаванне пераможнага завяршэння вайны з гітлераўскай Германіяй Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР пастанаўляе:

1. Вызваліць ад пакарання:

а) асуджаных да пазбаўлення волі на тэрмін не звыш трох год і да больш мяккіх мер пакарання;

б) асуджаных за самавольны ўход з прадпрыемстваў ваеннай прамысловасці і іншых прадпрыемстваў, на якія распаўсюджана дзеянне Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 снежня 1941 года;

в) ваеннаслужачых, асуджаных з адтэрміноўкай выканання прыгавору ў парадку заўвагі 2 да артыкула 28 Крымінальнага ко-

дэкса РСФСР[1]) і адпаведных артыкулаў крымінальных кодэксаў іншых саюзных рэспублік;

г) асоб, асуджаных за воінскія злачынствы па артыкулах $193^{2}$, $193^{5}$, $193^{6}$, $193^{7}$, $193^{9}$, $193^{10}$, $193^{10а}$, $193^{14}$, $193^{15}$ і $193^{16}$ Крымінальнага кодэкса РСФСР[2]) і адпаведных артыкулах крымінальных кодэксаў іншых саюзных рэспублік.

2. Скараціць напалавіну застаўшыся тэрмін пакарання асобам, асуджаным да пазбаўлення волі на тэрмін звыш трох год, апрача асуджаных за контррэвалюцыйныя злачынствы, крадзяжы соцыялістычнай уласнасці (закон ад 7 жніўня 1932 г.), бандытызм, фальшываманецтва, наўмыснае забойства і разбой.

3. Зняць судзімасць:

а) з асуджаных да пазбаўлення волі на тэрмін не звыш аднаго года і да больш мяккіх мер пакарання;

б) з асуджаных па Указу Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 снежня 1941 года;

в) з ваеннаслужачых, указаных у пункце «в» артыкула 1 гэтага Указа.

4. Спыніць вядзеннем усе следчыя справы і справы, не разгледжаныя судамі, аб зробленых да выдання гэтага Указа злачынствах, за якія ў законе ўстаноўлена пакаранне не звыш трох год пазбаўлення волі, аб самавольным уходзе з прадпрыемстваў ваеннай прамысловасці і прыроўненых да іх, а таксама аб воінскіх злачынствах, указаных у пункце «г» артыкула 1 гэтага Указа.

Па справах аб астатніх злачынствах суд, калі прызнае неабходным выбраць меру пакарання не звыш трох год пазбаўлення волі, — вызваляе падсуднага ад пакарання; калі-ж прызнае неабходным выбраць меру пакарання звыш трох год пазбаўлення волі, — скарачае тэрмін пакарання ў адпаведнасці з артыкулам 2 гэтага Указа.

5. Зняць усе неспагнаныя адміністрацыйныя штрафы і ўсе не прыведзеныя ў выкананне адміністрацыйныя спагнанні, прадугледжаныя п. «а» артыкула 4 Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 22 чэрвеня 1941 г. «Аб ваенным становішчы», за дзеянні, зробленыя да выдання гэтага Указа.

6. Не прымяняць амністыі да асоб, неаднаразова асуджаных за растраты, пакражы, грабяжы і хуліганства.

## АБ АМНІСТЫІ

**Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 27 сакавіка 1953 г.**

*(«Ведамасці Вярхоўнага Совета СССР» 1953 г. № 4)*

У выніку ўмацавання совецкага грамадскага і дзяржаўнага ладу, павышэння добрабыту і культурнага ўзроўню насельніцтва, росту свядомасці грамадзян, іх сумленных адносін да выканання свайго грамадскага абавязку ўмацаваліся законнасць і соцыялі-

---

[1]) Артыкул 32 КК БССР.

[2]) Артыкулы 165, 168, 169, 170, 172, 173, $173^{1}$, 177, 178, 179 КК БССР.

стычны правапарадак, а таксама значна скарацілася злачыннасць у краіне.

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР лічыць, што ў гэтых умовах не выклікаецца неабходнасцю далейшае ўтрыманне ў месцах зняволення асоб, якія зрабілі злачынствы, не маючыя вялікай небяспекі для дзяржавы, і сваімі добрасумленнымі адносінамі да працы даказаўшых, што яны могуць вярнуцца да сумленнага працоўнага жыцця і стаць карыснымі членамі грамадства.

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР п а с т а н а ў л я е:

1. Вызваліць з месц зняволення і ад іншых мер пакарання, не звязаных з пазбаўленнем волі, асоб, асуджаных на тэрмін да 5 год уключна.

2. Вызваліць з месц зняволення асуджаных, незалежна ад тэрміну пакарання, за службовыя і гаспадарчыя злачынствы, а таксама за воінскія злачынствы, прадугледжаныя арт. арт. $193^{4}$ п. «а», $193^{7}$, $193^{8}$, $193^{10}$, $193^{10а}$, $193^{14}$, $193^{15}$, $193^{16}$ і $193^{17}$ п. «а» Крымінальнага кодэкса РСФСР [1]) і адпаведнымі артыкуламі крымінальных кодэксаў іншых саюзных рэспублік.

3. Вызваліць з месц зняволення, незалежна ад тэрміну пакарання, асуджаных: жанчын, якія маюць дзяцей ва ўзросце да 10 год, і цяжарных жанчын; няпоўналетніх ва ўзросце да 18 год; мужчын старэй 55 год і жанчын старэй 50 год, а таксама асуджаных, якія хварэюць цяжкай невылечнай хваробай.

4. Скараціць напалавіну тэрмін пакарання асуджаных да пазбаўлення волі на тэрмін звыш 5 год.

5. Спыніць вядзеннем усе следчыя справы і справы, не разгледжаныя судамі, аб зробленых да выдання гэтага Указа злачынствах:

а) за якія ў законе прадугледжана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін да 5 год або іншыя меры пакарання, не звязаныя з утрыманнем у месцах зняволення;

б) службовых, гаспадарчых і воінскіх злачынствах, пералічаных у артыкуле 2 гэтага Указа;

в) зробленых асобамі, указанымі ў артыкуле 3 гэтага Указа.

Па іншых справах аб злачынствах, зробленых да выдання гэтага Указа, за якія ў законе прадугледжана пазбаўленне волі на тэрмін звыш 5 год, суд, калі прызнае неабходным выбраць меру пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі не звыш 5 год, вызваляе падсуднага ад пакарання, калі-ж суд прызнае неабходным выбраць меру пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін звыш 5 год, — скарачае тэрмін пакарання напалавіну.

6. Зняць судзімасць і паражэнне ў выбарчых правах з грамадзян, раней судзімых і адбыўшых пакаранне або датэрмінова вызваленых ад пакарання на падставе гэтага Указа.

7. Не прымяняць амністыі да асоб, асуджаных на тэрмін больш 5 год за контррэвалюцыйныя злачынствы, буйныя крадзяжы соцыялістычнай уласнасці, бандытызм і наўмыснае забойства.

8. Прызнаць неабходным перагледзець крымінальнае заканадаўства СССР і саюзных рэспублік, маючы на ўвазе замяніць крымінальную адказнасць за некаторыя службовыя, гаспадарчыя, бытавыя і іншыя менш небяспечныя злачынствы мерамі адміністра-

[1]) Артыкулы 167 п. «а», 170, 171, 173, $173^{1}$, 177, 178, 179, 180 п. «а» КК БССР.

цыйнага і дысцыплінарнага парадку, а таксама змякчыць крымінальную адказнасць за асобныя злачынствы.

Даручыць Міністэрству юстыцыі СССР у месячны тэрмін распрацаваць адпаведныя прапановы і ўнесці іх на разгляд Савета Міністраў Саюза ССР для прадстаўлення ў Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР.

## АБ АМНІСТЫІ СОВЕЦКІХ ГРАМАДЗЯН, ЯКІЯ СУПРАЦОЎНІЧАЛІ З АКУПАНТАМІ Ў ПЕРЫЯД ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ 1941—1945 гг.

**Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 17 верасня 1955 г.**

*(«Ведамасці Вярхоўнага Совета СССР» 1955 г. № 17)*

Пасля пераможнага завяршэння Вялікай Айчыннай вайны совецкі народ дабіўся новых вялікіх поспехаў ва ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва і далейшага ўмацавання сваёй соцыялістычнай дзяржавы.

Улічваючы гэта, а таксама спыненне стану вайны паміж Совецкім Саюзам і Германіяй і кіруючыся прынцыпам гуманнасці, Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР лічыць магчымым прымяніць амністыю ў адносінах тых совецкіх грамадзян, якія ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг. па маладушнасці або несвядомасці аказаліся ўцягнутымі ў супрацоўніцтва з акупантамі.

У мэтах прадастаўлення гэтым грамадзянам магчымасці вярнуцца да сумленнага працоўнага жыцця і стаць карыснымі членамі соцыялістычнага грамадства Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР пастанаўляе:

**1.** Вызваліць з месц зняволення і ад іншых мер пакарання асоб, асуджаных на тэрмін да 10 год пазбаўлення волі ўключна за зробленыя ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг. пасобніцтва ворагу і іншыя злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі $58^1$, $58^3$, $58^4$, $58^6$, $58^{10}$, $58^{12}$ Крымінальнага кодэкса РСФСР [1]) і адпаведнымі артыкуламі крымінальных кодэксаў іншых саюзных рэспублік.

**2.** Скараціць напалавіну назначанае судом пакаранне асуджаным на тэрмін звыш 10 год за злачынствы, пералічаныя ў артыкуле першым гэтага Указа.

**3.** Вызваліць з месц зняволення незалежна ад тэрміну пакарання асоб, асуджаных за службу ў нямецкай арміі, паліцыі і спецыяльных нямецкіх фарміраваннях.

Вызваліць ад далейшага адбывання пакарання асоб, накіраваных за такія злачынствы ў ссылку і высылку.

**4.** Не прымяняць амністыі да карнікаў, асуджаных за забойствы і катаванні совецкіх грамадзян.

**5.** Спыніць вядзеннем усе следчыя справы і справы, не разгледжаныя судамі аб злачынствах, зробленых у перыяд Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг., прадугледжаных артыкуламі

---

[1]) Артыкулы 63, 65, 66, 68, 72, 73 КК БССР.

$58^{1}$, $58^{3}$. $58^{4}$, $58^{6}$, $58^{10}$, $58^{12}$ Крымінальнага кодэкса РСФСР[1]) і адпаведнымі артыкуламі крымінальных кодэксаў іншых саюзных рэспублік. за выключэннем спраў аб асобах, указаных у артыкуле чацвёртым гэтага Указа.

6. Зняць судзімасць і паражэнне ў правах з грамадзян, вызваленых ад пакарання на падставе гэтага Указа.

Зняць судзімасць і паражэнне ў правах з асоб, раней судзімых і адбыўшых пакаранне за злачынствы, пералічаныя ў артыкуле першым гэтага Указа.

7. Вызваліць ад адказнасці савецкіх грамадзян, што знаходзяцца за граніцай, якія ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг. здаліся ў палон ворагу або служылі ў нямецкай арміі, паліцыі і спецыяльных нямецкіх фарміраваннях.

Вызваліць ад адказнасці і тых савецкіх грамадзян, што цяпер знаходзяцца за граніцай, якія займалі ў час вайны кіруючыя пасады ў створаных акупантамі органах паліцыі, жандармерыі і прапаганды, у тым ліку і ўцягнутых у антысавецкія арганізацыі ў пасляваенны перыяд, калі яны выкупілі сваю віну далейшай патрыятычнай дзейнасцю ў карысць радзімы або з'явіліся з пакаяннем.

У адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам разглядаць як змякчаючую віну акалічнасць яўку з пакаяннем савецкіх грамадзян, што знаходзяцца за граніцай, якія зрабілі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг. цяжкія злачынствы супроць Савецкай дзяржавы. Устанавіць, што ў гэтых выпадках пакаранне, назначанае судом, не павінна перавышаць пяці год ссылкі.

8. Даручыць Савету Міністраў СССР прыняць меры да аблягчэння ўезду ў СССР савецкім грамадзянам, якія знаходзяцца за граніцай, а таксама членам іх сем'яў, незалежна ад грамадзянства, і іх працаўладкаванню ў Савецкім Саюзе.

## АБ ДАТЭРМІНОВЫМ ВЫЗВАЛЕННІ ГЕРМАНСКІХ ГРАМАДЗЯН, АСУДЖАНЫХ СУДОВЫМІ ОРГАНАМІ СССР ЗА ЗРОБЛЕНЫЯ ІМІ ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРОЦЬ НАРОДАЎ САВЕЦКАГА САЮЗА Ў ПЕРЫЯД ВАЙНЫ

**Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 28 верасня 1955 г.**

*(«Ведамасці Вярхоўнага Савета СССР» 1955 г. № 17)*

Прымаючы пад увагу хадайніцтва Прэзідэнта і Урада Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі ад 27 ліпеня г. г. і хадайніцтва Урада Германскай Федэральнай Рэспублікі аб датэрміновым вызваленні і звароце на радзіму германскіх грамадзян, якія адбываюць пакаранне за злачынствы, зробленыя імі супроць народаў Савецкага Саюза ў перыяд вайны, улічваючы, што з часу заканчэння вайны прайшло больш дзесяці год і ваенныя злачынцы, асуджаныя за свае злачынствы, ужо адбылі значную частку тэрміну пакарання, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР пастанаўляе:

---

[1]) Артыкулы 63, 65, 66, 68, 72, 73 КК БССР.

1. Вызваліць датэрмінова ад адбывання пакарання 8 877 германскіх грамадзян і рэпатрыіраваць іх у залежнасці ад месцажыхарства ў Германскую Дэмакратычную Рэспубліку і ў Германскую Федэральную Рэспубліку.

2. Перадаць 749 германскіх грамадзян як ваенных злачынцаў адпаведна ў распараджэнне Урада Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі і Урада Германскай Федэральнай Рэспублікі, у залежнасці ад месцажыхарства гэтых грамадзян, паколькі Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР не палічыў магчымым датэрмінова вызваліць указаных асоб ад далейшага адбывання пакарання з прычыны асаблівай цяжкасці зробленых імі злачынстваў супроць савецкага народа.

## АБ ПРЫМЯНЕННІ УКАЗА ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР АД 17 ВЕРАСНЯ 1955 ГОДА «АБ АМНІСТЫІ СОВЕЦКІХ ГРАМАДЗЯН, ЯКІЯ СУПРАЦОЎНІЧАЛІ З АКУПАНТАМІ Ў ПЕРЫЯД ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ 1941—1945 гг.» ДА ВАЕННАСЛУЖАЧЫХ СОВЕЦКАЙ АРМІІ І ФЛОТУ, ЯКІЯ ЗДАЛІСЯ Ў ПАЛОН ВОРАГУ Ў ПЕРЫЯД АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

**Пастанова Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 20 верасня 1956 г.**

*(«Ведамасці Вярхоўнага Совета СССР» 1956 г. № 19)*

У сувязі з паступіўшымі запытаннямі аб прымяненні Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 17 верасня 1955 года «Аб амністыі совецкіх грамадзян, якія супрацоўнічалі з акупантамі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг.» да былых ваеннаслужачых Совецкай Арміі і Флоту, якія здаліся ў палон ворагу ў перыяд Айчыннай вайны, Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР растлумачвае, што Указ ад 17 верасня 1955 г. распаўсюджваецца і на былых ваеннаслужачых Совецкай Арміі і Флоту, асуджаных за здачу ў палон ворагу па артыкулах $193^{22}$ і $58^{1б}$ Крымінальнага кодэкса РСФСР [1]) і адпаведных артыкулах крымінальных кодэксаў іншых саюзных рэспублік. У адпаведнасці з гэтым указаныя асобы падлягаюць вызваленню ад далейшага адбыцця пакарання са зняццем судзімасці і паражэння ў правах. Знімаецца таксама судзімасць і паражэнне ў правах з асоб, асуджаных за гэтыя злачынствы, адбыўшых пакаранне або вызваленых датэрмінова.

Усе следчыя справы, а таксама не разгледжаныя судамі справы на асоб, прыцягнутых да адказнасці за здачу ў палон ворагу ў перыяд Айчыннай вайны, падлягаюць спыненню.

---

[1]) Артыкулы 185 і $63^{2}$ КК БССР.

## АБ АМНІСТЫІ ЯПОНСКІХ ГРАМАДЗЯН, АСУДЖАНЫХ У СОВЕЦКІМ САЮЗЕ

**Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 13 снежня 1956 г.**

*(«Ведамасці Вярхоўнага Совета СССР» 1956 г. № 24)*

У сувязі са спыненнем стану вайны і ўстанаўленнем мірных адносін паміж Саюзам Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік і Японіяй, а таксама кіруючыся прынцыпам гуманнасці, Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР пастанаўляе:

1. Вызваліць з месц зняволення ўсіх асуджаных японскіх грамадзян.

2. Дазволіць усім вызваленым з месц зняволення японскім грамадзянам вярнуцца на радзіму.

## АБ АДМЕНЕ ЗАБАРОНЫ ПРЫМЯНЯЦЬ АМНІСТЫЮ ДА АСОБ, АСУДЖАНЫХ ЗА ЗЛАЧЫНСТВЫ, ПРАДУГЛЕДЖАНЫЯ ПАСТАНОВАМІ ЦВК І СНК СССР ад 7 і 22 ЖНІЎНЯ 1932 г.

**Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 8 верасня 1953 г.**

Адмяніць забарону прымяняць амністыю да асоб, асуджаных за злачынствы, прадугледжаныя Пастановай ЦВК і СНК СССР ад 7 жніўня 1932 г. «Аб ахове маёмасці дзяржаўных прадпрыемстваў, калгасаў і кааперацыі і ўмацаванні грамадскай (соцыялістычнай) уласнасці» і Пастановай ЦВК і СНК СССР ад 22 жніўня 1932 г. «Аб барацьбе са спекуляцыяй».

## ПААРТЫКУЛЬНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

### Да артыкула 7

**§ 1.** Савецкі суд, прымяняючы меры крымінальнага пакарання, не толькі карае злачынцаў, але таксама мае сваёй мэтай выпраўленне і перавыхаванне злачынцаў (з артыкула 3 Закону аб судовым ладзе СССР, саюзных і аўтаномных рэспублік).

### Да артыкула 10

**§ 1.** 1. Звярнуць увагу судовых органаў на сур'ёзныя недахопы ў прымяненні арт. 9 Асноўных пачаткаў крымінальнага заканадаўства СССР і саюзных рэспублік (арт. 13 КК РСФСР[1]) і адпаведных артыкулаў КК іншых саюзных рэспублік), згодна з якім не выклікаюць крымінальнай адказнасці дзеянні, прадугледжаныя крымінальным законам, калі яны зроблены ў стане неабходнай абароны супроць пасягання на савецкую ўладу або на асобу і правы абараняючайся або іншай асобы.

Такога роду дзеянні, якія вынікаюць з неад'емнага права грамадзян на абарону, не толькі не змяшчаюць саставу злачынства, як не маючыя грамадскай небяспекі, але, наадварот, садзейнічаюць умацаванню належнага сацыялістычнага правапарадку.

2. Растлумачыць судам, што згодна з законам выкананне дзеянняў па ахове ад нападу выклікае для таго, хто абараняецца, крымінальную адказнасць толькі ў выпадку перавышэння межаў неабходнай абароны, г. зн. калі па справе будзе ўстаноўлена, што той, хто абараняецца, прыбегнуў да аховы такімі сродкамі і метадамі, прымяненне якіх яўна не выклікалася ні характарам нападу, ні рэальнай абстаноўкай, і без неабходнасці нанёс нападаўшаму цяжкую шкоду.

3. Вырашаючы пытанне аб наяўнасці або адсутнасці адзнак перавышэння межаў неабходнай абароны, суды не павінны механічна зыходзіць з патрабавання суразмернасці сродкаў аховы і

[1]) Артыкул 10 КК БССР.

сродкаў нападу, а таксама суразмернасці інтэнсіўнасці аховы і нападу, а павінны ўлічваць як ступень і характар небяспекі, якая пагражала таму, хто абараняецца, так і яго сілы і магчымасці па адбіццю нападу.

Пры вырашэнні гэтага пытання неабходна ўлічваць тую акалічнасць, што ў выпадках душэўнага хвалявання, выкліканага нападам, яго раптоўнасцю, той, хто абараняецца, не заўсёды ў стане дакладна ўзважыць характар небяспекі і выбраць суразмерныя сродкі аховы, што, натуральна, можа іншы раз выклікаць і больш цяжкія вынікі, за якія ён не можа несці адказнасць.

4. Роўным чынам, суды не павінны фармальна падыходзіць да прызнання перавышэння межаў неабходнай абароны па матывах нясвоечасовасці яе прымянення. Стан неабходнай абароны наступае не толькі ў самы момант нападу, але і ў тых выпадках, калі ў наяўнасці рэальная пагроза нападу. Гэтак-жа стан неабходнай абароны не можа лічыцца ўстароненым і ў тым выпадку, калі акт самаабароны адбыўся непасрэдна за актам, хоць-бы і скончанага нападу, але па акалічнасцях справы для таго, хто абараняецца, не быў ясны момант заканчэння нападу.

Не прызнаюцца законам зробленымі ў стане неабходнай абароны дзеянні асобы, якая падверглася нападу, выклікаўшыя цяжкія вынікі для нападаўшага, толькі ў тым выпадку, калі яны былі зроблены ўжо пасля таго, як напад быў прадухілен або скончан і ў прымяненні сродкаў абароны ўжо яўна мінула неабходнасць, і, такім чынам, гэтыя дзеянні выступілі як акт помсты — самачыннай расправы.

У гэтых выпадках адказнасць наступае на агульных падставах як за наўмыснае злачынства.

5. Растлумачыць, што дзеянні, зробленыя пацярпеўшым або іншымі асобамі па затрыманню злачынца з мэтай дастаўлення яго ў адпаведныя органы ўлады, як правамерныя, прыроўніваюцца да неабходнай абароны.

Крымінальная адказнасць за дзеянні па затрыманню злачынца, якія выклікалі для яго цяжкія вынікі, можа наступіць толькі пры ўмовах, указаных у п. 2 гэтай пастановы, г. зн. за дзеянні, зробленыя з перавышэннем межаў неабходнай абароны.

6. Суды павінны адрозніваць стан неабходнай абароны і так званай уяўнай абароны, калі асоба не падвяргаецца рэальнаму нападу і толькі памылкова мяркуе наяўнасць такога нападу. У гэтым выпадку, у залежнасці ад акалічнасцей справы, асоба можа адказваць або за неасцярожныя дзеянні, або наогул не падлягае прыцягненню да крымінальнай адказнасці. Аднак неабходна мець на ўвазе, што ўяўная абарона выключае крымінальную адказнасць толькі ў тых выпадках, калі ўся абстаноўка здарэння давала дастатковыя падставы меркаваць асобе, якая прымяніла сродкі абароны, што яна падвяргалася рэальнаму нападу і не ўсведамляла памылковасць свайго меркавання.

Разам з тым, у тых выпадках, калі пры ўяўнай абароне асоба нанесла пацярпеўшаму шкоду, якая яўна перавышае межы дапушчальнай шкоды ва ўмовах адпаведнага рэальнага нападу, яна падлягае адказнасці як за перавышэнне межаў неабходнай абароны.

7. Звярнуць увагу судоў, што пры разглядзе ўказаных спраў яны павінны з асаблівай стараннасцю аналізаваць усе абставіны,

паколькі такога роду справы нярэдка маюць значную складанасць (з пастановы Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 23 кастрычніка 1956 г. № 8).

### Да артыкула 14

**§ 1.** Няпоўналетніх, пачынаючы з дванаццацігадовага ўзросту, выкрытых ва ўчыненні дзеянняў (развінчванні рэек, падкладванні на рэйкі розных прадметаў і да т. п.), якія могуць выклікаць крушэнне паяздоў, прыцягваць да судовай адказнасці з прымяненнем усіх мер крымінальнага пакарання [Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 10 снежня 1940 г. («Ведамасці Вярхоўнага Совета СССР» 1940 г. № 52)].

**§ 2.** Устанавіць, што за злачынствы, не прадугледжаныя ў Пастанове ЦВК і Соўнаркома СССР ад 7 красавіка 1935 г. «Аб мерах барацьбы са злачыннасцю сярод няпоўналетніх» і Указе Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 10 снежня 1940 г. «Аб крымінальнай адказнасці няпоўналетніх за дзеянні, якія могуць выклікаць крушэнне паяздоў», няпоўналетнія прыцягваюцца да крымінальнай адказнасці, пачынаючы з 14-гадовага ўзросту [Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 31 мая 1941 г. («Ведамасці Вярхоўнага Совета СССР» 1941 г. № 25)].

**§ 3.** З прадстаўлення Пракурора СССР і пастановы Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 20 сакавіка 1941 года Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР устанаўлівае, што Вярхоўны Суд СССР пры разглядзе спраў аб злачынствах няпоўналетніх, прадугледжаных Пастановай ЦВК і СНК СССР ад 7 красавіка 1935 г. «Аб мерах барацьбы са злачыннасцю сярод няпоўналетніх», выходзіць з таго, што няпоўналетнія падлягаюць судовай адказнасці толькі ў тых выпадках, калі яны зрабілі злачынства наўмысна.

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР растлумачвае, што такое прымяненне Вярхоўным Судом СССР Пастановы ЦВК і СНК СССР ад 7 красавіка 1935 г. «Аб мерах барацьбы са злачыннасцю сярод няпоўналетніх» не адпавядае тэксту закону, уводзіць не прадугледжаныя законам абмежаванні і знаходзіцца ў супярэчнасці з артыкулам 6 «Асноўных пачаткаў крымінальнага законадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік», згодна з якім крымінальная адказнасць наступае як у выпадку ўчынення злачынства наўмысна, так і па неасцярожнасці.

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР прапануе Вярхоўнаму Суду СССР прымяняць Пастанову ЦВК і СНК СССР ад 7 красавіка 1935 года «Аб мерах барацьбы са злачыннасцю сярод няпоўналетніх» у дакладнай адпаведнасці з тэкстам закону і з дзеючым крымінальным законадаўствам СССР.

Гэтым Указам не адмяняецца ўстаноўлены для няпоўналетніх парадак адбывання пакарання ў дзіцячых папраўча-працоўных калоніях [Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 7 ліпеня 1941 г. («Ведамасці Вярхоўнага Совета СССР» 1941 г. № 32)].

**§ 4.** Гл. § 3 да Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 4 чэрвеня 1947 г. (стар. 67).

**§ 5.** Гл. Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 24 красавіка 1954 г. «Аб парадку датэрміновага вызвалення ад пакарання асуджаных за злачынствы, зробленыя ва ўзросце да 18 год» (стар. 79).

## Да артыкула 17

§ 1. 1. Крымінальнае законадаўства СССР і саюзных рэспублік прадугледжвае асобыя формы злачынных дзеянняў, якія робяцца не ў які-небудзь пэўны момант, а маюць працяглы характар. Прыкладамі такіх злачынстваў могуць служыць наступныя: злосны неплацеж падатку пасля сканчэння тэрміну выплаты, які працягваецца да вынясення прыгавору і прыняцця прымусовых мер спагнання (арт. 58 КК УССР, арт. 60 КК РСФСР); ухіленне ад прызыву да адбывання сапраўднай ваеннай службы або ад мабілізацыі (арт. арт. 18 і 19 Палажэння аб дзяржаўных злачынствах); самавольнае пакіданне часці або пасады ваеннаслужачымі (арт. арт. 8 і 9 Палажэння аб воінскіх злачынствах); удзел у контррэвалюцыйнай арганізацыі (арт. 11 Палажэння аб дзяржаўных злачынствах); неданясенне аб рыхтуемым або зробленым контррэволюцыйным злачынстве (арт. 12 Палажэння аб дзяржаўных злачынствах).

Такога роду злачынствы, якія носяць назву працяглых, характарызуюцца працяглым злачынным станам, г. зн. бесперапынным ажыццяўленнем саставу пэўнага злачыннага дзеяння. Гэты злачынны стан можа быць у выніку якога-небудзь дзеяння (самавольная адлучка) або наступіць з прычыны невыканання дзеянняў, прадпісаных законам пад страхам крымінальнай адказнасці. Такім чынам, працяглае злачынства можна вызначыць як дзеянне, што цягне за сабой бесперапынна ажыццяўляемы злачынны стан, або як працяглае невыкананне дзеянняў, патрабуемых законам пад страхам крымінальнага праследавання.

2. Вельмі падобны да злачынстваў працяглых злачынствы працягваемыя, г. зн. злачынствы, якія складваюцца з раду тоесных злачынных дзеянняў, накіраваных да агульнай мэты і складаючых у сваёй сукупнасці адзінае злачынства. Да гэтых злачынстваў адносяцца, напрыклад, контррэволюцыйны сабатаж, які выражаецца ў неаднаразовым невыкананні пэўных абавязкаў або ў наўмысна нядбайным іх выкананні з мэтай аслаблення ўлады ўрада, шкодніцтва і эканамічная контррэволюцыя.

3. Як працяглыя, так і працягваемыя злачынствы характарызуюцца працягласцю злачынных дзеянняў, і пры прымяненні амністыі і даўнасці да гэтых злачынстваў неабходна дакладна ўстанаўліваць пачатак і канец іх выканання.

4. Працяглае злачынства пачынаецца з моманту наступлення злачыннага стану і канчаецца ў момант спынення гэтага злачыннага стану з прычыны дзеяння самога віנаватага, накіраванага да спынення злачынства, або наступлення падзей, якія перашкаджаюць учыненню злачынства (умяшанне органаў улады).

Таму амністыя прымяняецца да тых працяглых злачынстваў, якія скончыліся да яе выдання. Да працяглых-жа злачынстваў, якія працягваліся пасля выдання амністыі, такая не прымяняецца.

Тэрмін даўнасці ў адносінах працяглых злачынстваў вылічваецца з часу спынення злачыннага стану.

5. Пачаткам працягваемага злачынства трэба лічыць выкананне першага дзеяння з ліку некалькіх тоесных дзеянняў, якія складаюць адно працягваемае злачынства, а канцом — момант выканання апошняга злачыннага дзеяння.

У адпаведнасці з гэтым амністыя прымяняецца да працягваемых дзеянняў, якія зусім закончыліся да выдання амністыі, і не

прымяняецца, калі хоць-бы адно са злачынных дзеянняў, утвараючых працягваемае дзеянне, зроблена было пасля выдання амністыі.

Роўным чынам, тэрмін даўнасці ў адносінах працягваемых дзеянняў вылічваецца з моманту выканання апошняга злачыннага дзеяння з ліку складаючых працягваемае злачынства (пастанова Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 4 сакавіка 1929 г.).

## Да артыкула 21

**§ 1.** Згодна з п. «в» арт. 10[1] «Асноўных пачаткаў крымінальнага законадаўства СССР і саюзных рэспублік», не маючымі судзімасці прызнаюцца, у прыватнасці, асобы, асуджаныя на тэрмін не звыш шасці месяцаў пазбаўлення волі і да больш мяккага пакарання, калі яны на працягу трох год з дня адбыцця пакарання не зрабілі новага злачынства. Па сэнсу арт. 13 «Асноўных пачаткаў крымінальнага законадаўства СССР і саюзных рэспублік», які пералічвае паслядоўна віды пакарання па ступені іх цяжкасці, вынікае, што прымусовыя работы без пазбаўлення волі (папраўча-працоўныя работы) з'яўляюцца больш мяккім пакараннем у параўнанні з пазбаўленнем волі. Такі вывад пацвярджаецца таксама ўказаннямі арт. 29 КК РСФСР[1]) і адпаведных артыкулаў КК іншых саюзных рэспублік, згодна з якімі залік папярэдняга зняволення вызначаецца з разліку трох дзён папраўча-працоўных работ за адзін дзень пазбаўлення волі. З указанага вынікае, што адзін год папраўча-працоўных работ павінен лічыцца роўназначным чатыром месяцам пазбаўлення волі. Таму пры вырашэнні пытання аб пагашэнні судзімасці суды павінны кіравацца тым, што асуджаныя да папраўча-працоўных работ да аднаго года ўключна прызнаюцца не маючымі судзімасці пасля сканчэння трох год з дня адбыцця пакарання, калі яны на працягу гэтага часу не зрабілі новага злачынства (з пастановы Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 10 лютага 1940 г. № 2/2/у).

**§ 2.** У судовай практыцы ўзнікла пытанне аб умовах пагашэння судзімасці для асуджаных, якія былі па тых ці іншых падставах вызвалены ад пакарання да сканчэння тэрміну, установленага прыгаворам.

У сувязі з гэтым Пленум Вярхоўнага Суда СССР пастанаўляе даць судам наступныя ўказанні:

Калі ўстаноўленае прыгаворам пакаранне зніжана актам амністыі або вызначэннем вышэйстаячага суда, а таксама вызначэннем аб умоўна-датэрміновым вызваленні, умовы пагашэння судзімасці, установленыя арт. 55 КК РСФСР[2]) і адпаведнымі артыкуламі КК іншых саюзных рэспублік, прымяняюцца, зыходзячы з паніжанай меры пакарання, а не той, якая была назначана прыгаворам. Цячэнне тэрміну, установленага для пагашэння судзімасці, пачынаецца з дня адбыцця асуджаным зніжанай меры пакарання.

У тым выпадку, калі асуджаны вызваляецца ад далейшага адбыцця пакарання па амністыі без зняцця судзімасці або вызначэн-

---

[1]) Артыкул 47 КК БССР.
[2]) Артыкул 21 КК БССР.

нем аб умоўна-датэрміновым вызваленні, тэрміны, пагашаючыя судзімасць, павінны вылічвацца, выходзячы з размеру пакарання, фактычна адбытага к дню выдання акта аб амністыі або вынясення вызначэння аб умоўна-датэрміновым вызваленні. З гэтага-ж часу пачынаецца цячэнне тэрмінаў, пагашаючых судзімасць.

Ва ўсіх астатніх выпадках датэрміновага вызвалення ад пакарання (напрыклад, па хваробе, па заліку і інш.) тэрміны, якія пагашаюць судзімасць, вызначаюцца з назначанага, а не фактычна адбытага пакарання; цячэнне-ж тэрміну, які пагашае судзімасць, павінна пачынацца з дня фактычнага вызвалення ад пакарання (пастанова Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 20 сакавіка 1953 г. № 4 у рэд. 17 верасня 1954 г.).

§ 3. Асобы, якія прызнаюцца не маючымі судзімасці на падставе арт. 10[1] «Асноўных пачаткаў крымінальнага заканадаўства СССР і саюзных рэспублік» (ЗЗ 1927 г. № 12, арт. 122) і на падставе арт. 55 КК РСФСР[1]) і адпаведных артыкулаў крымінальных кодэксаў іншых саюзных рэспублік, а таксама асобы, судзімасць з якіх знята ў парадку агульнай або прыватнай амністыі, маюць права ў анкетах на пытанне аб мінулай судзімасці адказваць: «не судзіўся». Ніякай адказнасці за дачу такога адказу ўказаныя асобы падвяргацца не могуць (загад НКЮ СССР 1937 г. № 79).

### Да артыкула 27

§ 1. Прадаставіць права Вярхоўнаму Суду Саюза ССР, вярхоўным судам саюзных рэспублік, краявым і абласным судам, чыгуначным і водна-транспартным судам[2]) і ваенным трыбуналам у адносінах асоб, асуджаных за найбольш небяспечныя злачынствы, вызначаць пазбаўленне волі ў выглядзе зняволення ў турму.

Накіраванне асуджаных да пазбаўлення волі для адбывання пакарання ў турму можа мець месца толькі пры той умове, калі ў прыгаворы названых судоў ёсць спецыяльнае ўказанне аб зняволенні асуджанага ў турму [арт. 1 Пастановы ЦВК і СНК СССР ад 8 жніўня 1936 г. (ЗЗ СССР № 44, арт. 370)].

### Да артыкула 29

§ 1. Пазбаўленне грамадзянства СССР можа мець месца:

а) па прыгавору суда — у выпадках, прадугледжаных законам;

б) у сілу асобага ў кожным выпадку Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР [арт. 7 Закону аб грамадзянстве СССР («Ведамасці Вярхоўнага Савета СССР» 1938 г. № 11)].

### Да артыкула 30

§ 1. Дзеючым крымінальным заканадаўствам СССР і саюзных рэспублік для барацьбы са шпіянажам, шкодніцтвам, са спробамі арганізацыі выбухаў, крушэнняў, падпалаў з чалавечымі ахвярамі

---

[1]) Артыкул 21 КК БССР.

[2]) Законам ад 12 лютага 1957 года, прынятым Вярхоўным Саветам СССР, лінейныя і акруговыя транспартныя суды на чыгуначным і водным транспарце ліквідаваны.

і іншых дыверсійных актаў устаноўлены ў якасці мер крымінальнага пакарання — пазбаўленне волі на тэрмін не звыш дзесяці год, а для найбольш цяжкіх відаў дзяржаўных злачынстваў — вышэйшая мера пакарання (расстрэл) [1]).

У мэтах далейшай барацьбы з такога роду злачынствамі і прадастаўлення суду магчымасці выбіраць па гэтых злачынствах не толькі вышэйшую меру пакарання (расстрэл), але і пазбаўленне волі на больш працяглыя тэрміны, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт СССР пастанаўляе:

1. У змяненне арт. 18 «Асноўных пачаткаў крымінальнага заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік» устанавіць у якасці меры крымінальнага пакарання пазбаўленне волі на тэрмін не звыш 25 год.

2. Прапанаваць цэнтральным выканаўчым камітэтам саюзных рэспублік прывесці сваё заканадаўства ў адпаведнасць з гэтай Пастановай (Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР ад 2 кастрычніка 1937 г.).

## Да артыкула 33

**§ 1.** 1. У адмену Пастановы Прэзідыума ЦВК Саюза ССР ад 27 лютага і 27 лістапада 1932 г. па гэтаму пытанню ўстанавіць ніжэйнаступныя гранічныя нормы ўтрыманняў з заработнай платы асоб, якія адбываюць прымусовыя работы:

а) асобы, асуджаныя на тэрмін да шасці месяцаў, адбываюць, як правіла, прымусовыя работы па месцу сваёй работы або службы з утрыманнем з іх да 25% заработку;

б) асобы, асуджаныя да прымусовых работ на тэрмін звыш шасці месяцаў, у адносінах якіх у прыгаворы ёсць спецыяльнае ўказанне аб адбыванні прымусовых работ не па месцу службы, адбываюць гэтыя работы ў спецыяльных установах або прадпрыемствах папраўча-працоўных органаў з тым, што яны прыроўніваюцца ў адносінах харчавання, забеспячэння і ўзнагароджання да знаходзячыхся ў закрытых месцах пазбаўлення волі.

2. Прызнаць магчымым адбыванне прымусовых работ асуджанымі калгаснікамі ў калгасах, членамі якіх яны з'яўляюцца.

Належачае на падставе арт. 1 гэтай Пастановы ўтрыманне з заработку асуджаных да прымусовых работ у адносінах калгаснікаў рабіць з іх даходаў, устанавіўшы адзіныя сярэднія нормы, па саюзных рэспубліках, ацэнкі кошту працадня ў калгасе.

Даручыць ЦВК саюзных рэспублік даць указанне НКЮстам устанавіць, па ўзгадненню з адпаведнымі наркаматамі, прыкладную ацэнку даходаў у працаднях па данай рэспубліцы [2]).

3. Прапанаваць урадам саюзных рэспублік унесці ў месячны

---

[1]) Гл. зноску 3 да заўвагі артыкула 27, стар. 7.

[2]) Згодна з загадам НКЮ СССР, НКУС СССР і НКЗема СССР ад 21 красавіка 1943 г. № 30/284/162/м утрыманні павінны рабіцца ад грашовай і натуральнай часткі даходу калгасніка з усёй сумы працадзён, выпрацаваных ім у час адбывання пакарання. (Са зменамі, унесенымі загадам МЮ СССР, МУС СССР і МСГ СССР ад 11 верасня 1954 г. № 59/471/368).

тэрмін змяненні ў сваё законадаўства ў адпаведнасці з гэтай Пастановай (Пастанова Прэзідыума ЦВК СССР ад 27 сакавіка 1933 г.).

**§ 2.** З прычыны таго, што пры асуджэнні да папраўча-працоўных работ утрыманне з заработнай платы з'яўляецца састаўной часткай пакарання, размер гэтых утрыманняў у межах, устаноўленых законам, г. зн. да 25 %,— таксама як і тэрмін пакарання— павінен устанаўлівацца прыгаворам суда як па папраўча-працоўных работах па месцу работы, так і па папраўча-працоўных работах на агульных падставах (пастанова Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 8 чэрвеня 1942 г. № 11/м/3/у са зменамі, унесенымі пастановай Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 4 снежня 1953 г.).

## Да артыкула 35

**§ 1.** 1. Пры арышце асоб, узнагароджаных ордэнамі і медалямі, забраныя ў іх следчымі органамі ордэны, медалі і дакументы да іх здаюцца разам з іншымі каштоўнасцямі для захоўвання ў фінансавыя часткі месц зняволення, дзе ўтрымліваюцца арыштаваныя, да канчатковага вырашэння па справе.

2. Пры спыненні справы або вынясенні судом апраўдальнага прыгавору ордэны, медалі і дакументы да іх вяртаюцца ўладальнікам адміністрацыяй месц зняволення.

3. Пры вынясенні абвінаваўчага прыгавору, у тых выпадках, калі асуджаныя не пазбаўлены ўзнагарод па прыгавору суда або калі суды не лічаць мэтазгодным уваходзіць у Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР з прадстаўленнем аб пазбаўленні ўзнагарод, ордэны, медалі і дакументы да іх разам з іншымі каштоўнасцямі, забранымі ў асуджаных, накіроўваюцца па месцу адбывання імі пакарання і вяртаюцца адміністрацыяй месц зняволення ўладальнікам пры вызваленні іх з-пад варты.

4. Пры асуджэнні за цяжкія злачынствы, калі асуджаныя пазбаўлены медаляў па прыгавору суда або калі суды ўваходзяць у Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР з прадстаўленнем аб пазбаўленні ордэнаў і медаляў, забраныя ў асуджаных ордэны, медалі і дакументы да іх павінны накіроўвацца разам з копіямі прыгавораў у Канцылярыю Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР.

5. Згодна з пастановамі Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 19 кастрычніка 1946 г. і 16 сакавіка 1950 г. пры асуджэнні ўзнагароджанага да пазбаўлення волі з паражэннем у правах, прадугледжаных пп. «а», «б» і «в» арт. 31 Крымінальнага кодэкса РСФСР[1]) і адпаведнымі артыкуламі крымінальных кодэксаў іншых саюзных рэспублік, суд можа, на падставе арт. 33 ч. II Крымінальнага кодэкса РСФСР[2]) і адпаведных артыкулаў крымінальных кодэксаў іншых саюзных рэспублік, сваім прыгаворам пазбавіць асуджанага наступных медаляў: «За абарону Ленінграда», «За абарону Одэсы», «За абарону Севастопаля», «За абарону Сталінграда», «За абарону Масквы», «За абарону Каўказа», «За абарону Совецкага Запаляр'я», «За перамогу над Германіяй у Вялікай

---

[1]) Пункты «а», «б» і «в» артыкула 34 КК БССР.

[2]) Частка 2 артыкула 35 КК БССР.

Айчыннай вайне 1941—1945 гг.», «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.», «За перамогу над Японіяй», «За ўзяцце Будапешта», «За ўзяцце Кенігсберга», «За ўзяцце Вены», «За ўзяцце Берліна», «За вызваленне Белграда», «За вызваленне Варшавы», «За вызваленне Прагі», «За аднаўленне вугальных шахт Данбаса», «У памяць 800-годдзя Масквы», «30 год Савецкай Арміі і Флоту» і «За аднаўленне прадпрыемстваў чорнай металургіі поўдня».

Пазбаўленне асуджанага ордэнаў, а таксама ўсіх іншых медаляў можа рабіцца толькі Прэзідыумам Вярхоўнага Савета СССР (з пісьма МЮ СССР № П-14 ад 7 мая 1955 г.).

## Да артыкула 39

**§ 1.** Па агульнаму сэнсу савецкага крымінальнага заканадаўства пакаранне можа быць назначана судом толькі ў выпадку прызнання падсуднага вінаватым ва ўчыненні пэўнага злачынства. Так, згодна з арт. 6 «Асноўных пачаткаў крымінальнага заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік», меры пакарання могуць прымяняцца ў судовым парадку толькі да асоб, якія прадбачылі або павінны былі прадбачыць грамадска-небяспечны характар вынікаў сваіх дзеянняў. Такім чынам, па прамому сэнсу гэтага артыкула пакаранне можа быць прыменена судом пры наяўнасці віны наўмыснай або неасцярожнай толькі да асобы, якая зрабіла пэўнае грамадска-небяспечнае дзеянне або бяздзеянне. Такім чынам, у сілу ўказанага артыкула выключаецца магчымасць прымянення судом пакарання да асоб, якія не прызнаны вінаватымі ва ўчыненні таго або іншага пэўнага злачынства.

Роўным чынам і п. «д» арт. 6 «Асноў крымінальнага судаводства СССР і саюзных рэспублік» устанаўлівае, што крымінальнае праследаванне не можа быць узбуджана, а ўзбуджанае не можа быць працягнута і падлягае спыненню ва ўсякай стадыі працэсу пры адсутнасці саставу злачынства ў дзеяннях абвінавачваемага. Такім чынам, і па сэнсу гэтага закону, для прымянення ў судовым парадку пакарання неабходна наяўнасць пэўнага злачынства, зробленага абвінавачваемым.

Ад указанага агульнага правіла ёсць у Асноўных пачатках адступленне толькі ў адносінах ссылкі і высылкі. Згодна з арт. 22 Асноўных пачаткаў пакаранне ў выглядзе ссылкі або высылкі можа быць прыменена прыгаворам суда па прапанове пракуратуры да асоб, прызнаных сацыяльна-небяспечнымі, незалежна ад прыцягнення іх да судовай адказнасці за ўчыненне пэўнага злачынства, а таксама і ў тым выпадку, калі яны па абвінавачанню ва ўчыненні пэўнага злачынства будуць судом апраўданы. Указанае правіла ўзноўлена ў крымінальных кодэксах раду саюзных рэспублік (арт. 34 КК УССР, арт. 39 КК БССР, арт. 32 КК Турк. ССР, арт. 38 КК Уз. ССР, арт. 36 КК Груз. ССР, арт. 35 КК Арм. ССР).

Аднак гэтае адступленне ад агульных правіл савецкага крымінальнага заканадаўства павінна лічыцца адпаўшым у сувязі з выданнем у далейшым Закону аб судовым ладзе СССР, саюзных і аўтаномных рэспублік, які, устанаўліваючы ўмовы прымянення судом пакарання, не змяшчае ўказанага адступлення. Згодна

з п. «а» арт. 4 гэтага Закону, суды ў СССР ажыццяўляюць задачы правасуддзя шляхам разбору ў судовых пасяджэннях крымінальных спраў і прымянення ўстаноўленых законам мер пакарання да здраднікаў радзімы, шкоднікаў, раскрадальнікаў социялістычнай уласнасці і іншых ворагаў народа, а таксама да грабежнікаў, злодзеяў, хуліганаў і іншых злачынцаў. Такім чынам, па сэнсу гэтага Закону пакаранне можа быць прыменена судом толькі да асоб, якія зрабілі пэўныя злачынствы, прыкладны, але не вычарпальны пералік якіх прыведзен у самім законе.

У выніку выкладзенага і ўлічваючы, што з выданнем Закону аб судовым ладзе, як больш позняга закону, павінны лічыцца страціўшымі сілу ўсе раней выданыя нормы, якія знаходзяцца з ім у супярэчнасці,— Пленум Вярхоўнага Суда СССР пастанаўляе даць судам наступнае ўказанне:

Устаноўленыя законам меры крымінальнага пакарання, у тым ліку ссылка і высылка, могуць быць прыменены ў судовым парадку па прыгавору суда толькі ў тым выпадку, калі падсудны прызнаецца тым-жа прыгаворам вінаватым ва ўчыненні пэўнага злачынства (пастанова Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 12 ліпеня 1946 г. № 8/5/у).

## Да артыкула 43

**§ 1.** Пералік маёмасці, якая не падлягае канфіскацыі па судовых прыгаворах.

Канфіскацыі не падлягае:

1) неабходныя для асуджанага і асоб, якія знаходзяцца на яго ўтрыманні, адзенне, бялізна, абутак, мэбля і іншыя прадметы хатняга ўжытку;

2) неабходныя прылады асабістай саматужнай і рамеснай працы асуджанага, а таксама неабходныя для асабістых прафесіянальных заняткаў асуджанага інструменты, дапаможнікі ўсякага роду і кнігі, калі асуджаны не пазбаўлен судом права на займанне данай прафесіяй;

3) сельскагаспадарчы жывы і мёртвы інвентар, а таксама запас корму для жывёлы, тое і другое ў колькасці, неабходнай для падтрымання працоўнай земляробчай гаспадаркі, прычым с перавышаючай гэтую колькасць маёмасці сялянскай гаспадаркі (двара) можа быць канфіскавана толькі доля, належачая асуджанаму за злачынства члену двара, дапушчальная да выдзялення згодна з дзеючымі ўзаконеннямі;

4) насенне, неабходнае для чарговых пасеваў (асенняга і веснавога) у працоўнай земляробчай гаспадарцы, і нязняты ўраджай, за выключэннем ураджаю з прамысловых садоў і агародаў, калі эксплуатацыя гэтых садоў і агародаў не носіць працоўнага характару;

5) жылыя і надворныя пабудовы ў сельскіх мясцовасцях, неабходныя для пражывання сям'і асуджанага, а таксама складаючыя неад'емную прыналежнасць сельскай гаспадаркі;

6) прадметы харчавання і паліва, неабходныя для асабістага спажывання асуджанага, яго сям'і і асоб, якія знаходзяцца на яго ўтрыманні, на працягу шасці месяцаў;

7) грашовыя сумы ў размеры, вызначаемым у парадку, указаным у заўвазе да гэтага артыкула;

8) паявыя ўзносы ў каапэратыўныя арганізацыі, таварыствы сельскагаспадарчага крэдыту і працоўныя арцелі [1]).

Заўвага 1. Колькасць і род прадметаў, якія не падлягаюць канфіскацыі, згодна з пп. 1 2, 3, 4, 6 і 7 гэтага артыкула, вызначаюцца законадаўствам саюзных рэспублік [15 чэрвеня 1927 г. (ЗЗ СССР 1927 г. № 35, арт. 365)].

Заўвага 2. У кулацкіх гаспадарках канфіскацыі не падлягае толькі тая маёмасць, на якую не можа быць звернута спагнанне па падатках [2]) [заўвага да арт. 17 Палажэння аб спагнанні падаткаў (ЗЗ СССР 1929 г. № 71, арт. 672)].

[Артыкул 25[1] «Асноўных пачаткаў крымінальнага законадаўства СССР і саюзных рэспублік» (ЗЗ СССР 1924 г. № 24, арт. 205)].

§ 2. У мэтах строгага захавання судамі соцыялістычнай законнасці і ліквідацыі недахопаў у судовай практыцы па прымяненню канфіскацыі маёмасці Пленум Вярхоўнага Суда СССР пастанаўляе даць судам наступныя ўказанні:

1. Звярнуць увагу судоў, што, прымяняючы канфіскацыю маёмасці ў якасці дадатковага пакарання ў выпадках, прадугледжаных законам, яны не павінны дапускаць фармальнага падыходу да вырашэння гэтага пытання і абавязаны ўлічваць у кожным асобным выпадку грамадскую небяспеку злачынства, ступень віны і асобу падсуднага.

У выпадку прымянення канфіскацыі суды павінны строга захоўваць патрабаванні закону пры вызначэнні маёмасці, якая падлягае канфіскацыі, і не дапускаць парушэння правоў грамадзян.

2. Растлумачыць, што ў выпадку ўмоўнага асуджэння, якое па закону прымяняецца пры наяўнасці асабліва змякчаючых акалічнасцей, назначэнне канфіскацыі маёмасці ў якасці дадатковага пакарання з'яўляецца, як правіла, нямэтазгодным.

3. Калі, зыходзячы з канкрэтных акалічнасцей справы, суд прызнае нямэтазгодным прымяненне канфіскацыі маёмасці пры асуджэнні за злачынства, па якому абавязковая канфіскацыя прадугледжана ў якасці дадатковага пакарання, — у прыгаворы павінны быць праведзены матывы прынятага судом рашэння па гэтаму пытанню.

4. Назначаючы дадатковае пакаранне ў выглядзе канфіскацыі маёмасці, суд павінен дакладна агаварыць размер канфіскацыі, каб пазбегнуць няяснасцей або сумненняў пры выкананні прыгавору.

У прыватнасці, калі суд пастанаўляе канфіскаваць частку маёмасці, у прыгаворы павінна быць дакладна ўказана, якая іменна частка ($^1/_2$, $^1/_3$ і г. д.) усёй маёмасці асуджанага падлягае канфіскацыі, або канкрэтна пералічаны канфіскуемыя прадметы. Пры гэтым замена канфіскацыі маёмасці грашовай сумай, роўнай кошту гэтай маёмасці, не дапускаецца.

---

[1]) У адпаведнасці з артыкулам 1 раздзела 2 Пастановы ЦВК і СНК СССР ад 4 ліпеня 1933 г. (ЗЗ СССР 1933 г. № 42, арт. 250) з п. 8 трэба выключыць словы «таварыствы сельскагаспадарчага крэдыту і працоўныя арцелі».

[2]) Палажэнне аб спагнанні падаткаў ад 2 кастрычніка 1925 г. з далейшымі зменамі адменена (ЗЗ СССР 1932 г. № 69, арт. 410 «б»; 1933 г. № 68, арт. 408; 1934 г. № 48, арт. 370).

Суды павінны мець на ўвазе, што пры канфіскацыі усёй маёмасці асуджанага канфіскацыя, згодна з арт. 40 КК РСФСР [1]) і адпаведнымі артыкуламі КК іншых саюзных рэспублік, накіроўваецца на асабістую ўласнасць асуджанага і на яго долю ў агульнай уласнасці і не можа быць накіравана на долю іншых асоб, якія валодаюць маёмасцю сумесна з асуджаным на праве агульнай уласнасці. Пры гэтым павінны быць улічаны правы і законныя інтарэсы членаў сям'і асуджанага, якія сумесна з ім пражывалі.

5. У выпадку накладання арышту на маёмасць у працэсе папярэдняга следства ў парадку арт. 121-а КПК РСФСР [2]) і адпаведных артыкулаў КПК іншых саюзных рэспублік суд, разглядаючы справу, павінен праверыць, ці захаваны патрабаванні арт. 25 [1] Асноўных пачаткаў крымінальнага заканадаўства аб маёмасці, якая не падлягае канфіскацыі, і ў выпадку ўключэння ў вопіс такой маёмасці абавязан сваім вызначэннем выключыць яе з вопісу і зняць арышт.

6. Суды павінны правяраць, ці сапраўды належыць падсуднаму апісаная маёмасць, і пры наяўнасці даных, якія сведчаць, што арышт накладзен на маёмасць, якая не належыць падсуднаму, суд, пры адсутнасці спрэчкі аб прыналежнасці гэтай маёмасці, у адпаведнасці з арт. арт. 69 і 331 КПК РСФСР [3]) і адпаведнымі артыкуламі КПК іншых саюзных рэспублік абавязан вынесці вызначэнне аб выключэнні такой маёмасці з вопісу, аб зняцці арышту і аб звароце яе законнаму ўладальніку.

7. Растлумачыць судам, што канфіскацыя можа быць накіравана толькі на тую маёмасць, якая належала асабіста падсуднаму або як доля ў агульнай уласнасці к моманту вынясення прыгавору.

У тых выпадках, калі пасля выканання прыгавору аб канфіскацыі ўсёй маёмасці будзе выяўлена неканфіскаваная маёмасць падсуднага, набытая ім да вынясення прыгавору, або хоць-бы і пасля гэтага, але на сродкі, якія падлягаюць канфіскацыі па прыгавору,— суд, які вынес прыгавор, або суд па месцу выканання апошняга выносіць па прадстаўленню пракурора вызначэнне аб накіраванні канфіскацыі на выяўленую маёмасць, калі апошняя можа быць канфіскавана па закону.

8. Пры выкананні прыгавораў, якімі, апрача канфіскацыі маёмасці, пастаноўлена таксама спагнанне з асуджанага сум у пакрыццё матэрыяльнай страты, нанесенай злачынствам,— у першую чаргу павінны быць спагнаны сумы для пакрыцця страты, а канфіскацыя накіроўваецца на астатнюю частку маёмасці, калі гэтая маёмасць па закону можа быць канфіскавана.

9. Растлумачыць судам, што ўказанне ў прыгаворы канкрэтна вызначанай маёмасці, якая падлягае канфіскацыі, не перашкаджае трэцім асобам магчымасці даказваць у іскавым парадку свае правы ўласнасці на гэтую маёмасць, таму што згодна з арт. 13 КПК РСФСР [4]) і адпаведнымі артыкуламі КПК іншых саюзных рэспублік уступіўшы ў законную сілу прыгавор крымінальнага суда аба-

---

[1]) Артыкул 43 КК БССР.

[2]) Артыкул 121-а КПК БССР.

[3]) Артыкулы 69 і 331 КПК БССР.

[4]) Артыкул 13 КПК БССР.

вязковы для грамадзянскага суда, які разглядае грамадзянскія вынікі злачынства толькі па пытанню аб тым, ці адбылося злачынства і ці зроблена яно падсудным. Таму суды павінны прымаць да свайго разгляду такія іскі, і раней вынесены прыгавор не звязвае грамадзянскі суд у вырашэнні ўзнікшай спрэчкі аб гэтай маёмасці.

Пры гэтым, калі прыгаворам суда па крымінальнай справе або грамадзянскім судом пры разглядзе іску аб выключэнні маёмасці з вопісу будзе ўстаноўлена, што ўключаная ў вопіс маёмасць набыта асуджаным злачынным шляхам або на сродкі, здабытыя ім злачынным шляхам, і толькі ў мэтах скрыцця яе ад канфіскацыі аформлена па фіктыўных здзелках на імя іншых асоб, то такога роду здзелкі павінны прызнавацца судамі несапраўднымі, а заснаваныя на такіх здзелках іскі не падлягаюць задавальненню.

10. Указаць судам, што адабранне дома ад уласніка ў выпадку яго канфіскацыі не пазбаўляе членаў сям'і асуджанага і іншых асоб права пражываць у доме ў якасці наймальнікаў і карыстацца жылой плошчай у межах жыллёвых норм. Высяленне членаў сям'і і іншых асоб з займаемай імі ў доме жылой плошчы можа мець месца толькі на агульных законных падставах.

11. Звярнуць увагу судоў, што яны павінны ажыццяўляць пастаянны кантроль за дзейнасцю судовых выканаўцаў па выкананню прыгавораў у частцы канфіскацыі маёмасці. У сувязі з гэтым устанавіць, што складаемы судовым выканаўцам вопіс маёмасці, на якую павінна быць накіравана канфіскацыя, падлягае зацвярджэнню народнага суддзі, у раёне дзеяння якога прыгавор у частцы канфіскацыі прыводзіцца ў выкананне.

Усе скаргі на няправільнае выкананне прыгавору ў частцы канфіскацыі маёмасці, а таксама ўсе сумненні і пытанні, якія ўзнікаюць па гэтаму поваду і не звязаны з прад'яўленнем грамадзянскага іску, вырашаюцца судом, вынесшым прыгавор, або судом па месцу выканання прыгавору ў парадку арт. арт. 461 і 462 КПК РСФСР[1]) і адпаведных артыкулаў КПК іншых саюзных рэспублік.

12. Указаць судам, што ў выпадку выключэння вышэйстаячым судом канфіскацыі з прыгавору суд, які вынес прыгавор, абавязан, незалежна ад просьбы асуджанага, пасля атрымання вызначэння вышэйстаячага суда накіраваць копію вызначэння фінансаваму органу, у распараджэнне якога паступіла канфіскаваная маёмасць, для выканання — звароту маёмасці або пакрыцця яе кошту.

Зварот маёмасці або пакрыццё яе кошту праводзіцца па правілах, указаных у «Палажэнні аб парадку ўліку і выкарыстання нацыяналізаванай, канфіскаванай, вымарачнай і безгаспадарнай маёмасці», зацверджаным Пастановай СНК СССР ад 17 красавіка 1943 года, і Інструкцыі Наркамфіна СССР ад 31 мая 1943 г.[2]).

У такім-жа парадку робіцца зварот маёмасці або пакрыццё яе кошту ў тых выпадках, калі наступным рашэннем суда выклю-

---

[1]) Артыкулы 461 і 462 КПК БССР.

[2]) Страціла сілу. Парадак уліку і выкарыстання канфіскаванай, безгаспадарнай і вымарачнай маёмасці рэгулюецца Інструкцыяй Міністэрства фінансаў СССР ад 30 студзеня 1956 г. № 35.

чана з вопісу маёмасць, на якую была ўжо распаўсюджана канфіскацыя ў парадку выканання прыгавору, уступіўшага ў законную сілу.

13. Растлумачыць судам, што ў тых выпадках, калі актам амністыі асуджаны падлягае поўнасцю вызваленню ад пакарання, амністыя распаўсюджваецца і на канфіскацыю маёмасці, калі к дню выдання акта аб амністыі яна не была прыведзена ў выкананне, г. зн. не была адабрана маёмасць, якая падлягае канфіскацыі.

14. Звярнуць увагу вышэйстаячых судоў і асабліва вярхоўных судоў саюзных рэспублік, што пры разглядзе спраў у касацыйным парадку і ў парадку нагляду яны павінны старанна правяраць, ці правільна прыменена канфіскацыя маёмасці, ці не дапушчана парушэнне закону пры вопісе, накладанні арышту на маёмасць, а таксама і пры выкананні прыгавору ў частцы канфіскацыі, і прымаць неабходныя меры па ахове інтарэсаў дзяржавы і аднаўленню парушаных правоў грамадзян (пастанова Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 29 верасня 1953 г. № 7).

### Да артыкулаў 53 і 54

**§ 1.** 1. Па прамому сэнсу арт. 33 «Асноўных пачаткаў крымінальнага заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік» пры вызначэнні меры сацыяльнай аховы ў выпадках, калі ў зробленым абвінавачваемым дзеянні ёсць адначасова адзнакі некалькіх злачынстваў (ідэальная сукупнасць), а таксама і калі абвінавачваемы прызнан вінаватым ва-ўчыненні некалькіх асобных злачынстваў (рэальная сукупнасць), суд павінен разглядаць усю сукупнасць зробленых абвінавачваемым злачынных дзеянняў як адно цэлае, якое характарызуе сабой павышаную ступень небяспекі асобы абвінавачваемага, што дае суду права прымянення да яго тых мер сацыяльнай аховы і ў тых межах, якія ўказаны ў артыкуле закону, прадугледжваючым у санкцыі ў якасці асноўнай меры сацыяльнай аховы найбольш суровую меру.

2. Пры такім указанні арт. 33 «Асноўных пачаткаў крымінальнага заканадаўства СССР і саюзных рэспублік» і адпаведных артыкулаў КК саюзных рэспублік суд аднолькава, як у выпадках ідэальнай сукупнасці, так і ў выпадках рэальнай сукупнасці, абавязан у канчатковым вывадзе прыгавору кваліфікаваць усю сукупнасць зробленых абвінавачваемым дзеянняў па артыкулу, які прадугледжвае ў сваёй санкцыі найбольш цяжкую асноўную меру сацыяльнай аховы, і, незалежна ад таго, патрабуе ці не патрабуе адпаведны рэспубліканскі КК папярэдняга вызначэння мер сацыяльнай аховы па кожнаму асобнаму злачынству, ставіць на сваё абмеркаванне пытанне, якая канкрэтная мера сацыяльнай аховы ў межах, указаных у артыкуле, што прадугледжвае найбольш строгую меру, павінна быць назначана асуджанаму па гэтаму іменна артыкулу за ўсю сукупнасць зробленых ім злачынных дзеянняў. Выбраная судом у гэтым парадку мера сацыяльнай аховы і будзе канчатковай мерай.

3. З таго-ж арт. 33 «Асноўных пачаткаў крымінальнага заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік» вынікае, што ўстанаўліваемы ім парадак вызначэння меры сацыяльнай аховы павінен прымяняцца толькі ў тых выпадках сукупнасці, калі ні па ад-

наму злачынству, уваходзячаму ў сукупнасць, яшчэ не было вынесена асобнага прыгавору і, такім чынам, калі суд разглядае справу па сутнасці ў адносінах усіх злачынстваў, якія ўваходзяць у сукупнасць.

4. Пры назначэнні, у выпадках сукупнасці, асноўнай меры сацыяльнай аховы па артыкулу, які прадугледжвае найбольш суровую меру, суд мае права далучыць да яе любую з дадатковых мер, у тым ліку і канфіскацыю, прадугледжаных у іншых артыкулах, па якіх кваліфікуюцца зробленыя асуджаным асобныя злачынныя дзеянні, уваходзячыя ў сукупнасць (пастанова 23 Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 4 сакавіка 1929 г.).

**§ 2.** У судовай практыцы ўзнікла пытанне, як трэба вызначаць пакаранне па сукупнасці па прынцыпу складання пакаранняў у тых выпадках, калі па прыгаворах, якія ўваходзяць у сукупнасць, меры пакарання назначаны ў выглядзе пазбаўлення волі і папраўча-працоўных работ.

У сувязі з гэтым Пленум Вярхоўнага Суда СССР пастанаўляе даць судам наступнае ўказанне:

У тых саюзных рэспубліках, крымінальныя кодэксы якіх не вырашаюць указанага вышэй пытання, пакаранне па сукупнасці ў выпадку неабходнасці прымянення прынцыпу складання пакаранняў вызначаецца ў адпаведнасці з арт. 29 КК РСФСР[1]) і адпаведнымі артыкуламі КК іншых саюзных рэспублік — шляхам замены папраўча-працоўных работ пазбаўленнем волі з разліку трох дзён папраўча-працоўных работ за адзін дзень пазбаўлення волі; атрыманы такім чынам тэрмін далучаецца да тэрміну пазбаўлення волі, назначанага па другому прыгавору, які ўваходзіць у сукупнасць (пастанова Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 22 студзеня 1942 г. № 2/4/у).

## Да артыкулаў 69, 71 і 75

**§ 1.** Улічваючы, што ў судовай практыцы мелі месца выпадкі няправільнага прымянення арт. арт. $58^7$, $58^9$ і $58^{14}$ Крымінальнага кодэкса РСФСР[2]) і адпаведных артыкулаў крымінальных кодэксаў іншых саюзных рэспублік, Пленум Вярхоўнага Суда СССР указвае, што па сэнсу гэтых артыкулаў прымяненне іх можа мець месца толькі ў тых выпадках, калі акалічнасцямі справы ўстаноўлена, што падсудны дзейнічаў з контррэвалюцыйнай мэтай (пастанова Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 31 снежня 1938 г.).

## Да артыкула $80^3$

**§ 1.** У сувязі з узнікшымі ў судовай практыцы пытаннямі аб кваліфікацыі злачынстваў, звязаных з рухам на аўтатранспарце, Пленум Вярхоўнага Суда СССР пастанаўляе даць судам наступныя ўказанні:

---

[1]) Артыкул 47 КК БССР.

[2]) Артыкулы 69, 71 і 75 КК БССР.

1. Парушэнне работнікамі аўтатранспарту правіл руху, якое пацягнула за сабой няшчасныя выпадкі з людзьмі або іншыя цяжкія вынікі, належыць кваліфікаваць па арт. $59^{3в}$ КК РСФСР [1]) і адпаведных артыкулах КК іншых саюзных рэспублік.

2. Парушэнне правіл руху, дапушчанае іншымі вадзіцелямі аўтамашын, якія не з'яўляюцца работнікамі аўтатранспарту, павінна кваліфікавацца:

а) парушэнне правіл руху, якое пацягнула за сабой няшчасныя выпадкі з людзьмі — смерць або цялесныя пашкоджанні, калі па справе ўстаноўлена, што вінаваты прадбачыў магчымасць наступлення такіх вынікаў і свядома дапускаў іх, павінна кваліфікавацца адпаведна як наўмыснае забойства або наўмыснае цялеснае пашкоджанне па адпаведных артыкулах крымінальных кодэксаў саюзных рэспублік;

б) у тых выпадках, калі смерць або цялеснае пашкоджанне пацярпеўшага з'явіліся вынікам парушэння правіл ваджэння, дапушчанага без указаных акалічнасцей, а ў выніку неасцярожнасці,— такое парушэнне падлягае кваліфікацыі па адпаведных артыкулах крымінальных кодэксаў саюзных рэспублік як забойства або прычыненне цялеснага пашкоджання па неасцярожнасці;

в) у астатніх выпадках парушэнне правіл руху, якое пацягнула іншыя цяжкія вынікі, павінна кваліфікавацца па арт. $75^1$ КК РСФСР [2]) і адпаведных артыкулах КК іншых саюзных рэспублік.

3. Пры разглядзе спраў указанай катэгорыі судовыя органы павінны ўлічваць павышаную грамадскую небяспеку гэтых злачынстваў, прымяняючы строга і паслядоўна меры пакарання, прадугледжаныя законам, да асоб, вінаватых у парушэннях правіл руху на аўтатранспарце (пастанова Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 15 верасня 1950 г. № 16/12/у са зменамі, унесенымі пастановай Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 10 красавіка 1957 г. № 3).

**§ 2.** У судовай практыцы ўзнікла пытанне, як трэба кваліфікаваць дзеянні шафёраў, якія знаходзяцца на службе ў дзяржаўных і грамадскіх установах і прадпрыемствах і выкарыстоўваюць давераныя ім аўтамашыны ў карыслівых мэтах.

У сувязі з гэтым Пленум Вярхоўнага Суда СССР пастанаўляе даць судам наступныя ўказанні:

Перавозка пасажыраў або грузаў шафёрамі на давераных ім па службе аўтамашынах з мэтай атрымання асабістай матэрыяльнай выгады павінна кваліфікавацца па артыкулу 169 ч. 2 КК РСФСР [3]) і адпаведных артыкулах КК іншых саюзных рэспублік.

Асобныя выпадкі незаконнага выкарыстання аўтамашын, якія не нанеслі істотнай страты ўстанове або прадпрыемству, павінны вырашацца ў дысцыплінарным парадку і не выклікаць крымінальнай адказнасці (пастанова Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 9 лютага 1951 г. № 2/6/у са зменамі, унесенымі пастановамі Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 20 сакавіка 1953 г. № 5 і ад 17 верасня 1954 г.).

---

[1]) Артыкул $80^3$ КК БССР.

[2]) Артыкул $108^1$ КК БССР.

[3]) Артыкул 250 п. «б» КК БССР.

## Да артыкула 87

§ 1. Кваліфікаванай кантрабандай прызнаецца:

а) перамяшчэнне грузаў без ведама таможных устаноў пры дапамозе спецыяльна для гэтай мэты прызначаных перавозачных сродкаў;

б) скрыццё кантрабандных грузаў у памяшканнях, асобна для іх скрыцця прыстасаваных;

в) кантрабанда, звязаная з падробліваннем таможных дакументаў або прыкрыццём грузу дакументамі, што адносяцца да іншага грузу [23 студзеня 1930 г. (ЗЗ СССР № 4, арт. 45)];

г) удзел у арганізацыі, якая спецыяльна займаецца кантрабандай;

д) ажыццяўленне кантрабанды ўзброенымі асобамі;

е) ажыццяўленне кантрабанды службовай асобай, якая непасрэдна звязана з таможнай справай, а таксама службовай асобай, якая мела магчымасць выкарыстаць для мэт кантрабанды сваё службовае становішча;

ж) кантрабанда, зробленая больш двух разоў на працягу трох год, а таксама захоўванне, перавозка або гандаль заведама кантрабанднымі грузамі ў выглядзе промысла;

з) кантрабанда выбуховых рэчываў і зброі, ваеннага снаражэння, паветраных суднаў, тэлеграфнай і радыётэлеграфнай маёмасці і вывазануляваных каштоўных папер;

і) займанне ў выглядзе промысла незаконным вывазам, увозам, перасылкай і пераводам за граніцу і з-за граніцы валютных і фондавых каштоўнасцей [31 студзеня 1931 г. (ЗЗ СССР № 6, арт. 71)]. [Арт. 166 Таможнага кодэкса Саюза ССР (ЗЗ СССР 1929 г. № 1, арт. 2 з наступнымі зменамі)].

## Да артыкула 90

§ 1. З прычыны пытання, якое ўзнікла ў судовай практыцы, Пленум Вярхоўнага Суда СССР пастанаўляе даць судам наступнае ўказанне:

Скупка ў буйных размерах абліганый дзяржаўных пазык па паніжаных супроць наміналу цэнах, незалежна ад характару іх далейшага выкарыстання, падлягае кваліфікацыі па арт. 59 [12] КК РСФСР [1]) і адпаведных артыкулах КК іншых саюзных рэспублік (пастанова Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 20 красавіка 1951 г. № 5/11/у).

## Да артыкула 93

§ 1. Пры наяўнасці неаднаразовых выпадкаў неплацяжу падатку нядоімшчыкі прыцягваюцца да крымінальнай адказнасці [пункт «в» артыкула 24 Закону «Аб сельскагаспадарчым падатку», прынятага пятай сесіяй Вярхоўнага Савета СССР 8 жніўня 1953 г. («Ведамасці Вярхоўнага Савета СССР» 1953 г. № 7)].

§ 2. Пры наяўнасці неаднаразовых выпадкаў неплацяжу падатку або штрафу нядоімшчыкі прыцягваюцца да крымінальнай

---

[1]) Артыкул 90 КК БССР.

адказнасці [пункт «в» артыкула 37 Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 30 красавіка 1943 г. («Ведамасці Вярхоўнага Совета СССР» 1943 г. № 17)].

### Да артыкула 97

**§ 1.** У адпаведнасці з артыкулам 67 Закону «Аб усеагульным воінскім абавязку» ўстанавіць, што асобы, вінаватыя ў парушэнні правіл воінскага ўліку, нясуць адказнасць у наступным парадку:

1. За парушэнне правіл, устаноўленых для ўліку ваеннаабавязаных радавога і малодшага начальніцкага саставу, зробленае ў першы раз, гэтыя ваеннаабавязаныя падвяргаюцца штрафу да 50 рублёў, які накладаецца ў адміністрацыйным парадку начальнікамі аддзяленняў міліцыі або старшынямі сельскіх (пасялковых) Советаў.

2. За парушэнне правіл, устаноўленых для ўліку ваеннаабавязаных начальніцкага саставу, зробленае ў першы раз, гэтыя ваеннаабавязаныя падвяргаюцца штрафу да 100 рублёў, які накладаецца ў адміністрацыйным парадку раённымі (гарадскімі) ваеннымі камісарамі.

3. За незахаванне правіл уліку ваеннаабавязаных, устаноўленых арт. арт. 63 і 64 Закону «Аб усеагульным воінскім абавязку», кіраўнік домам, камендант дома або домаўладальнік падвяргаецца штрафу да 100 рублёў, які накладаецца ў адміністрацыйным парадку начальнікамі аддзяленняў міліцыі.

4. Паўторнае парушэнне правіл воінскага ўліку выклікае:

а) калі парушэнне зроблена асобамі радавога або малодшага начальніцкага саставу, прымусовыя работы на тэрмін да аднаго месяца або штраф да 200 рублёў;

б) калі парушэнне зроблена асобамі начальніцкага саставу, прымусовыя работы на тэрмін да двух месяцаў або штраф да 400 рублёў.

> З а ў в а г а. Прадугледжаныя гэтым артыкулам штраф і прымусовыя работы за паўторнае парушэнне правіл воінскага ўліку накладаюцца ў судовым парадку.

5. За страту ваенных білетаў у выніку нядбайнага захоўвання іх вінаватыя ваеннаабавязаныя падвяргаюцца штрафу ў размеры да 100 рублёў. Штраф накладаецца раённымі (гарадскімі) ваеннымі камісарамі.

6. Спагнанне штрафу, які накладаецца за парушэнне правіл воінскага ўліку або за страту ваеннага білета, ускладаецца на мясцовыя органы Рабоча-Сялянскай Міліцыі[1]) [Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 30 ліпеня 1940 г. («Ведамасці Вярхоўнага Совета СССР» 1940 г. № 28)].

### Да артыкула $108^6$

**§ 1.** 2. Устанавіць, што самавольнае без патрэбы спыненне поезда стоп-кранам караецца па прыгавору суда турэмным зняволеннем тэрмінам ад аднаго да трох год, калі гэтае дзеянне па свайму

---

[1]) Артыкул 7 не прыводзіцца, як прадугледжваючы адмену раней выданых актаў.

характару не цягне за сабой па закону больш цяжкага пакарання (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 9 красавіка 1941 г.).

## Да артыкула 122

**§ 1.** 1. Забараніць здачу ў арэнду зямель сельскагаспадарчага значэння як па-за гарадской мяжой, так і ў яе граніцах.

4. Спагнанне арэнднай платы ў якой-бы то ні было форме за землі, прадастаўленыя раней для сельскагаспадарчага выкарыстання, з выданнем гэтай Пастановы спыняецца [з Пастановы ЦВК і СНК СССР ад 4 чэрвеня 1937 г. (ЗЗ СССР № 37, арт. 150)] [1].

**§ 2.** На падставе спраў, разгледжаных Вярхоўным Судом СССР, Пленум Вярхоўнага Суда СССР канстатуе, што судовыя органы па-рознаму кваліфікуюць выпадкі самавольнага выкарыстання ў сваіх асабістых мэтах зямель, якія належаць калгасам і соўгасам. У адных выпадках гэтыя дзеянні кваліфікуюцца па арт. 87-а, а ў другіх па арт. 90 Крымінальнага кодэкса РСФСР [2]) і адпаведных артыкулах крымінальных кодэксаў іншых саюзных рэспублік.

У сувязі з выкладзеным Пленум Вярхоўнага Суда СССР пастанаўляе даць судам наступныя ўказанні: арт. 87-а Крымінальнага кодэкса РСФСР і адпаведныя артыкулы крымінальных кодэксаў іншых саюзных рэспублік прадугледжваюць незаконнае адчужэнне правоў працоўнага карыстання на зямлю, г. зн. пазбаўленне карыстальнікам сябе гэтага права бестэрмінова або часова, за плату або без аплаты, у карысць іншых асоб. У даным-жа выпадку мае месца самавольнае прысваенне непрыналежачага права. Таму дзеянні, якія выразіліся ў самавольным выкарыстанні ў асабістых мэтах зямель, што належаць калгасу або соўгасу, не могуць кваліфікавацца па арт. 87-а Крымінальнага кодэкса РСФСР і адпаведных артыкулах крымінальных кодэксаў іншых саюзных рэспублік. Гэтыя дзеянні павінны кваліфікавацца наступным чынам:

а) Самавольная апрацоўка ў асабістых мэтах зямлі, якая належыць калгасу або соўгасу, павінна кваліфікавацца, як самаўпраўства, па арт. 90 Крымінальнага кодэкса РСФСР і адпаведных артыкулах крымінальных кодэксаў іншых саюзных рэспублік.

б) Самавольнае зняцце ўраджаю для асабістых патрэб з зямлі, якая належыць калгасу або соўгасу, павінна кваліфікавацца як крадзеж дзяржаўнай і грамадскай маёмасці.

в) У тых выпадках, калі дзеянні, указаныя ў п. «а» гэтай Пастановы, зроблены з дазволу прадстаўнікоў улады або кіруючых службовых асоб калгаса або соўгаса, гэтыя асобы павінны прыцягвацца да адказнасці па арт. 87-а Крымінальнага кодэкса РСФСР і адпаведных артыкулах крымінальных кодэксаў іншых саюзных рэспублік.

Асобы, якія заведама выкарысталі незаконны дазвол, павінны прыцягвацца па тых-жа артыкулах Крымінальнага кодэкса, як саўдзельнікі, а пры адсутнасці або недаказанасці таго, што яны заве-

---

[1]) Распаўсюджана на пабочныя віды карыстання зямлёй у лясах (ЗЗ СССР 1937 г. № 76, арт. 373).

[2]) Артыкулы 122 і 131 КК БССР.

дама выкарысталі незаконны дазвол, вызваляюцца ад крымінальнай адказнасці.

Дзеянні прадстаўнікоў улады і службовых асоб, якія далі дазвол на выкананне ўказаных незаконных дзеянняў па карыслівых матывах або іншай асабістай зацікаўленасці, павінны кваліфікавацца па сукупнасці па арт. 87-а КК РСФСР і адпаведных артыкулах КК іншых саюзных рэспублік і па адпаведных артыкулах КК аб службовых злачынствах (пастанова Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 3 красавіка 1940 г. № 7/6/у са зменамі, унесенымі пратакольнай пастановай Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 18 студзеня 1957 г.).

### Да артыкула 131

**§ 1.** Гл. § 2 да артыкула 122.

### Да артыкула 132

**§ 1.** Усякі, хто шляхам насілля, падману, пагроз або подкупу будзе перашкаджаць грамадзяніну СССР у свабодным ажыццяўленні яго права выбіраць і быць выбраным у Вярхоўны Совет СССР, караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год (арт. 109 Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР).

### Да артыкула 143

**§ 1.** У мэтах ліквідацыі недахопаў у рабоце судоў па разгляду спраў аб займанні забароненымі промысламі Пленум Вярхоўнага Суда СССР пастанаўляе даць судам наступныя ўказанні:

1. Звярнуць увагу судоў, што крымінальную адказнасць па арт. 99 КК РСФСР[1]) і адпаведных артыкулах КК іншых саюзных рэспублік за займанне забароненым промыслам могуць несці асобы, якія займаюцца толькі тымі промысламі, адносна якіх ёсць спецыяльная забарона ў правілах рэгістрацыі некааперaваных саматужнікаў і рамеснікаў, зацверджаных Пастановай Совета Міністраў СССР ад 30 чэрвеня 1949 г.

2. Не аслабляючы барацьбы з указанымі злачынствамі, суды, разам з тым, не павінны дапускаць асуджэння за адзінкавыя нязначныя выпадкі забароненага вырабу рэчаў і матэрыялаў, зыходзячы з таго, што закон прадугледжвае крымінальную адказнасць толькі ў выпадках вырабу і далейшага збыту рэчаў і матэрыялаў, адносна якіх ёсць спецыяльная забарона або абмежаванне, у выглядзе промысла.

3. Растлумачыць, што займанне забароненым промыслам падлягае кваліфікацыі па арт. 99 КК РСФСР і адпаведных артыкулах КК іншых саюзных рэспублік.

Прымяненне, апрача арт. 99, яшчэ і арт. 107 КК РСФСР[2])

---

[1]) Артыкул 143 КК БССР.

[2]) Артыкул 155 КК БССР.

і адпаведных артыкулаў КК іншых саюзных рэспублік можа мець месца толькі ў выпадках рэальнай сукупнасці, г. зн. у тых выпадках, калі, апрача займання забароненым промыслам, асоба займалася скупкай і перапродажам тавараў з мэтай нажывы (з пастановы Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 3 верасня 1954 г. № 7).

§ 2. § 4. Забараняюцца ніжэйнаступныя некааператаваныя промыслы і выдача на іх рэгістрацыйных пасведчанняў:

а) перапрацоўка скупленага і давальчаскага зерня, канапель, ільну і ільняной пражы, а таксама скупленай шэрсці і шарсцяной пражы (за выключэннем дыванаткацтва);

б) перапрацоўка скупленага і давальчаскага тытуню і махоркі, маслічных сямян, бавоўны-сырца, бавоўны-валакна, коканаў (шоўку) і шаўковай пражы, скураной і аўчынна-футравай сыравіны;

в) вытворчасць хімічных вырабаў (кіслот, лака-фарбаў, купарвасу, соды, сінькі, ядавітых рэчываў і да т. п.), а таксама вытворчасць аліфы, парфумерна-касметычных вырабаў і мыла;

г) вытворчасць і рамонт халоднай і вогнестрэльнай зброі, вытворчасць выбуховых і вогненебяспечных рэчываў, у тым ліку піратэхнічных вырабаў — феерверкаў, бенгальскіх агнёў і да т. п.;

д) паліграфічныя промыслы (друкарскі, шклаграфічны, светакапіравальны, цынкаграфскі, літаграфскі, словалітны, а таксама іншыя промыслы з выкарыстаннем друкарскага, меднага і пераплётнага шрыфтоў і да т. п.); вытворчасць множальных апаратаў (шклографаў, рататараў, шапірографаў і да т. п.); выраб каучукавых і металічных штэмпеляў, штампаў, пячацей, шрыфтоў для пішучых машын, а таксама гравёрны і аптычны промыслы;

е) вытворчасць з матэрыялаў саматужніка як па індывідуальных заказах насельніцтва, так і для продажу: гатовага адзення, бялізны, трыкатажу, галаўных убораў, абутку і галёшаў і іншых вырабаў са скуры і гумы, галантэрэі, рымарскіх вырабаў, а таксама вырабаў з каляровых металаў (волава, медзь, алюміній, свінец і іншыя), у тым ліку вырабаў з прымяненнем асобных частак з каляровых металаў;

ж) вытворчасць планак і калодак для ордэнаў і медаляў; вытворчасць сшыткаў, блакнотаў, канвертаў і пакетаў; вытворчасць люстэркаў, свечак, а таксама вырабаў са шчаціны і конскага воласу;

з) вытворчасць вырабаў не на заказ, а для продажу на рынку кааперанымі саматужнікамі і рамеснікамі, працуючымі на старану, а таксама рабочымі і служачымі, якія займаюцца саматужнымі і раменымі промысламі ў пазаўрочны час;

і) вытворчасць з пакупной і давальчаскай сыравіны харчовых прадуктаў, як: хлеба, булачных, малочных, каўбасна-вяндлінных, плодагароднінных вырабаў, пасцілы, макавак, ледзянцоў, цукерак і іншых кандытарскіх вырабаў, страў, кофе, перцу, гарчыцы, воцату, безалкагольных напіткаў і да т. п.;

к) вытворчасць з пакупной і давальчаскай сыравіны віна і алкагольных напіткаў;

л) перавозка пасажыраў і грузаў на аўтамашынах і матацыклах;

м) усякія промыслы з прымяненнем наёмнай працы, а таксама з дапамогай вучняў;

н) расфасоўка, размол, разліў, сартыроўка, рэзка, зборка, ачыстка і да таго падобныя складскія аперацыі з пакупнымі таварамі для наступнага іх перапродажу;

о) усякага роду гандаль (скупка-перапродаж) і гандлёвае пасрэдніцтва, а таксама рэстаўрацыя скупленых вырабаў для перапродажу;

Заўвага. На продаж прадуктаў сваёй сельскай гаспадаркі ў сырым або перапрацаваным выглядзе калгаснікамі і аднаасобнікамі, а таксама вядучымі падсобную гаспадарку рабочымі, служачымі і іншымі грамадзянамі выбаркі рэгістрацыйных пасведчанняў не патрабуецца.

п) утрыманне заезных двароў, каруселяў, купальняў, вагаў, сіламераў, цпіраў і наладжванне розных гульняў (з правіл рэгістрацыі некааперованых саматужнікаў і рамеснікаў, зацверджаных Пастановай Совета Міністраў СССР ад 30 чэрвеня 1949 г.).

## Да артыкула 152

**§ 1.** Гл. матэрыялы да арт. 155.

## Да артыкула 152[1]

**§ 1.** 1. Устанавіць, што выпуск нядобраякаснай або некамплектнай прамысловай прадукцыі і выпуск прадукцыі з парушэннем абавязковых стандартаў з'яўляецца процідзяржаўным злачынствам, роўназначным шкодніцтву.

2. За выпуск нядобраякаснай або некамплектнай прадукцыі і за выпуск прадукцыі з парушэннем абавязковых стандартаў — дырэктараў, галоўных інжынераў і начальнікаў аддзелаў тэхнічнага кантролю прамысловых прадпрыемстваў аддаваць пад суд і па прыгавору суда падвяргаць турэмнаму зняволенню тэрмінам ад 5 да 8 год.

3. Даручыць Пракурору СССР забяспечыць няўхільнае правядзенне ў жыццё гэтага Указа (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 10 ліпеня 1940 г.).

**§ 2.** У мэтах устаранення памылак, якія дапускаюцца судамі па справах, прадугледжаных Указам ад 10 ліпеня 1940 г., Пленум Вярхоўнага Суда СССР пастанаўляе даць судам наступнае ўказанне:

1. Указаць судам на неабходнасць весці самую рашучую барацьбу з выпускам нядобраякаснай або некамплектнай прамысловай прадукцыі, а таксама прадукцыі з парушэннем абавязковых стандартаў, шляхам няўхільнага і строгага прымянення да асоб, вінаватых у гэтым процідзяржаўным злачынстве, мер пакарання, прадугледжаных Указам ад 10 ліпеня 1940 г. (ч. I арт. 128-а КК РСФСР[1]) і адпаведныя артыкулы КК іншых саюзных рэспублік).

2. Не дапускаць кваліфікацыі па арт. арт. 109, 111[2]) і іншых

---

[1]) Пункт «а» артыкула 152[1] КК БССР.

[2]) Артыкулы 195, 196[1] і 196 КК БССР.

артыкулах КК РСФСР і адпаведных артыкулах КК іншых саюзных рэспублік дзеяннях вінаватых у выпуску нядобраякаснай або некамплектнай і нестандартнай прамысловай прадукцыі службовых асоб, прадугледжаных ва Указе ад 10 ліпеня 1940 г.,— дырэктараў, галоўных інжынераў і начальнікаў аддзелаў тэхнічнага кантролю, а таксама асоб іншых службовых назваў, якія фактычна выконваюць функцыі ўказаных службовых асоб.

Указаныя злачынствы ўпамянутых службовых асоб павінны кваліфікавацца па ч. 1 арт. 128-а КК РСФСР[1]) і адпаведных артыкулах КК іншых саюзных рэспублік, а ў Азербайджанскай і Узбекскай ССР, крымінальныя кодэксы якіх не змяшчаюць адпаведнага артыкула,— па Указу ад 10 ліпеня 1940 г.

3. Указаць судам, што пад выпускам прадукцыі трэба разумець як здачу прадукцыі заказчыкам, так і тыя выпадкі, калі прадукцыя прайшла аддзел тэхнічнага кантролю і канчаткова аформлена да здачы.

4. Справы аб выпуску нядобраякаснай або некамплектнай і не адпавядаючай стандарту прамысловай прадукцыі падсудны акруговым, абласным, краявым судам, вярхоўным судам аўтаномных рэспублік і вярхоўным судам саюзных рэспублік без абласнога дзялення, а ў належных выпадках — акруговым і прыроўненым да іх ваенным трыбуналам, акруговым судам чыгуначнага транспарту і лінейным судам воднага транспарту[2]) (з пастановы Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 30 верасня 1949 г. № 13/9/у).

## Да артыкула 155

**§ 1.** Судовая практыка па справах аб спекуляцыі паказвае, што па гэтых справах яшчэ ёсць рад істотных недахопаў, аслабляючых барацьбу са спекуляцыяй, якая мае сур'ёзную грамадскую небяспеку.

Суды ў радзе выпадкаў не прымяняюць да спекулянтаў арт. 107 КК РСФСР[3]) і адпаведныя артыкулы КК іншых саюзных рэспублік і няправільна кваліфікуюць іх дзеянні па арт. 105 КК РСФСР[4]) і адпаведных артыкулах КК іншых саюзных рэспублік.

Нягледзячы на тое, што закон прадугледжвае пакаранне за спекуляцыю — пазбаўленне волі з канфіскацыяй маёмасці, суды нярэдка без усякіх да таго падстаў прыгаварваюць вінаватых у спекуляцыі да пакарання ніжэй мяжы, указанай у законе, або да ўмоўнага асуджэння, а таксама, насуперак прамому патрабаванню закону, не прымяняюць дадатковага пакарання ў выглядзе канфіскацыі маёмасці.

Па справах аб спекуляцыі не даследуецца пытанне аб крыніцах набыцця спекулянтамі перапрадаваемых імі тавараў, хоць гэтыя тавары часта набываюцца незаконным шляхам у гандлёвых арганізацыях у выніку злоўжыванняў і крадзяжоў з боку службовых асоб, якія застаюцца беспакаранымі.

---

[1]) Пункт «а» артыкула 152[1] КК БССР.
[2]) Гл. зноску 2 на стар. 94.
[3]) Артыкул 155 КК БССР.
[4]) Артыкул 152 КК БССР.

У некаторых выпадках суды кваліфікуюць дзеянні асоб, якія скупляюць заведама ўкрадзенае для перапродажу з мэтай нажывы, толькі па аднаму артыкулу 164 КК РСФСР [1]) і адпаведных артыкулах КК іншых саюзных рэспублік, вызваляючы іх такім чынам ад адказнасці за спекуляцыю.

З другога боку, маюць яшчэ месца факты неабгрунтаванага асуджэння як за спекуляцыю пры выпадковым продажы працоўнымі рэчаў, набытых імі для асабістага карыстання, пры абмене рэчаў на прадукты харчавання, а таксама ў выпадках продажу калгаснікамі і аднаасобнікамі прадуктаў сваёй сельскай гаспадаркі.

З прычыны выкладзенага Пленум Вярхоўнага Суда СССР пастанаўляе даць судам наступныя ўказанні:

1. Указаць судам на неабходнасць няўхільнага прымянення да асоб, вінаватых у спекуляцыі, арт. 107 КК РСФСР і адпаведных артыкулаў КК іншых саюзных рэспублік з назначэннем пакарання, прадугледжанага ўказанымі артыкуламі КК.

У тых выпадках, калі па справе не ўстаноўлен перапродаж скупленых тавараў, але суд, зыходзячы з усіх доказаў па справе, прыйдзе да абгрунтаванага вываду, што скупка тавараў была праведзена для перапродажу з мэтай нажывы, такія дзеянні павінны кваліфікавацца па арт. арт. 19 і 107 КК РСФСР і адпаведных артыкулах КК іншых саюзных рэспублік.

2. Дзеянні службовых асоб, вінаватых у продажы спекулянтам тавараў для спекуляцыі, павінны кваліфікавацца па сукупнасці як злоўжыванне службовым становішчам і саўдзел у спекуляцыі.

У тых выпадках, калі службовыя асобы, выкарыстоўваючы сваё службовае становішча, закупляюць тавары і самі затым займаюцца перапродажам іх з мэтай нажывы, яны падлягаюць адказнасці па сукупнасці за злоўжыванне службовым становішчам і за спекуляцыю.

3. Дзеянні асоб, якія скупляюць заведама ўкрадзенае для перапродажу з мэтай нажывы, павінны кваліфікавацца па сукупнасці па арт. арт. 164 і 107 КК РСФСР і адпаведных артыкулах КК іншых саюзных рэспублік.

Калі па ўказаных справах купля заведама звязана з саўдзелам у самім крадзяжы, такія дзеянні павінны кваліфікавацца, як саўдзел у крадзяжы маёмасці і спекуляцыя па сукупнасці.

4. Асобы, якія займаюцца забароненымі промысламі, а таксама спекуляцыяй, падлягаюць адказнасці па арт. арт. 99 і 107 КК РСФСР [2]) і адпаведных артыкулах КК іншых саюзных рэспублік.

5. Разам з тым указаць судам, што выпадковы продаж або абмен працоўнымі рэчаў, набытых імі для асабістага карыстання, а не для перапродажу, а таксама продаж калгаснікамі і аднаасобнікамі прадуктаў сваёй сельскай гаспадаркі без парушэння ўстаноўленых правіл гандлю не змяшчаюць у сабе саставу крымінальнага злачынства (пастанова Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 20 верасня 1946 г. са зменамі, унесенымі пратакольнай пастановай Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 18 студзеня 1957 г.).

---

[1]) Артыкул 251 КК БССР.

[2]) Артыкулы 143 і 155 КК БССР.

## Да артыкула 180

§ 1. У судовай практыцы ўзнікла пытанне аб тым, як трэба кваліфікаваць злачынствы па службе ваеннаслужачых, якія выконваюць службовыя функцыі, але не з'яўляюцца разам з тым асобамі начальніцкага саставу.

У сувязі з гэтым Пленум Вярхоўнага Суда СССР пастанаўляе даць судам наступнае ўказанне:

Улічваючы, што ў прыведзеных вышэй выпадках указаныя ваеннаслужачыя выконваюць функцыі, прысвоеныя звычайна асобам начальніцкага саставу, злачынныя іх дзеянні па службе належыць кваліфікаваць нароўні з апошнімі.

У прыватнасці, за злоўжыванне ўладай, перавышэнне і бяздзеянне ўлады, а таксама — за нядбайныя адносіны да сваіх абавязкаў яны падлягаюць адказнасці па арт. 17 Палажэння аб воінскіх злачынствах (арт. 193 [17] КК РСФСР [1]) і адпаведныя артыкулы КК іншых саюзных рэспублік) (пастанова Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 6 красавіка 1945 г. № 6/4/у).

## Да артыкулаў 207 і 208

§ 1. Пленум Вярхоўнага Суда СССР пастанаўляе даць судам наступнае кіруючае ўказанне:

1. Указаць судам на неабходнасць рашучай барацьбы з хабарніцтвам шляхам строгага і паслядоўнага прымянення да асоб, вінаватых у атрыманні і дачы хабару, а таксама да пасрэднікаў у хабарніцтве суровых мер пакарання, устаноўленых законам за гэтыя злачынствы, не дапускаючы неабгрунтаванага змякчэння пакарання па гэтага роду справах.

2. Не дапускаць прымянення ч. 1 арт. 117 КК РСФСР [2]) і адпаведных артыкулаў КК іншых саюзных рэспублік пры наяўнасці кваліфікуючых адзнак ч. 2 гэтых артыкулаў КК.

У прыватнасці, суды не павінны звужваць паняцце адказнага становішча службовай асобы, вінаватай у атрыманні хабару, як кваліфікуючай адзнакі гэтага злачынства.

Як неаднаразовае атрыманне хабару павінны разглядацца разначасовае атрыманне хабару ў двух або больш выпадках, або аднačасовае атрыманне хабару ад двух або больш асоб.

3. У тых выпадках, калі асоба, падбухторваючы хабарадавальніка, атрымлівае ад яго грошы або іншыя каштоўнасці нібы для перадачы службовай асобе ў якасці хабару, але фактычна прысвойвае іх, гэтае злачынства ў адносінах падбухоршчыкаў трэба кваліфікаваць па арт. арт. 17 і 118, а ў адносінах хабарадавальнікаў па арт. арт. 19 і 118 КК РСФСР [3]) і адпаведных артыкулах КК іншых саюзных рэспублік.

4. Пры асуджэнні хабарадавальнікаў грошы і іншыя каштоўнасці, перададзеныя імі службовым асобам або пасрэднікам, падлягаюць ва ўсіх выпадках канфіскацыі як рэчавы доказ, у адпавед-

---

[1]) Артыкул 180 КК БССР.

[2]) Пункт «а» артыкула 207 КК БССР.

[3]) Артыкулы 24 і 208; 22, 23 і 208 КК БССР.

насці з п. 1 арт. 69 КПК РСФСР [1]) і адпаведнымі артыкуламі КПК іншых саюзных рэспублік.

5. У тых выпадках, калі пры разглядзе любой справы выяўляцца акалічнасці, якія сведчаць аб фактах атрымання або дачы хабару або пасрэдніцтва ў хабарніцтве з боку падсуднага, якому не прад'яўлена абвінавачанне ў гэтых злачынствах, або з боку іншых асоб, не прыцягнутых па данай справе,— суды не павінны праходзіць міма такіх абставін і абавязаны выносіць адпаведныя вызначэнні, кіруючыся арт. арт. 312, 315 і 316 КПК РСФСР [2]) і адпаведнымі артыкуламі КПК іншых саюзных рэспублік (з пастановы Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 24 чэрвеня 1949 г. № 7/2/у).

---

[1]) Пункт 1 артыкула 69 КПК БССР.
[2]) Артыкулы 312, 315 і 316 КПК БССР.

## АБ НЕКАТОРЫХ ПЫТАННЯХ ПА ПРЫМЯНЕННЮ Ў СУДОВАЙ ПРАКТЫЦЫ УКАЗА ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР АД 10 СТУДЗЕНЯ 1955 ГОДА «АБ КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ ЗА ДРОБНЫ КРАДЗЕЖ ДЗЯРЖАЎНАЙ І ГРАМАДСКАЙ МАЁМАСЦІ»

*(Пастанова Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 18 чэрвеня 1957 г. № 9)*

Судовая практыка па справах аб дробных крадзяжах дзяржаўнай і грамадскай маёмасці сведчыць аб тым, што суды, прымяняючы Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 10 студзеня 1955 года «Аб крымінальнай адказнасці за дробны крадзеж дзяржаўнай і грамадскай маёмасці», у радзе выпадкаў дапускаюць памылкі па справах гэтай катэгорыі.

Нярэдка дробныя крадзяжы кваліфікуюцца па Указу Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 4 чэрвеня 1947 года «Аб крымінальнай адказнасці за крадзеж дзяржаўнай і грамадскай маёмасці», а крадзяжы, якія падпадаюць пад прызнакі гэтага Указа, кваліфікуюцца па Указу Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 10 студзеня 1955 года «Аб крымінальнай адказнасці за дробны крадзеж дзяржаўнай і грамадскай маёмасці».

Так, народны суд 3 участка г. Каломны за крадзеж 13 кг свініны асудзіў Качаткова П. Ф. па Указу ад 4 чэрвеня 1947 года, тады як з улікам размеру і кошту пакрадзенага дзеянні Качаткова трэба было-б кваліфікаваць па Указу ад 10 студзеня 1955 года.

У той-жа час Прэзідыум Вярхоўнага Суда РСФСР беспадстаўна перакваліфікаваў на Указ ад 10 студзеня 1955 года дзеянні Ніколава Д. Н., асуджанага па Указу ад 4 чэрвеня 1947 года за крадзеж 3 тон каменнага вугалю. Няправільнае змяненне кваліфікацыі было выклікана ў даным выпадку тым, што Вярхоўны суд РСФСР прыняў пад увагу толькі кошт і не ўлічыў пры гэтым размеру пакрадзенага.

У судовай практыцы маюць месца факты фармальнага прымянення Указа ад 10 студзеня 1955 года да выпадкаў адзінкавых крадзяжоў у такім нязначным размеры, калі маюцца ўсе падставы

для спынення справы па прызнаках арт. 6-1 «Асноў крымінальнага судавядзення СССР і саюзных рэспублік» (заўвага да арт. 6 КК РСФСР [1]) і адпаведныя артыкулы КК і КПК іншых саюзных рэспублік). Так, па Указу ад 10 студзеня 1955 года былі асуджаны: народным судом 3 участка г. Ферганы Пуцята Л. Е. за крадзеж 2 кавалкаў туалетнага мыла коштам 2 руб. 20 кап.; народным судом 3 участка Дзяцькаўскага раёна, Бранскай вобласці, Лялюшка М. А. за замах на крадзеж аднаго вядра каменнага вугалю коштам 2 руб. 40 кап.; народным судом Алатырскага раёна, Чувашскай АССР, калгасніца Беспалава Е. П. за крадзеж з фермы 8 кг сена і іншыя.

Пры кваліфікацыі крадзяжоў па Указу ад 10 студзеня 1955 года суды зыходзяць часам толькі з размеру і кошту фактычна пакрадзенага, без уліку наяўных у справе даных аб тым, што намер вінаватага быў накіраван на крадзеж у значна большых размерах, але не быў ажыццёўлен па не залежных ад яго акалічнасцях. Так, Сарокін І. Т., асуджаны Маскоўска-Курскім лінейным транспартным судом па Указу ад 10 студзеня 1955 года, быў прызнан вінаватым у тым, што, прабраўшыся ў палатку буфета, выкраў там тры банкі кансерваў, пачку жэле і дзве пачкі папярос. Суд не ўлічыў, што Сарокін быў затрыман на месцы злачынства, калі ён толькі пачаў складваць пакрадзенае, і тая нязначная колькасць, якую ён паспеў узяць, не давала падставы разглядаць гэтыя дзеянні як дробны крадзеж, таму што па ўсіх акалічнасцях справы відаць, што намер яго быў накіраван на крадзеж значна большай колькасці тавараў; таму, незалежна ад той колькасці, якую Сарокін паспеў узяць, дзеянні яго падлягалі кваліфікацыі як крадзеж, які падпадае пад прызнакі Указа ад 4 чэрвеня 1947 года.

Маюць месца і такія выпадкі, калі суды дробны крадзеж толькі таму, што ён зроблен групай або з узломам, кваліфікуюць па Указу ад 4 чэрвеня 1947 года. Іншы раз такія-ж дзеянні няправільна кваліфікуюцца па ч. 2 Указа ад 10 студзеня 1955 года, якая прадугледжвае адказнасць толькі за паўторна зроблены дробны крадзеж.

У судовай практыцы няма адзінства і ў тым, як трэба кваліфікаваць дробны крадзеж, калі яму папярэднічае крадзеж, які падпадае пад дзеянне Указа ад 4 чэрвеня 1947 года, і наадварот.

У мэтах ліквідацыі памылак у судовай практыцы па справах аб дробных крадзяжах дзяржаўнай і грамадскай маёмасці і правільнага адзінага прымянення Указа ад 10 студзеня 1955 года Пленум Вярхоўнага Суда СССР пастанаўляе даць судам наступныя тлумачэнні:

1. Пры вырашэнні пытання аб прызнаках дробнага крадзяжу, які падпадае пад дзеянне Указа ад 10 студзеня 1955 года, неабходна ўлічваць не толькі кошт, але і прымаць пад увагу размер пакрадзенага ў натуральным выглядзе (вагу, колькасць пакрадзеных прадметаў і г. д.). Пытанне аб тым, ці можа той або іншы крадзеж разглядацца як дробны па кошту і размерах пакрадзенага, вырашаецца ў кожным асобным выпадку ў залежнасці ад канкрэтных акалічнасцей справы.

2. Пры назначэнні пакарання па справах аб дробных крадзяжах суды, як і па іншых справах, павінны строга кіравацца арты-

---

[1]) Арт. 12 КК БССР і арт. 4-а КПК БССР.

кулам 30 «Асноўных пачаткаў крымінальнага заканадаўства СССР і саюзных рэспублік» (арт. 45 КК РСФСР [1]) і адпаведныя артыкулы КК іншых саюзных рэспублік), гэта значыць назначаць пакаранне з улікам канкрэтных акалічнасцей справы і асобы вінаватага.

Разам з тым у тых выпадках, калі крадзеж яўна малазначны, суды ў адпаведнасці з арт. 6-1 «Асноў крымінальнага судаводства СССР і саюзных рэспублік» (заўвага да арт. 6 КК РСФСР і адпаведныя артыкулы КК і КПК іншых саюзных рэспублік) не павінны разглядаць такія дзеянні, як крымінальнае злачынства.

3. Папярэдняя дамоўленасць, а таксама спосаб крадзяжу (з узломам і інш.) самі па сабе пры дробным крадзяжы не з'яўляюцца кваліфікуючымі акалічнасцямі, якія патрабуюць прымянення ч. 2 Указа ад 10 студзеня 1955 года пры адсутнасці паўторнасці або Указа ад 4 чэрвеня 1947 года пры адсутнасці намеру на крадзеж у значных размерах.

4. У тых выпадках, калі матэрыяламі справы даказана, што намер вінаватага быў накіраван на крадзеж у значных размерах і не быў ажыццёўлен па не залежных ад вінаватага акалічнасцях, злачынства трэба кваліфікаваць як замах на крадзеж, прадугледжаны Указам ад 4 чэрвеня 1947 года.

5. Дробны крадзеж, калі яму папярэднічаў крадзеж дзяржаўнай або грамадскай маёмасці, які падпадае пад дзеянне Указа ад 4 чэрвеня 1947 года, павінен кваліфікавацца як паўторны па ч. 2 Указа ад 10 студзеня 1955 года. Калі пры гэтым вінаваты не быў судзім за першы крадзеж, то кожны з іх падлягае самастойнай кваліфікацыі: першы — па Указу ад 4 чэрвеня 1947 года і другі — па ч. 2 Указа ад 10 студзеня 1955 года.

З другога боку, раней зроблены дробны крадзеж не стварае прызнаку паўторнасці для наступнага крадзяжу, які падпадае пад дзеянне Указа ад 4 чэрвеня 1947 года.

---

[1]) Арт. 48 КК БССР.

## АЛФАВІТНА-ПРАДМЕТНЫ УКАЗАЛЬНІК [1])

### А

**Абавязковыя пастановы** — парушэнне — $108^{1}$, 123, 139, 200.

**Абавязковыя пастаўкі** — 94, 95.

**Абарона неабходная** — гл. Неабходная абарона.

**Абважванне, абмерванне** — $196^{2}$.

**Аблігацыі** — скупліванне А. дзяржаўных пазык — 90 § 1; незаконны выпуск А. мясцовымі органамі — $85^{2}$.

**Абмундзіраванне** — праматанне — 177.

**Аборт** — адказнасць за незаконны А. — 217; прымушэнне жанчын да А. — $217^{1}$; адмена крымінальнай адказнасці за А. — стар. 78; адмена забароны А. — стар. 78.

**Абрады рэлігійныя** — перашкоджанне іх выкананню — 163.

**Абсталяванне і матэрыялы** — адмена адказнасці за продаж, абмен А. і м. — стар. 77.

**Абцяжваючыя віну акалічнасці** — 49.

**Аб'яўленне па-за законам** — стар. 60.

**Аб'яўленне вайны** — схіленне да А. в. — 67.

**Аб'яўленне ворагам працоўных** — 28, 29.

**Аварыя** — на аўтатранспарце — $80^{3}$; $80^{3}$ § 1, 2; у паветраным флоце — $80^{4}$.

**Авіяцыя** — гл. Паветраны флот.

**Агалашэнне** — даных папярэдняга следства — 138.

**Агентура** — служба на сакрэтных пасадах пры царскім ладзе або ў контррэвалюцыйных урадаў — 74.

**Агітацыя** — накіраваная да ўчынення контррэвалюцыйнага злачынства, — 72; узбуджаючая нацыянальную або рэлігійную варожасць — 84.

**Аграномы** — ухіленне ад персанальнага ўліку — 102.

**Адказнасць дысцыплінарная** — 213.

**Адкрыццё** — перадача за граніцу А., якія складаюць дзяржаўную тайну, — стар. 60.

**Адмаўленне** — ад ваеннай службы — 81; ад выплаты падаткаў і выканання павіннасцей у ваенны час — 83; ад выканання павіннасцей і работ, якія маюць агульнадзяржаўнае значэнне, — 94; ад выплаты падаткаў — 95; А. сведкаў, экспертаў, перакладчыкаў і панятых ад выканання абавязкаў — 134; А. у прыёме на работу жан-

---

[1]) Спасылкі зроблены на артыкулы Кодэкса, параграфы паартыкульных матэрыялаў і, у асобных выпадках, на старонкі.

чын, цяжарных і кормячых груддзю,— 139[1]; А. дзейнічаць зброяй у час бою — 185.

**Адміністрацыйная адказнасць** — за самавольны праезд у таварных паяздах — стар. 77.

**Адтэрміноўка** — выкананне прыгавору, які прысуджае ваеннаслужачага ў ваенны час да пазбаўлення волі без паражэння правоў,— 32.

**Адурманьваючыя рэчывы** — выраб, захоўванне, купля і збыт без дазволу — 151.

**Акты грамадзянскага стану** — непаведамленне органу ЗАГСа аб перашкодах да шлюбу і паведамленне ім ілжывых звестак — 119.

**Акты тэрарыстычныя** — 70.

**Актывісты** — пабоі і ўчыненне насільных дзеянняў у адносінах А.— 106[2].

**Аліменты** — ухіленне ад выплаты — 232.

**Алкаголь** — уплыў ап'янення на прымяненне мер пакарання — 13.

**Амністыя** — 17 § 1, стар. 80—88.

**Аналогія злачынстваў** — 6.

**Апараты самагонныя** — 150, стар. 61.

**Ап'яненне** — значэнне А.— 13.

**Арандатар** — растрачванне маёмасці — 253.

**Арганізацыя контррэвалюцыйная** — 76.

**Архіўны матэрыял** — скрыццё архіўнага матэрыялу, які падлягае рэгістрацыі,— 130.

**Арцелі** — гл. Кааперацыя.

**Арыштаваны** — садзейнічанне пабегу — 117; пабег з-пад варты — 118.

**Арышт** — прымяненне да ваеннаслужачых узамен папраўча-працоўных работ — 33; незаконны А.— 198.

**Арэнда** — забарона А. зямель сельскагаспадарчага значэння — 122 § 1.

**Аўтарскае права** — парушэнне закону аб А. п.— 263.

**Аўтатранспарт** — парушэнне правіл руху на А.— 80[3]; адмаўленне або ўхіленне ад выканання аўтатранспартнай павіннасці ў ваенны час — 83; парушэнне правіл ваеннага ўліку аўтамабіляў і іншых транспартных сродкаў — 100; парушэнне ваеннаслужачым правіл ваджэння або эксплуатацыі баявой або транспартнай машыны — 177[1]; гл. Аварыя.

